№ 36 (394) 1 кастрычніка 2004

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднаўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



ПАЛІТЫКА

## Усё пра выбары

Дзевяць дэпутатаў ужо абрана. —Зінаіда Бандарэнка зарэгістраваная. — А сьвіньні хто? — Дабравольскі разьлічвае на перамогу. — «Свабодная Беларусь» у складзе аднае партыі. — Самая беларускамоўная акруга. — Хто ён, Ліштван.
**Старонкі 3, 4.**

## Бюджэт-2005

18 800 000 000 000 рублёў выдаткаў і 17 900 000 000 000 рублёў прыбытку.

старонка 4

## Колер лісьця і колер крыві

Мода гэтай восені.

старонка 9

## Вольга Антропава

Міс Беларусь марыць пра цырульню.

старонка 5

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## За адсутнасьцю легальных газэтаў выйдуць падпольныя

«Рэгіянальную газету» зьбілі з ног, ды так, каб не паднялася. Гэта было выданьне незвычайнага густу, далікатнасьці і культуры, і пры гэтым апалітычнае. Яе любілі і ў вэртыкалі, і ў інтэлігенцыі за бездакорны прафэсіяналізм і адчуваньне сваёй аўдыторыі. Тады чаму зачынілі? Бо беларуская? Чаго тады вартыя Лукашэнкавы настойлівыя апраўдваньні перад берасьцейскімі студэнтамі, што ён «за мову». А можа, зачынілі проста таму, што не друкавала хваласьпеваў кіраўніку краіны? Значыць, прынятае Канчатковае Рашэньне па незалежнай прэсе, і зь яго рэалізацыі пачнецца задуманае пажыцьцёвае прэзыдэнцтва. «Перасьедзець» у такім разе ня ўдасца нікому.

Дарэчы, падставы для закрыцьця яўна выбіраў чалавек, які проста хацеў выявіць абсурднасьць рашэньня. Як можна зачыняць газэту за тое, што яна распаўсюджвалася пераважна ў Маладэчне, а зарэгістраваная як рэспубліканская? Адзіны спосаб сабатажу, які застаецца ў сумленных чыноўнікаў, — даводзіць справу да маразму.

Акты вандалізму, скіраваныя супраць беларускай мовы, культуры, ды зьдзекі з годнасьці асобы ў Беларусі спыняцца тады, калі на кожную зачыненую газэту будзе ствараца па дзьве падпольныя з роўным тыражом.

**Андрэй Дынько**

ШОК

## Спынены выхад «Рэгіянальнай газеты»

**Спынены на тры месяцы выхад «Рэгіянальнай газеты» — самага буйнога незалежнага выданьня Паўночна-Заходняй Беларусі, якое мае 10-тысячны наклад, выходзіць цалкам на беларускай мове і цалкам самаакупнае.**

Аб прыпыненьні на тры месяцы маладачанскай «Рэгіянальнай газеты» стала вядома ў аўторак. «РГ» — знакавая газэта, бо гэта адзінае недзяржаўнае рэгіянальнае выданьне, якое выходзіць цалкам на беларускай мове. Два папярэджаньні за раз вынесены «РГ» за фармальнасьці. Маўляў, дадатак з тэлепраграмай у газэце незарэгістраваны, пэрыядычнасьць выхаду не адпавядае запісанай у рэгістрацыйным пасьведчаньні, а газэта зарэгістраваная як «масавапалітычнае выданьне, што распаўсюджваецца ў агульнанацыянальным маштабе», у выходных зьвестках абвяшчае сябе «інфармацыйна-рэклямным выданьнем» — ды распаўсюджваецца толькі ў маладачанскім рэгіёне.

Усе спробы галоўнага рэдактара прыпыненай газэты Аляксандра Манцэвіча трапіць на прыём да міністра інфармацыі Русакевіча засталіся марнымі. На просьбы атрымаць тлумачэньні рэдактар закрытай газэты атрымліваў ад клеркаў адгаворкі кшталту: «тэлепраграма — гэта ў вас асобнае выданьне».

Спробы апэляваць да здаровага сэнсу плёну не прынесьлі, хаця й загналі прадстаўніка ўладаў у кут. Напрыклад, пытаньне сп.Манцэвіча, чаму, калі «РГ» выпускае тэлепраграму на аркушах не таго фармату, яе выхад прыпыняюць, а калі абласная дзяржаўная «Мінская праўда» выпускае моладзевы дадатак, пераходзячы для таго з фармату А2 на А3, то ў міністэрстве гэтага не заўважаюць.

**Працяг на старонцы 12.**

## Краіна зварухнулася



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У Шклове пішуць акравершы: Шагаем твердо и спокойно / Единой, правильной тропой. / Нас не затронут бури, войны, / Когда есть Президент такой! **Старонка 12.** Улады канфіскуюць улёткі цэнтнэрамі. **Старонка 10.**

**На фота:** пікет незалежных прафсаюзаў у Менску.

# Далучыўся генэрал

**У аўторкавай прэс-канфэрэнцыі ініцыятывы «За справядлівыя выбары» ўзялі ўдзел акадэмік Аляксандар Вайтовіч і былы міністар абароны Аляксандар Чумакоў. Апошні сваю прысутнасьць патлумачыў так: «Для мяне справядлівыя выбары скончыліся 27 верасьня, калі Вярхоўны суд пастанавіў, што 63 подпісы, сабраныя ў маю падтрымку, несапраўдныя. Пасьля рашэньня суду я пагадзіўся распавесьці беларусам пра нябачаныя за ўсё маё жыцьцё й 44 гады службы ў войску маштабы нечуванага самавольства — ня толькі да мяне, але й да многіх іншых грамадзянаў краіны». Каардынатар «Справядлівых выбараў» А.Вайтовіч сьцьвярджае, што «пакуль фармат удзелу былога міністра абароны Аляксандра Чумакова ў працы ініцыятывы ня вызначаны». Можна канстатаваць, што сацыяльная база апазіцыі пашыраецца.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Настальгія па 90-х



**Культавы кампазытар Зьміцер Яўтуховіч вярнуўся ў Беларусь пасьля 11 гадоў эміграцыі. На фота: з культавым дзіцячым ды-джэем Джымі Нэльсанам на канцэрце. Старонка 9.**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## «Мы па-ранейшаму працягваем руку дапамогі»

Гутарка з Марцінам Хекерам, паслом Нямеччыны. **Старонка 2.**

## Літаратурны працэс

Пракурор: «Шматкроп'і абражаюць гонар і годнасьць?» Сьведка: «Думаю, што так». **Старонка 8.**

## Дык падпісвайся

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналіз беларускага жыцьця на 16 старонках. Атрымлівай газэту сваёй душы, газэты без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.



## Галерэя Б.

У Менску адчыніўся клюб паэтаў. Пропуск — верш. **Старонка 7.**

## Калі краіна — цэнтр Эўропы,

то пуп Зямлі — мой агарод. Аднаўляецца старонка вершаванага радка. **Старонка 14.**

РЭЖЫМ

# Добра прадуманая гістэрыка




А.Лукашэнка ахарактарызаваў чатырох чыноўнікаў — Віктара Шэймана, Юр’я Сівакова, Уладзімера Навумава, Дзьмітрыя Паўлічэнку — як «самых сумленных, надзейных, адданых народу й дзяржаве людзей». А Захад абвесьціў неўязнымі, бо лічыць іх датычнымі да забойстваў. У адказ на паседжаньні Рады бясьпекі А.Лукашэнка агучыў дадатковую інфармацыю пра тое, што Захад выношвае нават гістэрычныя пляны сілавога зьнішчэньня прэзыдэнта: «Вы ім перадайце: няхай да гэтага пункту пераходзяць адразу, бо зламаць мяне ў іх ня ўдасца, што б яны ні рабілі».

Такога палкага выступу мы ня чулі ўжо гады тры. Хваласьпеў на адрас чатырох асілкаў гучаў гэткі, нібыта яны ўжо вынесьлі свайго прэзыдэнта з поля перавароту: «Перадайце: ні Шэймана, ні Навумава, ні Сівакова, ні Паўлічэнкі яны не атрымаюць». Адкрыліся таксама таямніча невядомыя гісторыкам і журналістам эпізоды найноўшае гісторыі: «Бачыце, Паўлічэнка не падабаецца. Паўлічэнка, які гэтых нягоднікаў спыніў на подступах да рэзыдэнцыі тры гады таму, калі яны ішлі на штурм. І яны хочуць, каб я Паўлічэнку кінуў пад гусеніцы танкаў? Ня выйдзе!»

А.Лукашэнка абвінаваціў Захад у разбэшчваньні беларускіх дзяўчатаў, пашырэньні ў Беларусі наркаманіі і г.д. Такія заявы, мусіць, ня будуць спрыяць пашырэньню гандлёвых і культурных кантактаў Беларусі зь іншымі краінамі.

У цэлым гэта выглядала як спроба гальванізацыі здранцьвелага грамадзтва. А зь іншага, немалаважнага боку — запалохваньня чатырох вартаўнікоў усталяванага парадку. Маўляў, вы са мной павязаныя. Дык што, выходзіць, у кагосьці зьявіліся думкі, што адказваць пасьля «моманту Х» будзе ўсё ж нехта адзін?

На кожны ранейшы крок кшталту візавых абмежаваньняў Лукашэнка адказваў новай порцыяй рэпрэсій. Апошні раз — арыштам Марыніча і закрыцьцём трох газэтаў і дзясятка недзяржаўных арганізацый. На чарговае рашэньне Эўразьвязу адказу трэба чакаць стопудовага. Відовішча будзе не для слабых на нэрвы.

**Мікола Бугай**

КІНО

# Каляровыя сны Дунечкі



«Дунечка». Рэж. Аляксандар Яфрэмаў. Прэм’ера ў «Кастрычніку» ў пятніцу а 18.10.

На тле апошніх беларускіх фільмаў «Дунечка» выглядае прафэсійна. Гераіня фільму, дзесяцігадовая дзяўчынка, іграе ў тэатры, адчувае першае каханьне і з дапамогай бабулі (Зінаіда Шарко), расейскай інтэлігенткі, разьбіраецца ў трагічна-сьмешных супярэчнасьцях жыцьця.

У параўнаньні зь бесканфліктным і «бяздомным» «Павадыром» «Дунечка» — сур’ёзны крок наперад у творчасьці Яфрэмава. Зьявілася рэтра-атмасфэра 20-гадовай даўніны — хаця збольшага саладжавая і зрэдку крытычная. На экране — пазнавальныя інтэр’еры Купалаўскага тэатру. Але расейская мова на сцэне гучыць ненатуральна (карціна ў значнай ступені здымалася за расейскія грошы).

Пераходы ад сьлёз да сьмеху і ад сьмеху да сьлёз пазначаныя, але ў канфліктах прытулілася недагаворанасьць, акторская няпраўда, непераканаўчая суцяшальнасьць.

Надзвычайным майстэрствам вылучаецца гукавая партытура: шэпты ў тэатральнай залі, шум мора, залітыя каляровым сьвятлом кадры... Аднак за насычанымі фарбамі і тонкімі шэптамі схаваная далікатная, але невынішчальная рэжысэрская штучнасьць. Гэта не рэвалюцыйныя ўцёкі ў іншую рэчаіснасьць мастацтва ці ўспамінаў. Гэта санкцыянаваны зьверху спакой. У залагоджваньні месца паходжаньня старанна і карэктна забытае, а сапраўдныя канфлікты акуратна імітуюцца адценьнямі. «Дунечка» ніколі не прытуліцца да неба.

Гэтай чульлівай, але неглыбокай карціне гарантаваны неблагі глядацкі посьпех і добрая каса. Аднак штучнае кіно, пазбаўленае зямлі і неба, так і застанецца дыстыляванай вадой, расфарбаванай пад каляровыя сны.

Працяг агляду Андрэя Расінскага **на старонцы 7**.

З УСІХ СТАРОН

## Клюб «Крамбамбуля» ў Маскве



У Маскве ў раёне ВДНГ адкрыўся клюб-кавярня пад назвай «Крамбамбуля» зь беларускімі стравамі і мэню на беларускай мове. Дырэктар Сяргей Мітрошкін кажа, што старажытны напой карыстаецца шалёнай папулярнасьцю. У хуткім часе там адбудзецца прэзэнтацыя максы-сынглу «Крамбамбулі», музыка якой даспадобы заўсёднікам клюбу.

**Сяргей Будкін**

ПРЫРОДА

## Найбольшы ў Эўропе грыб

выяўлены ў швайцарскім нацыянальным парку ля перавалу Офэн. Грыбніца Armillaria ostoyae — аднаго зь відаў апенькаў — разьляглася пад зямлёю на 35 га. Гэты ядомы грыб паразытуе на дрэвах і кустарніках, псуючы іх карэньне. Найбольшая ж выяўленая грыбніца ў сьвеце знаходзіцца ў ЗША, у штаце Арэгон. Яе плошча 890 га, а ўзрост — каля 2400 гадоў, мяркуючы па хуткасьці росту гэтых грыбоў.

ПЕРАМОГА

## Ніўскі кур’ер найхутчэйшы ў сталіцы



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

25 верасьня экалягічна-краязнаўчая суполка «Побач» арганізавала ў Менску безаўтамабільную гульню «Перавозка». Гульня прысьвячалася Сусьветнаму дню без аўтамабіляў (22 верасьня). У гульні ўдзельнічалі 10 каманд і асобных удзельнікаў, 6 на грамадзкім транспарце, 4 на роварах. Перамог кур’ер і тэхрэд «НН» Андрэй Чык. Ён праехаў праз усе кантрольныя пункты (4 абавязковыя і 2 дадатковыя) за 1 гадзіну 32 хвіліны.

## Высьвячаны новы сьвятар

**27 верасьня, на Ўзьвіжаньне, у Сьвятадухавым саборы рукапаклалі новага сьвятара — айца Яўгена Грамыку, гадаванца факультэту тэалёгіі ЭГУ. Адным беларускамоўным бацюшкам стала болей. На жаль, мову багаслужбы яны выбіраць ня вольныя, а вось казані кожны шчыры сьвятар можа казаць на любой мове. Віншуем і просім Бога ўмацаваць іх у вернасьці свайму народу.**

## Увазе прыватных распаўсюднікаў

«Нашу Ніву» для распаўсюду па цане 550 рублёў можна купіць у краме УП «Марат». Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## «Крамбамбуля» з азіятчынай



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Праект «Крамбамбуля» прапаноўвае кожнаму адпачыць ад шчымлівай рэчаіснасьці ды разьняволіцца пад добрую музыку. Паводле слоў удзельнікаў «Крамбамбулі», гэта будзе «нармальны клюбны канцэрт». Будуць зайграныя песьні з максі-сынглу «Крамбамбулі», што выйдзе 15 кастрычніка, а таксама абсалютна новыя, мала кім чутыя творы — такія, як «Сьвяты Патрык» і «Рыкша». Будзе значна пашыраны азіяцкі блёк: у канцэрце возьме ўдзел музыкант з Ірану Німа. Разам з Вольскім засьпяваюць Гюнэш Абасава і Аляксандар Кулінковіч.

**Сяргей Будкін**

Клюб «Рэактар», **1 кастрычніка** а 19-й.

## Мітынг-канцэрт супраць пажыцьцёвага

Кандыдаты ад дэмакратычных партый падалі на рэгістрацыю ў гарвыканкам заяўку на правядзеньне мітынгу-канцэрту за дэмакратыю. Ён мае адбыцца а 15-й 10 кастрычніка, у нядзелю, у парку Дружбы народаў ля плошчы Бангалор.

# «ARCHE» пра Лукашэнку




Новы нумар часопісу прысьвечаны прэзыдэнту, які 10 гадоў кіруе краінай. У нумары:
**Валер Булгакаў** «Загадкі і адгадкі лукашэнкаўшчыны», **Андрэй Казакевіч** «Беларуская сыстэма: марфалёгія, фізіялёгія, генэалёгія», **Вольф Рубінчык** «Лукашэнка бяз маскі, або Гульня на паніжэньне», **Славой Жыжак** «Лавіце момант: ленінская спадчына», **Валянцін Акудовіч** «Прэзыдэнт недадуманай нацыі», **Макс Шчур** «Venit, dividit et imperat»
Для аматараў эсэістыкі й літаратуры:
**Пятро Васючэнка** «Беларус вачыма беларуса», **а.Аляксандар Надсан** «Новая Друя», **Аляксей Знаткевіч** «Грудзі Курнікавай — канец гісторыі», **Юрась Пацюпа** «Зьяўленьне героя», **Анджэй Шчыпёрскі** «Імша за места Арас»

# Марцін Хекер: «Мы па-ранейшаму працягваем руку дапамогі»

**Напярэдадні Дня нямецкага адзінства пасол Нямеччыны ў Беларусі Марцін Хекер адказаў на пытаньні карэспандэнткі «НН».**

**«НН»: Спадар амбасадар, дазвольце павіншаваць Вас з Днём нямецкага адзінства 3 кастрычніка. Як Вы будзеце сьвяткаваць гэты дзень?**

**Марцін Хекер:** Мы адзначым гэты дзень адкрыцьцём новага будынку нашага візавага аддзелу. Гэта павінна неяк вырашыць праблему ажыятажу зь візамі. Гэта знак, што мы застаёмся гасьціннай краінай. Той будынак, у якім пасольства разьмяшчаецца цяпер, не належыць нам, а толькі здадзены ў арэнду. Знайсьці іншы будынак аказалася немагчыма. Дарэчы, беларуская амбасада ў Бэрліне разьмешчана ў прыгожых новых будынках. На 3 кастрычніка мы запрасілі сюды аўтара праекту беларускага пасольства ў Бэрліне, гэта вельмі вядомы нямецкі архітэктар. Магчыма, можна будзе ўсё ж вырашыць пытаньне з будынкам для амбасады.

**«НН»: Адным з вашых першых візытаў у Беларусі была паездка ў Мар’іну Горку на адкрыцьцё SOS-вёскі. Вы надаяце нейкае асаблівае значэньне гэтаму праекту?**

**МХ:** Сапраўды, паміж Беларусьсю і Нямеччынай існуюць вельмі шчыльныя кантакты ў сфэры гуманітарнай дапамогі. Штогод каля 20 тысяч дзяцей адпачываюць у Нямеччыне, многія немцы ахвяруюць грошы на такія гуманітарныя праекты. Напрыклад, мая сястра цяпер займаецца справамі сваёй сяброўкі, якая памерла і, ня маючы родных, ахвяравала 1 мільён эўра для дзяцей. SOS-вёскі існуюць у многіх краінах, гэта паважаны ў міжнародным маштабе гуманітарны праект. Я ведаю прыклады яго ажыцьцяўленьня ў Камбоджы і Ўзбэкістане, і паўсюль дзяржава спрыяе стварэньню такіх вёсак. Тут, у Беларусі, аднак, яны дагэтуль не прызнаваліся. Гуманітарныя праекты абкладаюцца падаткам, дзяржава перашкаджала стварэньню SOS-вёсак. У Мар’інай Горцы адзін з дамоў так і не дабудаваны, стаіць толькі падмурак. Я рады, што пасьля адкрыцьця SOS-вёскі з прадстаўнікамі ўраду і Адміністрацыі прэзыдэнта ваш прэзыдэнт падпісаў указ, які вызваляе SOS-вёскі ад падаткаў.

**«НН»: Падчас уручэньня даверчых лістоў Вы сказалі, што Беларусь застаецца неаддзельнай часткай Эўропы. Аднак цяпер Беларусь нават не далучана да ліку «новых суседзяў» у новай стратэгіі Эўрапейскага Зьвязу. Якія пэрспэктывы мае Беларусь у міжнародным пляне?**

**МХ:** Геаграфічна і культурна Беларусь, безумоўна, належыць да Эўропы. Палітычна гэта залежыць ад Беларусі. Беларусы самі павінны вырашыць, дзе яны хочуць знайсьці сваю радзіму. 1 траўня, пасьля ўваходжаньня ў ЭЗ новых краін, Беларусь стала нашай непасрэднай суседкай. Эўразьвяз гатовы да ўключэньня Беларусі ў сваю палітыку суседзтва. Рада Эўразьвязу ў заяве ў чэрвені абвесьціла, што ЭЗ будзе гатовы да пабудовы дагаворных стасункаў, як толькі Беларусь увядзе дэмакратычную форму кіраваньня і правядзе свабодныя выбары. Падчас перадачы даверчых лістоў я выказаў надзею на тое, што Беларусь зойме сваё месца сярод эўрапейскіх краін. Калі ж рэфэрэндум і выбары недастаткова будуць адпавядаць міжнародным крытэрам свабодных і сумленных выбараў, гэта не застанецца без наступстваў. На гэтых выхадных я быў у Берасьці і па той бок мяжы, у Белай Падляскай і ў Тэрэспалі. Бурмістар Тэрэспалю выказаў пажаданьне, каб Беларусь магла далучыцца да Эўразьвязу і каб можна было езьдзіць вольна ў Берасьце, як у Вільню. Мы гатовы працаваць дзеля гэтай мэты.

**«НН»: Вашым мінулым месцам працы быў Узбэкістан. Як адрозьніваецца сытуацыя ў Беларусі ад сытуацыі ў Узбэкістане? Дзе прасьцей працаваць?**

**МХ:** У Беларусі больш актыўная і сьпелая грамадзянская супольнасьць, а ва Ўзбэкістане большую ролю адыгрываюць кланы і сем’і. Але я вельмі ахвотна працаваў ва Ўзбэкістане. Там былі вельмі добрыя стасункі з прэм’ер-міністрам. Тут урад трымае дыстанцыю ад заходніх дыпляматаў. Узбэкістан спрасьціў парадак атрыманьня візы спачатку для нямецкіх, потым для іншых замежных турыстаў. У выніку за час маёй працы паслом адносіны Ўзбэкістану й Нямеччыны сталі больш шчыльнымі, я нават атрымаў падзяку ад ураду за рост колькасьці нямецкіх турыстаў. Трэба сказаць, што ў Беларусі можа рабіцца больш для прыцягненьня турыстаў. Беларусы атрымліваюць штогод каля 100 тысяч нямецкіх візаў (з колькасьцю насельніцтва каля 10 мільёнаў), а немцы атрымліваюць толькі 32 тысячы віз у Беларусь (на 80 мільёнаў насельніцтва).

**Працяг на старонцы 6.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Марцін Хекер**, нар. у 1942. Паводле адукацыі юрыст-міжнароднік. Вывучаў юрыспрудэнцыю ў ФРГ, Аўстрыі і ЗША. Былы супрацоўнік амбасады Нямеччыны ў Маскве (1995—2000), пасол ва Ўзбэкістане (2000—2004).

# Кожны чацьверты кандыдат

## дабіўся рэгістрацыі праз Цэнтравыбаркам, але страціў каштоўны агітацыйны тыдзень

163 скаргі на нерэгістрацыю разгледзеў Цэнтравыбаркам. 41 прэтэндэнт дабіўся аднаўленьня справядлівасьці.

У сталіцы з 40 скаргаў задаволеныя 11. Да ранейшых 60 кандыдатаў, якія балятуюцца ў 18 менскіх акругах, дадаліся яшчэ 11, сярод якіх вядомыя палітыкі.

Адноўлены ў правах лідэр «Рэспублікі» генэрал Валеры Фралоў (Масюкоўшчынская акруга №104). Тут жа зарэгістраваны кандыдатам старшыня Рэспубліканскай партыі Ўладзімер Белазор, якому акруговая камісія напачатку адмовіла ў рэгістрацыі, абвінаваціўшы ў недакладных зьвестках пра месца працы (У.Белазор працуе ў сакратарыяце палаты прадстаўнікоў) ды ва ўтойваньні 341 тыс. рублёў.

Генэрал Мечыслаў Грыб у Кастрычніцкай акрузе №99 складзе канкурэнцыю сакратару ўправы Партыі БНФ Аляксею Кавальцу ды амбіцыйнаму лідэру ЛДП Сяргею Гайдукевічу.

Супернікам старшыні Народнай грамады Міколы Статкевіча ў Каліноўскай акрузе №108 зарэгістраваны Юры Хадыка, намесьнік старшыні Партыі БНФ.

Жыхары Чыжоўкі змогуць рабіць выбар паміж сустаршынём прафсаюзу РЭПАМ Генадзем Фядынічам, Аляксеем Янукевічам з Партыі БНФ ды Сьвятланай Каралёвай з АГП.

Сярод кандыдацкага папаўненьня ад Берасьцейшчыны — дэпутат Белаазерскага гарсавету Юры Губарэвіч (Бярозаўская акруга №8). На Гомельшчыне зьнятыя прыдзіркі з дэпутатаў Вярхоўнага Савету XIII скліканьня Марата Афанасьева ды Віктара Хоміча.

**ГХ**

# Кааліцыя ў складзе аднае партыі

**Ад Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь» балятуюцца толькі кандыдаты Народнай грамады.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Бацькі «Свабоднай Беларусі»: Мікола Статкевіч (зьлева) і Андрэй Саньнікаў.**

У штабе партыі Статкевіча цешацца невялікай перамогаю: 21 верасьня партыя дабілася рэгістрацыі кандыдата, які балятуецца ў Барысаве разам зь Сяргеем Салашам (БНФ) і дэпутатам палаты Віктарам Гумінскім, — рэдактара «Борисовских новостей» Анатоля Букаса. Усяго ад Сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада» ідуць 29 кандыдатаў.

Адначасова Народнай грамадзе пагражае зьняцьце кандыдатаў ад Віцебшчыны. Упраўленьне юстыцыі давяло да ведама партыі, што Будтрэст №9 датэрмінова разарваў дамову арэнды офісу зь юрадрасам, падпісаную з абласной арганізацыяй Народнай грамады. Дзевяці кандыдатам-народаграмадоўцам пагражае зьняцьце з дыстанцыі.

Што датычыць партнэраў па шырока разрэкламаванай у свой час кааліцыі, дык Мікола Статкевіч заявіў, што Эўрапейская кааліцыя «Свабодная Беларусь» «не зьяўляецца перадвыбарным блёкам», і параіў зьвярнуцца па інфармацыю аб вылучэньні астатніх кандыдатаў да сустаршыні ЭКСБ Андрэя Саньнікава. Той, у сваю чаргу, паслаў па інфармацыю да М.Статкевіча.

Вядома, што іншая ўдзельніца «Свабоднае Беларусі» Партыя жанчын «Надзея» на чале з Валянцінай Матусевіч кандыдатаў не вылучала.

На пытаньне, навошта было ў такім разе заяўляць аб стварэньні «Эўрапейскай кааліцыі», могуць са смакам адказаць у штабах іншае перадвыбарчае сілы — «Пяцёркі+».

**Глеб Хмяльніцкі**

# Кааліцыя трох кандыдатаў



**Кааліцыя «Маладая Беларусь», утвораная вакол «Маладога фронту», вылучыла дзесяць прэтэндэнтаў, зь якіх чатырох зарэгістравалі. Дый з тых улады не пацярпелі Севярынца.**

Найбольш вядомым маладым кандыдатам быў лідэр «Маладога фронту» Павал Севярынец, які — пры сямі суперніках — балятаваўся ў Віцебскай-Горкаўскай акрузе №17. Галоўным лёзунгам П.Севярынца было — «На рэфэрэндуме я галасую «не». Правядзеньне шасьці антырэфэрэндумных кампаній у акрузе замест аднае можа даць заўважны плён, сказаў ён карэспандэнту «НН» у панядзелак. А ў аўторак прыйшла навіна пра зьняцьце Севярынца з дыстанцыі акурат за агітацыю супраць пажыцьцёвага прэзыдэнцтва (**старонка 4**).

Кіраўнік Гарадзенскай арганізацыі «МФ» Аляксандар Зарамбюк балятуецца ў Мастах, дзе палітыку супрацьстаіць начальнік Гарадзенскага УУС Аляксей Белашэўскі. Сяржук Бахун зь Берасьця ідзе па Дарагічынскай акрузе №9 супраць дзейнага дэпутата палаты Ўладзімера Здановіча. У Менску ва Ўручча балятуецца Кастусь Лукашоў.

Яшчэ трое маладафронтаўцаў — зь Нясьвіжу, Ракава й Сьветлагорску — спрабуюць адбіць права змагацца за мандаты празь Вярхоўны Суд.

Усё ж дзесяці вылучаных чалавек замала, каб прэтэндаваць на гучны назоў «кааліцыя».

**ГХ**

# Дзевяць дэпутатаў ужо абрана

**Безальтэрнатыўныя выбары дэпутатаў палаты прадстаўнікоў чакаюцца ў дзевяці за 110 акруг Беларусі. Найбольшая колькасьць такіх акруг зафіксавана на Гомельшчыне.**

У дзевяці акругах выбаршчыку даецца надзвычай шырокі выбар паміж «за» ці «супраць». Кандыдаты ўжо цяпер могуць лічыцца дэпутатамі, бо пры адсутнасьці альтэрнатывы выбаршчык звычайна галасуе «за», а ня «супраць», каб не прыйшлося другі раз цягнуцца на ўчастак.

Гомельшчына ў гэтую кампанію трымае безумоўнае лідэрства: пяць зь дзевяці шчасьлівых акругаў разьмяшчаюцца менавіта ва Ўсходнім Палесьсі, якое ў 2001 г. падало найбольш галасоў за А.Лукашэнку. У чатырох такіх акругах ідуць дзейныя дэпутаты палаты прадстаўнікоў. Яшчэ адзін выразны прадстаўнік партыі ўлады — былы міністар сельскай гаспадаркі, цяпер кіраўнік аддзяленьня пасольства Беларусі ў Расеі Міхаіл Русы — абраў для сябе Жыткавіцкую акругу. У астатніх балятуюцца дырэктары школаў.

Дзьвюма безальтэрнатыўнымі акругамі вызначылася Берасьцейшчына. У Івацэвіцкай балятуецца Аляксандар Сьвірыд, які прайшоў у палату ў гэтай самай акрузе чатыры гады таму. Акруговая камісія расчысьціла яму дарогу, адмовіўшы ў рэгістрацыі Ўладзімеру Радзівончыку (АГП), у складзе ініцыятыўнай групы якога нібыта знайшлі грамадзян іншае краіны. Пра сытуацыю ў Баранавіцкай сельскай акрузе піша наш баранавіцкі карэспандэнт на **старонцы 5.**

На Гарадзеншчыне адна акруга з адзіным кандыдатам: у Навагрудку гэтак балятуецца А.Ліс, інжынэр-мэханік, выкладчык-палітоляг, старшыня Навагрудзкага райвыканкаму.

На Віцебшчыне таксама адна безальтэрнатыўная акруга — Віцебская сельская. На мінулых выбарах у гэтай акрузе прайшла цяперашняя дэпутатка Тацяна Голубева, якая гэтым разам кандыдуе ў Смаргоні, саступіўшы дарогу дырэктару Кіраўскай СШ Віцебскага раёну.

**ГХ**

## А сьвіньні хто?

Мала даходу ўказаў — да пабачэньня. Многа — таксама да пабачэньня. Выбарчыя камісіі чапіліся да кожнае драбязы, абы не дапусьціць незалежных кандыдатаў да выбараў.

Сябар АГП Мікалай Гаўрыленка балятуецца ў Палескай выбарчай акрузе №45 Гомельшчыны разам з скандальна знакамітым змагаром з Васілём Быкавым — дзейным дэпутатам Сяргеем Касьцянам. М.Гаўрыленка зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты 16 верасьня, аднак ужо 20 верасьня акруговая камісія адмяніла ўласнае рашэньне ў зьвязку зь «нядаўна адкрытымі абставінамі» — прэтэндэнт нібыта падаў несапраўдныя зьвесткі ў дэклярацыі пра даходы й маёмасьць. Маўляў, 835 тысяч рублёў даходу ад продажу сьвіней з уласнай гаспадаркі прэтэндэнт насамрэч не атрымаў. Падстава — даведка сельсавету, што летась прэтэндэнт ня меў сьвіней ва ўласнай гаспадарцы. «Дзьве-тры сьвіньні я заўжды трымаю», — падкрэсьліў Мікалай Гаўрыленка на пасяджэньні Цэнтравыбаркаму. А сельсавет, абавязаны праводзіць перапіс быдла, чатыры гады сваімі абавязкамі не займаўся, а таму і ня можа ведаць пра сьвіней».

Цэнтравыбаркам мусіў сьвінскае рашэньне скасаваць.

## МТС у лідэрах

GSM-апэратар МТС па колькасьці абанэнтаў абагнала свайго асноўнага канкурэнта — Velcom. Паводле зьвестак ураду, МТС мае 945 тыс.кліентаў, а Velcom — толькі 925 тыс. З пачатку году МТС павялічыў колькасьць абанэнтаў удвая, а Velcom — у паўтара разу. У 2005 г., паводле прагнозаў Мінсувязі, колькасьць карыстальнікаў мабільнай сувязі дасягне 3 млн чалавек.

## Налёт АБЭЗ на друкарню

Прыватнай друкарні «Топ Тайп», якая друкавала ўлёткі кандыдатам у парлямэнт ад дэмпартыяў, пагражае закрыцьцё. Супрацоўнікі ўправы барацьбы з эканамічнай злачыннасьцю лічаць друк улётак парушэньнем закону, бо Цэнтравыбаркам яшчэ не пералічыў за іх грошы. Дырэктар друкарні Эдуард Гурбо лічыць, што гэта спроба перашкодзіць агітацыйнай кампаніі кандыдатаў: падчас выбараў у 2000 г. ЦВК пералічыла грошы за падобную ж працу толькі празь месяц пасьля выбараў.

## Пушкін у Празе

Выстава Алеся Пушкіна адбылася ў праскай галерэі «Artmap». У чэскай сталіцы Пушкін жыў цэлы месяц і намаляваў некалькі палотнаў — «Сьвяты Мікалаш над Прагай», «Францішак Скарына ў Празе». На выставе паказалі фільмы пра мястэчка Бобр, дзе жыве мастак, і пра ягоны пэрформанс «Беларуская прысутнасьць» на Карлавым мосьце. Запрошаныя прадстаўнікі беларускага пасольства ў Празе на выставу не прыйшлі.

## Інтэлектуалы пра палітыку Расеі

115 палітыкаў і інтэлектуалаў падпісалі адкрыты ліст да кіраўнікоў краінаў NATO і Эўразьвязу, патрабуючы зьмяніць палітыку ў дачыненьні да Расеі. Яны лічаць, што Расея цалкам выракаецца дэмакратычных вартасьцяў. Пэўную адказнасьць яны ўскладаюць і на Захад, які не пратэставаў супраць палітыкі Пуціна. Сярод падпісантаў экс-прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Гавал, сэнатар ЗША Джон Макейн, рэдактар польскай «Газэты выборчай» Адам Міхнік, лідэр нямецкай Партыі зялёных.

## Прэзэнтацыя Ліцэю за мяжой

Прэзэнтацыя дыску «Я люблю ліцэй: Веру ў цябе», двойчы сарваная ў Менску, адбудзецца ў Польшчы — у Варшаве (7 кастрычніка ў Доме мастацтва Ўрсынаў), Гайнаўцы (8 кастрычніка ў тамтэйшым Беларускім ліцэі), Бельску (8 кастрычніка, 15.30), Беластоку (9 кастрычніка).

## Януковіч — за расейскую

Кандыдат у прэзыдэнты Ўкраіны Віктар Януковіч заявіў, што падтрымлівае наданьне расейскай мове статусу другой дзяржаўнай. Таксама ён падтрымлівае ідэю прызнаньня падвойнага грамадзянства паміж Расеяй і Ўкраінай і выступае супраць уваходжаньня краіны ў NATO.

## Румынскі прэзыдэнт не ідзе на трэці тэрмін

74-гадовы прэзыдэнт Румыніі Іён Іліеску, які кіруе краінай ужо другі тэрмін, падпісаў закон, які дазваляе яму ўдзельнічаць у выбарах — праўда, толькі ў парлямэнцкіх. Ён мае балятавацца ад кіроўнай Сацыял-дэмакратычнай партыі. Канстытуцыйнае абмежаваньне на два тэрміны прэзыдэнцтва ён парушаць ня будзе.

**АШ; БелаПАН, радыё «Свабода»**

## Зінаіда Бандарэнка зарэгістраваная

**Смаргонская акруговая камісія, адмаўляючы ў рэгістрацыі народнай артысткі З.Бандарэнцы (на здымку ўнізе), спаслалася на тое, што, падаючы ў дэклярацыі суму атрыманай пэнсіі, яна памылілася на 20 рублёў. Аднак ЦВК высьветліла, што ў агульнай суме даходаў З.Бандарэнкі памылкі не было. З.Бандарэнка з двухтыднёвым спазьненьнем пачынае сваю передвыбарчую кампанію. Яна гэтак сказала пра галоўнае палажэньне сваёй праграмы ў інтэрвію радыё «Свабода»: «Я лічу, што людзям трэба казаць праўду, асабліва пра рэфэрэндум. Цяпер ужо іншыя пытаньні адыходзяць на другі плян. Цяпер самае галоўнае, каб людзі падумалі і не зрабілі зноў памылкі. Бо трэці тэрмін — гэта крок у мінулае».**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Межы дазволенага

**У Віцебску зьняты зь перадвыбарнай гонкі лідэр «Маладога фронту» Павал Севярынец. Фраза зь ягонага радыёвыступу «Ці хочаце Вы жыць у краіне, дзе ўсё вырашае адзін чалавек?» была ацэненая як нагавор на прэзыдэнта, а выразы «грамадзкі й палітычны застой» і «карупцыя, бюракратыя, хлусьня на ўсіх узроўнях» — як недакладныя зьвесткі і агульнае абвінавачаньне службовых асоб адпаведна. Сапраўднай прычынай, лічыць Павал, было тое, што за тыдзень ягоная ініцыятыўная група абышла 7 тысяч кватэр, распаўсюдзіла 25 тыс. улётак.**

## Дабравольскі разьлічвае на перамогу

**У аднаго зь яркіх лідэраў апазыцыі — намесьніка старшыні АГП Аляксандра Дабравольскага апанэнтаў у Сьвіслацкай акрузе №96 Менску двое: былая намесьніца кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёну сталіцы, цяперашняя дэпутатка Галіна Мазуркевіч ды намесьнік старшыні ЛДПБ Анатоль Хішчанка. Як лічыць сам А.Дабравольскі, ён мае «досыць добрыя» шанцы на абраньне. Калі, зразумела, выбары будуць хоць бы мінімальна праўдападобнымі.**

# Адзін зьняўся сам, другога шчэ й укаралі

Настрой у большасьці кандыдатаў пагаםны. У выбарчыя камісіі ня трапіў ніводны прадстаўнік партый. Узначальваюць іх прадстаўнікі дырэктарату, а сябры камісій — іх падначаленыя. Да таго ж, як заўсёды, народ зьбіраюцца гнаць на датэрміновае галасаваньне, каб да нядзелі прыйшло сама меней 53%.

Баранавічы падзелены на дзьве выбарчыя акругі — Заходнюю №4 (4 кандыдаты) і Ўсходнюю №5 (7 кандыдатаў). У Заходняй акрузе трое чалавек зьнялі свае кандыдатуры. Зь іх двое — прадстаўнікі партый (АГП і БНФ). Алесь Грыцавец, старшыня мясцовай суполкі Партыі БНФ, наагул напісаў заяву аб зьняцьці кандыдатуры пасьля таго, як яго зарэгістравалі, напісаўшы, што робіць гэта «праз нястачу часу для агітацыйнай працы». Для «НН» камэнтаваць свае дзеяньні ён адмовіўся, дадаўшы толькі, што ў сапраўднасьці ўсё ўсім мусіць быць зразумела.

Ва Ўсходняй акрузе сябар Партыі БНФ прадпрымальнік Віктар Мязяк ня здолеў зарэгістравацца. Камісія знайшла хібы ў падазенай дэкларацыі, а падатковая інспэкцыя яшчэ й пакарала на значную суму.

Цяперака Заходняя акруга сталася паводле складу настаўніцкай (на 75%) і напалову сацыял-дэмакратычнай (50%). Там змагаюцца паміж сабою Анатоль Ваньковіч, палкоўнік, першы намесьнік камандуючага вайскова-паветранымі сіламі; Карней Пятровіч, выкладчык Баранавіцкага ўнівэрсытэту, БСДГ; Натальля Стахно, пэнсіянэрка, «Народная грамада», і Тамара Шукала, дырэктарка гімназіі №5.

Ва Ўсходняй акрузе затое маюцца прадстаўнікі большасьці партый гораду — Сяргей Андрушчанка, прадпрымальнік, АГП; Аркадзь Блінкоўскі, пэнсіянэр, БСДГ; Аляксандар Галькевіч, доктар хуткай дапамогі, ПКБ; Аляксандар Долмат, намесьнік дырэктара швейнай фабрыкі, «Народная грамада»; Ларыса Малікава, загадчыца гінэкалягічнага аддзелу бальніцы; Віктар Петруковіч, супрацоўнік аховы заводу станкапрылад, ЛДП; Мікалай Сергіенка, дэпутат палаты прадстаўнікоў.

У сельскай акрузе зарэгістравалі толькі аднаго кандыдата — Уладзімера Майсюка, дырэктара УП аўтамабільных дарог «Берасьцеаўтадар».

**Руслан Равяка, Баранавічы**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Самая беларускамоўная акруга

**Дзейны дэпутат палаты прадстаўнікоў Ігар Баслык з групы «Рэспубліка» балятуецца ў Вялейскай акрузе №79. Поруч з І.Баслыком, былым дырэктарам птушкафабрыкі «Заранак камунізму», 1962 г.нар., беспартыйным, змагаюцца Ўладзімер Малярчук (АГП), Аляксей Сюдак (БНФ).**

**Менавіта ў Вялейскай акрузе №79 І.Баслык выбраны дэпутатам і сёлета зноў мае не найгоршыя шанцы.**

**Цікава, што Галіна Кутас, кандыдатка ад улады ў акрузе, выкарыстоўвае беларускую мову ў сваёй выбарчай агітацыі.**

**На здымку: Ігар Баслык** (зьлева) **і Ўладзімер Парфяновіч у часе дэпутацкае галадоўкі.**

## Гісторыя Ліштвана



**Алімпійская чэмпіёна Атланты 1996 г. Сяргея Ліштвана не зарэгістравалі ў Бабруйскай-Першамайскай акрузе. Ён паехаў на Алімпіяду ў Афіны, і цяжар збору подпісаў лёг на плечы бацькі. Выйшла, што подпісы ў падтрымку С.Ліштвана ініцыятыўная група здала, а вось астатнія дакумэнты — анкету, дэкларацыю — акруговая камісія не атрымала. Таму ад пачатку акруговая камісія адмовіла ў рэгістрацыі. «Шкада хлопца, але...» — так адрэагаваў на сытуацыю з алімпійскім чэмпіёнам сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. С.Ліштвану 34 гады, ён жыве ў Менску.**

**ГХ, СМ**

# Улётка як твор мастацтва

Як чалавек, спрактыкаваны ў выдавецкіх справах, кандыдатка ў дэпутаты па Полацкай гарадзкой выбарчай акрузе №28 паэтка Алена Сом адна зь першых у Полацку надрукавала свае перадвыбарныя ўлёткі. Сярод іншых праблем і пытаньняў яна закранула ў сваім агітацыйным матэрыяле тэму рэфэрэндуму: «Хопіць гвалціць Канстытуцыю! Хопіць падганяць законы пад аднаго чалавека! Закон і парадак! «Не» трэцяму тэрміну!» У сваёй праграме Алена Сом выступае супраць «кантрактнага рабства», паборaў з прадпрыемстваў і таемных прэзыдэнцкіх фондаў, падтрымлівае разьвіцьцё малога бізнэсу, выступае за рэальныя падаткі і празрыстасьць бюджэту. Улётка таксама зьмяшчае партрэт кандыдаткі, яе біяграфію, карыкатуры на рэаліі беларускага жыцьця. Наклад — 5 тысяч. Алена Сом кажа, што гэта толькі першая, азнаямляльная ўлётка — яшчэ плянуецца выдаць тры, абяцае, што наступныя будуць яшчэ больш зьместоўныя і цікавыя.

На Полаччыне з найменшымі стратамі пераадолелі выпрабаваньне рэгістрацыяй прэтэндэнты на дэпутацкія мандаты ад Партыі БНФ: у Полацкай гарадзкой выбарчай акрузе №28 зарэгістраваная паэтка, настаўніца сярэдняй школы Лера Сом, у Полацкай сельскай акрузе №29 — праваабаронца Зьміцер Салаўёў, у Наваполацкай гарадзкой №25 — дэпутат Наваполацкага гарсавету Васіль Главацкі. Не зарэгістраваны ўсе кандыдаты ЛДП. Ёсьць страты ў АГП, якую на Полаччыне цяпер прадстаўляе толькі адзін кандыдат — Аляксандар Цярэнцьеў (акруга №25). Адзін прадстаўнік застаўся і ў ПКБ — Леанід Карпішын (акруга №28). Прадстаўнікі іншых партый у выбарчай кампаніі на Полаччыне ня ўдзельнічаюць.

**Васіль Кроква, Полацак**

# Бюджэт расьце як на дражджах

**У праект бюджэту на 2005 год закладзены выдаткі ў суме 18,8 трлн рублёў пры прыбытках (прагноз) 17,9 трлн рублёў. У параўнаньні зь сёлетнімі паказчыкамі абедзьве часткі выраслі амаль на 5 трлн рублёў кожная.**

Дэфіцыт бюджэту плянуецца ня больш як 910 млрд рублёў. Гэтая лічба складае ня больш за 1,5% ад ВУП і роўная сёлетнім паказчыкам. Папярэдне бюджэт плянаваўся бездэфіцытным, аднак павышэньне тарыфаў «Газпрому» прымусіла скарэктаваць лічбу. Дэфіцыт мае фінансаваца Нацбанкам, а таксама сумамі ад продажу дзяржаўнай маёмасьці і замежнымі крэдытамі.

## 370 тысяч даляраў фэрмэрам

Каля 45% даходаў рэспубліканскага бюджэту складуць падаткі. Самы большы ўнёсак — з ПДВ (больш за 3 трн рублёў — каля 17,2% ад прыбытковай часткі бюджэту), простыя падаткі на прыбытак прынясуць 1,3 трн рублёў, акцызныя зборы яшчэ 1 трн.

16,4% даходаў бюджэту дадуць дзяржаўныя мэтавыя фонды. Летась гэтая лічба была ў межах 12,4%. Падвышэньне працэнту прыбыткаў ад фондаў зьвязана найперш з павелічэньнем даходаў рэспубліканскага фонду вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі больш чым у 2 разы (да 1 трлн рублёў). Налета працэнт сбору ў гэты фонд устаноўлены ў межах 1,5% ад заробленага. Цікава, што самой сельскагаспадарчай галіне па ведамаснай частцы выдаткаў бюджэту з гэтых грошай дастанецца толькі 426,5 млрд рублёў — менш за палову ад сабранага. Зрэшты, у параўнаньні з паказчыкамі 2004 г. гэта ў 2,5 разу больш. На гэтым фоне дзіўнай выглядае сытуацыя, калі выдаткі на фэрмэрства складаюць усяго 808 млн рублёў — 370 тысяч даляраў. Інакш — 0,045% ад расходнай часткі бюджэту.

## Плацім направа, трацім налева

Фонд спрыяньня занятасьці атрымае больш за 130 млрд рублёў, аднак у бюджэце не прапісана дакладна яго роля ў зьмяншэньні беспрацоўя. Затое грошы, якія паступяць у фонд звыш прагнозных паказьнікаў, зь мінулага году накіроўваюцца не ў рэспубліканскі бюджэт, а ў рэзэрвовы фонд прэзыдэнта Беларусі нібыта для «мэтавага фінансаваньня мерапрыемстваў па сацыяльнай падтрымцы моладзі».

## Забыты Чарнобыль

Расходы бюджэту-2005 на нацыянальную абарону блізкія да 2,8%. Гэткі ж адсотак мелі і ў 2004-м, аднак праз інфляцыю і агульны рост бюджэтнага кошыка сума павялічыцца на 35% ад сёлетняй і складзе 538 млрд. Аж на 45% ад сёлетняга павялічыцца фінансаваньне праваахоўнай дзейнасьці. Цяпер «спакой грамадзян» абыдзецца дзяржаве ў 982 млрд рублёў, ці 5,2% ад усяго бюджэту. Дарэчы, у 2005 г. кампэнсацыя харчпайку вайскоўцам, службоўцам органаў УС, МНС будзе роўная 58500 рублям у месяц.

Практычна не зьмяніліся выдаткі на прамысловасьць, ПЭК, будаўніцтва. Затое зьменшыліся датацыі на пераадоленьне наступстваў аварыі на ЧАЭС да 2%. На гэты год яны складалі каля 3,5% ад усяго памеру выдаткаў. Цікава, што яшчэ ў 2003-м гэта лічба была ў межах 4,5% ад бюджэту.

## Кіна стане болей

З 2000 г. ніжняя мяжа фінансаваньня навукі ў Беларусі складае 3% ад рэспубліканскага бюджэту. Яшчэ ў 1999 г. яна была роўная 2,6%. З трох «навуковых» адсоткаў амаль палова пойдзе на фундамэнтальныя дасьледаваньні.

Галіна адукацыі атрымае 713 млрд рублёў. Гэта менш ад узроўню 2003 г. — тады на адукацыю давалі 6,1% ад бюджэту. Ільвіная доля гэтага, 64% пойдзе ў 2005 г. на вышэйшую адукацыю, 23,5% — на сярэдне-спэцыяльную. З астачы на сярэднія школы даюць усяго 1,2%, бо яны фінансуюцца пераважна зь мясцовых бюджэтаў.

Культура ў наступным годзе будзе фінансавацца ў памеры 64 млрд рублёў — 0,33% ад бюджэта, кіно з гэтага атрымае ўсяго 6,5 млрд рублёў. Праўда, ад кінаўзроўню мінулага году павелічэньне ўдвая. А вось дзяржаўныя СМІ атрымаюць аж каля 87 млрд рублёў! Зь якіх больш за 85% пойдуць на фінансаваньне Новікавых на тэлебачаньні і радыё. Фізычная культура і спорт, паводле функцыянальнай клясыфікацыі, атрымаюць 90 млрд рублёў. Гэта на 20 млрд больш, чым сёлета.

У 2005 г. мінімальная забясьпечанасьць расходамі на мэдыцынскія паслугі на аднаго жыхара рэспублікі складзе 286 тыс. руб. па абласьцях і каля 224 тыс. руб. на менчука. Наагул, выдаткі дзяржавы на ахову здароўя складуць 612,7 млрд. рублёў — 3,4% бюджэту.

Такім чынам, дзяржава працягвае скарачаць выдаткі на адукацыю, Чарнобыль і ахову здароўя, паступова перакладаючы гэтыя клопат на плечы людзей і часткова — на мясцовыя бюджэты. Пры гэтым дзяржава павяртаецца тварам да навукі. Прыярытэтным застаецца фінансаваньне сілавых структураў.

**Сяргей Трафілаў**

# Самы старадаўні меч

Ён быў адшуканы на месцы раскопак гарадзішча дняпроўска-дзьвінскай культуры (V—VII ст. н.э.) Нікадзімава, што ў Горацкім раёне. Нікадзімава — адзін з самых дасьледаваных помнікаў гэтага часу. Сёлетні сэзон быў дзясятым па ліку, аднак такая знаходка, як меч, — першая.

Дагэтуль самым старажытным мячом, знойдзеным на тэрыторыі Беларусі, быў клінок з Полацку X ст. У навуковай літаратуры пэўны час асноўнай лічылася вэрсія, што мячы эўрапейскага тыпу — аднаручныя, з шырокім, двухбаковавострым лязом, прыкладна мэтровай даўжыні — пранікні на нашы землі толькі ў VIII—IX ст. і зьяўляліся прывазнымі з тэрыторыі Рэйнскага басэйну. Зьвестак аб вытворчасьці мячоў на тэрыторыі славянскага расьсяленьня ва Ўсходняй Эўропе да XI ст. не існавала.

Пры гэтым даказана, што балты ўжо ў IV—V ст. выраблялі на тэрыторыі сучаснай Літвы падобныя мячы зь мясцовага жалеза. Там былі знойдзены адразу два мячы гэтага пэрыяду. Дняпроўска-дзьвінская культура, носьбітамі якой было насельніцтва Нікадзімава, — гэта таксама балцкая культура. Лёс нікадзімаўскіх пасяленцаў досыць трагічны: верхні культурны слой гарадзішча ўяўляе сабой адно попел з абгарэлымі чалавечымі касьцямі і наканечнікамі стрэл і коп’яў.



**Апошні сэзон прынёс магілёўскаму археолягу Анатолю Седзіну ўнікальны здабытак — самы старажытны са знойдзеных на гэты час у Беларусі меч.**

Анатоль Седзін не выключае, што прычынай зьнішчэньня гэтага гарадзішча і наагул дняпроўска-дзьвінскай культуры стаўся прыход у Беларусь на сталае пражываньне славянскіх плямён. Падобная вэрсія, праўда, супярэчыць досыць пашыранай «мірнай» вэрсіі расьсяленьня славян па тэрыторыі Беларусі ў VII—IX ст., згодна зь якой нашы продкі доўгі час мірна ўжываліся зь мясцовым балцкім насельніцтвам, паступова яго асыміліючы. Аднак пры гэтым магілёўскі дасьледчык не выключае і варыянту, паводле якога тымі, хто зьнішчыў балцкія пасяленьні ва Ўсходняй Беларусі адзначанага пэрыяду, было нейкае племя прычарнаморскіх качэўнікаў — на карысьць гэтага сьведчаць знойдзеныя на гарадзішчы Нікадзімава трохлопасныя наканечнікі стрэл, характэрныя для качэўнікаў. Аднак (што зробіш, калі ў археалёгіі вечныя «аднак»!) нельга ігнараваць той момант, што трохлопасныя наканечнікі стрэл цалкам маглі быць перанятыя і славянамі, якія дастаткова доўга кантактавалі зь цюркскімі і інда-іранскімі плямёнамі, што насялялі ў тыя часы поўдзень сучаснай Украіны.

Знойдзены меч мае шырыню палатна каля дзесяці сантымэтраў і зламанае ды пагнутае лязо. Злом падобнай формы не характэрны для атрыманага ў бойцы, хутчэй за ўсё ён быў зроблены чалавечымі рукамі. Аб тым, што нікадзімаўскі меч хутчэй за ўсё быў зламаны падчас выканаленьня пэўнага абраду, сьведчыць той факт, што знайшлі яго на тым участку гарадзішча, дзе ў балтаў было сьвятарнае месца.

Навукоўцы лічаць, што ў V—VII ст. мячы не былі характэрнай зброяй для славян. Рымскія і бізантыйскія летапісцы асноўнай іх зброяй называюць дзіды, дроцікі і стрэлы. Калі паспрабаваць праілюстраваць знаходку А.Седзіна і крыху падключыць фантазію, можна сабе ўявіць, як у куродыме пажарышча пераможцызаваёўнікі ўрачыста ламалі чужынскую зброю, узятую са зьмярцьвелай рукі балцкага правадыра, перад зрынутым ідалам.

**Аляксей Бацюкоў, Магілёў**

# Сукенкі ад Лукашэнкі

24 верасьня ў Палацы Рэспублікі вызначалі самую прыгожую дзяўчыну краіны. Квіткі на гэтае мерапрыемства здабыць было досыць праблематычна, бо іх папросту не было. Існавалі толькі запрашальныя білеты, распаўсюджаныя паміж прадстаўнікамі міністэрстваў і сябрамі БРСМ. Трэ было бачыць, зь якім замілаваньнем заля сустракала «галоўнага госьця», — гэтыя авацыі, зачараваныя вочы і лісьлівы шэпт «Прэзыдэнт, прэзыдэнт!!!» будуць перасьледаваць мяне яшчэ не адну ноч.

Прамова міністра культуры Гулякі, што пачыналася зь вітаньня прэзыдэнта, да прэзыдэнта ж была скіравана, бо нагадвала справаздачу: «Былі зроблены ўсе захады па павышэньні эфэктыўнасьці… адбор быў старанны і справядлівы…». Міністра зьмянілі танец пад песьню Пугачовай, дзеці з балёнікамі, паўтузіна мускулістых мужчын і роўна 24 прыгажуні ў ніжняй бялізне.

На сцэне было ўсё, што хочаш, але сувязі паміж нумарамі не было: напэўна, вырашылі ўзяць грандыёзнасьцю задумы. З гэтай прычыны знаных культурыстаў зьмянялі опэрныя сьпевакі, была фанэрная папса ад артыстаў беларускай эстрады (Ярмоленка заявіў са сцэны, што за кулісамі значна цікавей, чым у залі) і ўрачыстае шэсьце рыцараў.

Удзельніцы конкурсу прайшліся па сцэне ў нацыянальных строях і купальных касьцюмах. Пасьля гэтага журы адабрала зь іх тузін найлепшых, якія паказаліся яшчэ ў спартовым адзеньні і вячэрніх строях, а таксама выявілі свой інтэлект пры адказах на пытаньні кшталту «Хто Вы паводле знаку Задыяку?».

У выніку самай прыгожай і разумнай прызналі Вольгу Андропаву з Полацку: на яе баку былі глядацкія сымпатыі, маркуючы з аплядысмэнтаў. Найлепшай фотамадэльлю была прызнана Алена Аладка (яна вядомая з рэклямы «Вэлкаму»). У суцяшальных намінацыях таксама былі адзначаны Ірына Кучко як самая чароўная, Вольга Курышка («2-я Віцэ-міс») і Вольга Герасімовіч (Віцэ-міс). Перад абвяшчэньнем пераможцаў вядучая Алена Сьпірыдовіч паведаміла, што ўсім фіналісткам Лукашэнка прэзэнтуе сукенкі, у якіх тыя шпацыравалі па сцэне. «Міс Беларусь-2004» акрамя ўбраньня атрымала карону, у якой 100 грамаў белага золата і 500 — каштоўных камянёў (яе, праўда, адразу трэба было здаць на захаваньне ў банк), ды 5000 даляраў.

На інтэрнэт-форумах люд адразу ж кінуўся кпіць. Адзін з наведвальнікаў напісаў, што толькі беларусы могуць абраць «Міс» зь вялікім пасьляапэрацыйным шнарам. Другія, наадварот, казалі, што ў шнары няма заганы. Зрэшты, як хто хоча, а для мяне «Міс Беларусь» — гэта мая дзяўчына.

**Сяргей Будкін**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Вольга Антропава застаецца палачанкай

Перамогу палачанкі на «Міс-Беларусь-2004» у Полацку адзначылі прэс-канфэрэнцыяй у кабінэце старшыні гарвыканкаму Ўладзімера Тачылы. Вольга — выхаванка полацкага мадэльнага агенцтва «Сафія». Як мадэль працавала ў Японіі. Ведае ангельскую і японскую мовы. Пасьля школы, скончыўшы адмысловыя курсы, працавала цырульніцай. На прэс-канфэрэнцыі Вольга прызналася, што нікуды з Полацку не зьбіраецца зьяжджаць, хоць ужо і паступілі розныя прапановы. Яна марыць пра свой салён прыгажосьці з адмысловай атмасфэрай сяброўства, дзе кліентам падаюць кубачак кавы, дзе можна прызначыць сустрэчу, пагаварыць пра культурныя падзеі ў горадзе. Полацкі мэр пры журналістах паабяцаў паспрыяць ажыцьцяўленьню гэтай мары. Ён уручыў «Міс-Беларусь-2004» падарункі — фотаальбом пра Полацак ды фігурку Эўфрасіньні Полацкай — і заклікаў дзяўчыну годна несьці імя палачанкі ў сьвет. Ён таксама параіў Вользе паступіць у ПДУ на спэцыяльнасьць «турызм», якая зьвівіцца ў наступным годзе. У сьнежні Вольга будзе ўдзельнічаць у міжнародным конкурсе прыгажосьці ў Кітаі, а ў наступным годзе — абараняць гонар Беларусі на мадэльным подыюме ў Францыі.

### Адзіны габрэй

Полацкая суполка Партыі БНФ страціла аднаго з сваіх сяброў — Барыса Аронавіча Арава, якому было 63 гады. 17 верасьня яго пахавалі. Гэта быў адзіны габрэй з Полацку, які актыўна займаўся палітычнай дзейнасьцю пад беларускім нацыянальным сьцягам. Да мясцовых «франтаўцаў» Барыс Аронавіч далучыўся ў 1994 г. Паводле адукацыі — настаўнік, апошнім часам працаваў на гідрамэтэастанцыі. Зьяўляўся адным з самых адказных чальцоў суполкі. Сур’ёзна хварэў (дыябэт), але сябры ведалі яго як жыцьцялюба, аптыміста. Барыс Аронавіч належаў таксама да полацкай хасыдзкай суполкі, штосуботу езьдзіў у сынагогу, што на вуліцы Суворава.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Канкурэнцыя абвастраецца

Без прыватных маршрутак цяпер цяжка ўявіць вуліцы Воршы. Месьцічаў ды гасьцей гораду штодня абслугоўвае каля 200 машын, якія працуюць на 30 маршрутах. Для параўнаньня — дзяржаўны аўтапарк абслугоўвае маршрутаў у два разы менш. Як падлічана, маршруткі перавозяць да 40% пасажыраў пры адносна невялікіх цэнах (300—400 руб.). Такім чынам, яны складаюць моцную канкурэнцыю дзяржаўнаму транспарту. Праўда, у працы ўладальнікаў маршрутак ёсьць шмат недахопаў ды парушэньняў дзейнага заканадаўства. Як высьветліла апошняя праверка, 70% машын ня маюць касавых апаратаў, шмат якія кіроўцы не праходзяць рэгулярна мэдыцынскага, а машыны — тэхнічнага кантролю, асобныя працуюць безь ліцэнзіі, часам самачынна мяняюць пазначаныя маршруты на больш прыбытковыя ды г.д. Але пасажыры на гэтыя «дробязі» ўвагі не зьвяртаюць. Ім абы хутчэй ды таньней даехаць.

### Хабарнік з гарвыканкаму

На 8 гадоў зьняволеньня з канфіскацыяй маёмасьці асуджаны намесьнік старшыні Аршанскага гарвыканкаму Аляксандар Мельнікаў. За хабар у памеры 1000 даляраў ён зьбіраўся паспрыяць прыватнаму прадпрымальніку ў разьмяшчэньні рэклямы. Цяпер ужо былы намесьнік старшыні курыраваў у Воршы жыльлёва-камунальную гаспадарку ды будаўніцтва. Але пра факт хабарніцтва з боку не апошняга службоўца ўлады да суд над ім аршанцы зь мясцовых сродкаў інфармацыі не даведаліся.

### Халяўнае збожжа

Сёлета, як вядома, сабраны вялікі ўраджай збожжавых. «Засекі дзяржавы», мусіць, ужо не ўмяшчаюць усяго зерня. Бо чым можна патлумачыць тое, што нейкі кіроўца засыпаў ладным слоем збожжа больш за 20 мэтраў праезнай часткі вуліцы Менскай у Воршы ды не парупіўся яго сабраць. Ці трапіў ён пасьля гэтага на «Дажынкі» як пераможца сёлетняй «бітвы за ўраджай», невядома. Але хуценька па дармовае збожжа зьбегліся жыхары суседніх вуліц прыватнага сэктару з торбамі ды кошыкамі. Хапіла ўсім ахвотным.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

# Супраць расейцаў гулялася весялей

**Ад разгромнае паразы ў паўфінале Кубку Дэвіса беларусаў выратаваў ураган «Жанна». Ён спыніў гульню паміж Мардзі Фішам і 15-гадовым Андрэем Каратчэнем у першым сэце на карысьць амэрыканца.**

У 1997 г. зборная ЗША — 31-разовая ўладальніца «Срэбнае салатніцы» — апошні раз гуляла ў фінале. Таму гэтым разам капітан зборнай ЗША Патрык Макінрой, падобны да Джорджа Буша-малодшага, узяў на паўфінал наймацнейшых. У Чарлстан паехалі другая ракетка сьвету Эндзі Родзік, 29-я — Мардзі Фіш ды другі на сёньня дуэт у складзе братоў Боба і Майка Браянаў. Рызыкаваць, як рызыкнулі ў красавіку аргентынцы, выставіўшы трэці склад, Макінрою не хацелася.

А беларусы зьмірыліся з паражэньнем яшчэ тут, у Менску. Як у ваду глядзелі стваральнікі ролікаў на АНТ: «Ты чаго такі Мірны?», «Гуд бай, Амэрыка», «Аргентына—Ямайка — 5:0». Ня верылі ў посьпех беларусаў аўтары афіцыйнага сайту Кубку Дэвіса. Нават у першы дзень, калі яшчэ нічога ня ясна, асноўная ўвага надавалася ня толькі другому паўфіналу між Гішпаніяй і Францыяй, але й некаторым гульням плэй-оф.

Глядзеў я гульню Мірнага зь Фішам, і перад вачыма стаяў лютаўскі матч Мірнага з Сафіным. Куды падзеліся звышканцэнтрацыя Макса, зьвярыны пагляд, жаданьне пакласьці жыццё на корце. Нічога гэтага і блізка не было ў Чарлстане. Мажліва, прычына ў псыхалягічных праблемах? Іранізаваць на гэту тэму ня хочацца, таму даволі недарэчным выглядае анэкдот у аўторкаўскім нумары «Прессбола»: «У матчы з амэрыканцамі Пасол добрай волі ААН М.Мірны быў не сталоючы, не адмоўны, а быў ніякі». Макс і так зрабіў шмат для папулярызацыі беларускага тэнісу, каб цяпер на яго наракаць.

Яшчэ дзьве рэчы зьвярнулі ўвагу. Ніякі камэнтар на АНТ. Самалюбаваньне сваімі нясьмешнымі жартамі. І нараканьні літаральна на ўсё: сетку высока нацягнулі, мячыкі большыя аб'ёмам, судзьдзя пару разоў ня так сьвіснуў. Неадназначна дапускалася зьняважлівая характарыстыка супернікаў.

Парадавалі хіба два беларускія сьцягі на трыбунах. Праўда, яны былі заўважныя ў першы дзень, калі яшчэ цеплілася надзея. А потым растварыліся ў моры чырвона-зялёных. Чарлстан ляжыць далекавата ад цэнтраў беларускае эміграцыі. Галоўны рэдактар ньюёрскага «Беларуса» Марат Клакоцкі выказаў думку, што гэта нехта зь беларускіх студэнтаў, якія вучацца ў Штатах. «Яны рэдка цікавяцца арганізаваным беларускім жыцьцём, але вось на такіх спаборніцтвах паказваюць свой патрыятызм».

Чвэрцьфінал — наша мяжа, і параза ў паўфінале — справядлівая і заканамерна. Маючы толькі двух тэнісістаў у першай тысячы сусьветнага рэйтынгу, трапіць у фінал было б залішнім нахабствам. Супастаўная паводле колькасьці насельніцтва з намі Чэхія мае 40 тэнісістаў у першай тысячы, удвая меншая Славаччына — 15.

У наступным лютым беларусам сустракацца ў 1/8 фіналу зь пераможцамі плэй-офу мінулага ўік-энду. Гэта — Аўстралія, Аўстрыя, Расея, Румынія, Славаччына, Харватыя, Чэхія, Чылі. Супернік вызначыцца 30 верасьня, у дзень выхаду нумару «НН». Траўма Мірнага ці Ваўчкова — і прывітальне, кваліфікацыя, зь якой мы выкарасkваліся доўгія дзесяць гадоў. Скрыпко і Каратчэня яшчэ вельмі маладыя, каб скласьці канкурэнцыю Х'юіту ці Стэпанэку.

**Алег Раявец**



REUTERS

Маючы толькі двух тэнісістаў у першай тысячы сусьветнага рэйтынгу, трапіць у фінал было б залішнім нахабствам.

## Самыя пажарнікі на сьвеце



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**24—26 верасьня ў Менску прайшоў II чэмпіянат сьвету сярод пажарнікаў і ратавальнікаў. Бралі ўдзел спартоўцы 19 краін. Беларуская зборная ўзяла «золата» ў агульнакамандным заліку, а таксама каманднае «золата» ў пераадоленьні стомэтроўкі зь перашкодамі, «срэбра» ў баявым разгортваньні, «бронзу» ў пад'ёме па штурмавой лесьвіцы на 4-ы паверх. У асабістым першынстве героем стаў Зьміцер Шчаўлік: «срэбра» ў дваябор'і, «бронза» на стомэтроўцы зь перашкодамі й сусьветны рэкорд. Спаборніцтвы па сьне і гульні ў карты не праводзіліся.**

## Марцін Хекер: «Мы па-ранейшаму...»

Працяг са старонкі 2.

Я ўжо наведаў Берасьце, Нясьвіж, Менскае мора, Дудуткі... Вы можаце ганарыцца сваёй краінай, і я не разумею, чаму ваша дзяржава не імкнецца прыцягнуць у краіну турыстаў. Тыя чэргі, якія я ўбачыў на памежным пераходзе ў Берасьці, — такога не было нават у падзеленым Бэрліне!

**«НН»: Вы ўцяклі ў 14-гадовым узросьце з ГДР у ФРГ. Як Вам успамінаецца гэты момант і ці не нагадвае Вам сёньняшняя Беларусь былую савецкую зону?**

**МХ:** Я сапраўды зьехаў з Шварына ў Вэстфалію, паехаў па лепшыя адукацыйныя магчымасьці. Потым я часта езьдзіў за мяжу, вучыўся ў Аўстрыі, Францыі і ЗША. Я ніколі не шкадаваў аб тым, што ў 1956 г. пакінуў ГДР... Але сёньняшнюю Беларусь нельга параўнаць з той сталінісцкай ГДР. Тут нашмат лепш разьвітая грамадзянская супольнасьць.

**«НН»: Вы прадстаўляеце ў Беларусі сваю краіну ў той момант, калі яна таксама перажывае пэўныя цяжкасьці. Як гэта ўплывае на Вашу працу?**

**МХ:** Цяжкасьці заўсёды ёсьць выклікамі. Трэба шукаць новых шляхоў. Мы ня рады вынікам апошніх выбараў у ландтагі. Але гэта нагадвае мне, як я ў 1967 і 1968 годзе ў Каліфорніі ўвесь час мусіў тлумачыць, што значыла падтрымка праварадыкальнай НДП на тагачасных выбарах. Гэта не вяртаньне да фашызму, гэта проста паказвае прывабнасьць экстрэмальнага аўтарытарнага мысьленьня. Мы павінны шукаць новых шляхоў. У дзеючай дэмакратыі прыхільнікі экстрэмісцкіх палітычных пазіцый ня маюць шанцаў.

**Гутарыла Вераніка Дзядок**

У часе прэс-канфэрэнцыі, прысьвечанай нацыянальнаму сьвяту — Дню нямецкага адзінства, дыплямат спыніўся на апошняй заяве кіраўніцтва Эўразьвязу адносна ўвядзеньня візавых санкцый супраць беларускіх міністраў, якіх сусьветная супольнасьць падазрае ў датычнасьці да забойстваў: «Я хацеў бы ў зьвязку з гэтым згадаць, што нямецкія грамадзяне, маладыя сацыялісты, якія працавалі тут, у Беларусі, па лініі грамадзянскай супольнасьці, аднойчы былі выдвараны зь Беларусі. Фэдэральны канцлер Шродэр у свой час таксама быў актыўным маладым сацыялістам. І дэпартацыя ёсьць больш цяжкай зьявай, чым адмова ва ўезьдзе ў краіну. Так гэта разглядаецца на міжнародным узроўні».

У сваю чаргу ў гутарцы з карэспандэнткай «НН» пасол падкрэсьліў: «Падзеі апошняга часу паказваюць, што ў міжнародным маштабе вырасла гатоўнасьць да судовага перасьледаваньня за злачынствы супраць жыцьця чалавека».

# У Дагестане ўзяліся за паэтаў

**Дагестанскі пісьменьнік Адало Аліеў вярнуўся на радзіму з палітычнае эміграцыі, каб атрымаць восем год зьняволеньня ўмоўна.**

Судовае паседжаньне ў Махачкале цягнулася дзесяць дзён і скончылася 24 верасьня. Дагестанскага клясыка абвінавачвалі адразу па трох артыкулах Крымінальнага кодэксу Расеі: заклік да ўзброенага паўстаньня, удзел у незаконным узброеным фармаваньні і незаконнае набыцьцё, захоўваньне і нашэньне зброі. Што цікава, Аліеў сам вярнуўся з эміграцыі і добраахвотна зьявіўся ў Махачкалінскую пракуратуру.

Як паведаміў для «НН» сакратар Расейскага ПЭН-цэнтру Аляксандар Ткачэнка, пісьменьнік даслаў яму асабіста ліст з просьбай зрабіць усе заходы, каб зрабіць магчымым яго вяртаньне на Радзіму: «Аліеў і ўсе мы баяліся аднаго: у Махачкале яго маглі адразу ўзяць пад ахову ды пасадзіць у агульную камэру». Насамрэч прынялі Аліева даволі добра, у пракуратуры нават заплюшчылі вочы на тое, што пры вяртаньні ён нелегальна перайшоў мяжу. Да суду ён сядзеў пад хатнім арыштам.

Абвінаваўцы казалі пра тое, што Аліеў зьяўляўся галоўным ідэолягам стварэньня ісламскай рэспублікі ў Дагестане, а таксама нібы атрады Басаева і Хатаба ўваходзілі ў жніўні 1999 г. на тэрыторыю Дагестану з заклікамі Аліева. Гісторыя з падзеямі пяцігадовай даўнасьці досыць заблытаная. Былі сьведчаньні, што чачэнскія баевікі распаўсюджвалі ўлёткі ў Дагестане за подпісам Аліева. Аднак у той жа час паэт адмовіўся ўваходзіць у склад ураду Дагестану, сфармаванага чачэнцамі. Пасьля гэтых падзей дагестанцы неафіцыйна прыгаварылі Аліева да сьмяротнага пакараньня, і той быў змушаны знайсьці сабе прытулак у Турцыі.

Тое, што Аліеў быў набліжаны да чачэнскіх лідэраў, сакрэтам не зьяўлялася. Адно з абвінавачаньняў — незаконнае нашэньне зброі — якраз зьвязана з гэтым. Справа ў тым, што пісталет паэту падараваў Зелімхан Яндарбіеў за часамі свайго віцэ-прэзыдэнцтва ў Ічкерыі. Аднойчы (у 1998 г.) Аліеў ужо быў арыштаваны ў Махачкале за яго нашэньне.

Кажуць, што за гады выгнаньня Аліеў шмат чаго передумаў, пачаў адыходзіць ад палітычных спраў і засяродзіўся на літаратурнай дзейнасьці. Неаднойчы ён выказваўся наконт вяртаньня на Радзіму, а ўсе ягоныя апошнія кнігі былі прасякнутыя настальгічнымі ўспамінамі. І вось улетку 2004 г. ён наважыўся вярнуцца…

Відавочцы судовага пасяджэньня кажуць пра даволі дзіўную хаду працэсу. Кажуць, што ў першы дзень Аліеў цалкам адмаўляў сваю віну, а на другі дзень прызнаўся ва ўсіх злачынствах. Магчыма, тут паўплывалі намінкі судзьдзі на тое, што падобная справа пісьменьніка Магамэда Тагаева скончылася прысуджэньнем 10 год строгага рэжыму, ды яшчэ на Аліева не была заведзена справа аб незаконным пераходзе мяжы. Аліеву далі 8 год умоўна. Па абвяшчэньні прысуду клясык дагестанскай літаратуры зусім не выглядаў засмучаным і сказаў, што цалкам прысьвеціць сябе літаратуры.

«Рашэньне суду ўсіх задаволіла: суд пакараў, Аліеў атрымаў тое, што хацеў. Я асабіста вельмі рады, што ён дома (на чужыне яму было вой як несалодка!) і мае магчымасьць спакойна працаваць», — пракамэнтаваў прысуд Аляксандар Ткачэнка.

**Сяргей Будкін**



**Адало Аліеў** нар. у 1931 г. у аварскім паселішчы Ўрад (Дагестан). Пісьменьнік. Аўтар больш чым 20 кніг. Шырокую вядомасьць набыў у 1960-х дзякуючы вершам і песьням, адна зь якіх — «Засьпявай, Махамэдзе» — дагэтуль зьяўляецца неафіцыйным гімнам аварцаў. Рэдагаваў часопісы, газэты. Ачольваў першы дагестанскі грамадзка-палітычны рух «Джамаат», быў віцэ-прэзыдэнтам Канфэдэрацыі народаў Паўночнага Каўказу і намесьнікам Шаміля Басаева ў Кангрэсе народаў Чачэніі і Дагестану. Апошнія некалькі год хаваўся ў Турцыі.

# Клюб паэтаў

**Сваё месца ў дзяржаўных часопісах знайшла рэанімаваная савецкая паэзія. Мае сваю нішу эстрадная паэзія. А тое, што раней называлася інтэлектуальнай, авангарднай ці проста паэзіяй, свайго месца ня мае. Праўдзівей, ня мела да 28 верасьня, пакуль Ігар Бабкоў не адкрыў «Галерэю Б.» Як зазначыў сам паэт, новае ўтварэньне ня ёсьць ані літаб'яднаньнем («зборам літаратараў, якія рассылаюць свае вершы ў розныя выданьні»), ані літаратурнай суполкай («групай пісьменьнікаў, якія аб'ядналіся ў невялікую зграю, каб разам ісьці па літаратурным жыцьці»). «Гэта проста месца, дзе ёсьць паэзія. Калі хочаце — адна з галерэй Борхесавай бібліятэкі», — патлумачыў самы гермэтычны паэт «Тутэйшых». Літару «Б» было прапанавана тлумачыць як каму хочацца: Беларусь, бібліятэка, Борхес... Уваходны квіток за права наведваньня «Галерэі» — верш: кожны наведнік мусіў прачытаць свой ці чужы твор і пакінуць яго.**

**Верш Івана Франка (арыгінал і свой пераклад) падарыла «Галерэі» Галіна Дубянецкая, баляду Томаса Гарды — Мікола Раманоўскі. На першым сходзе «Галерэі Б.» былі заўважаныя таксама Людка Сільнова й Марыя Барадзіна. Завяршыў вечарыну Андрэй Хадановіч, які выканаў баляды бітніка Леанарда Коэна ў сваім перакладзе. За што й атрымаў ружу.**

**АВ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На фота: Ігар Бабкоў на «Галерэі Б.»




# Беларусы на кірмашы ў Гётэбаргу



З 23 да 26 жніўня ў швэдзкім Гётэбаргу адбыўся юбілейны 20-ы сусьветны кніжны кірмаш, які наведала 209 000 гасьцей. Сёлета ў фокусе падзей была брытанская літаратура. Беларусь у чарговы раз пры дапамозе Швэдзкага інстытуту прадстаўляла грамадзкая арганізацыя «Vitryssland» на чале з Марыяй Сёдэрбэрг. Наведнікі маглі агледзець апошнія навінкі беларускай літаратуры, пазнаёміцца з часопісамі «Arche» і «Дзеяслоў». Швэдзкая паэтка беларускага паходжаньня Інга-Ліна Ліндквіст чытала нізку новых вершаў «Беларусь у маім сэрцы». Ляўрэатка эўрапейскага конкурсу паэзіі ў Славеніі Вальжына Морт чытала ўласныя вершы і дала лекцыю, прысьвечаную творчасьці маладых беларускіх паэтаў, пад назвай «Як карабель зь цёмнай гавані». На пытаньні, датычныя сучаснай беларускай літаратуры, адказвала паэтка Лана Радзівонава.

Лектар швэдзкай мовы ў Менску Мортэн Франкбю падзяліўся сваімі ўражаньнямі ад жыцьця і працы ў Беларусі. Акушэрка і грамадзкая дзяячка Оса Гальбэрг расказала аб працы беларускіх радзільных дамоў. Швэдзкія паэты Цыла Наўман, Арнэ Ёнсан, Ёван Ёбэрг чыталі вершы беларускіх паэтаў і апавядалі пра сваё падарожжа праз Беларусь. Гісторыкі Андрэй Катлярчук і Мац Ларсан далі тры лекцыі, прысьвечаныя дзейнасьці вікінгаў на землях старажытнай Беларусі. Кіраўнік грамадзкай арганізацыі «Roks» Ангела Бэсанг прачытала лекцыю пра становішча з правамі беларускіх кабет.

Журналісты Тобіяс Ліндваль і Мікалай Паседка падзяліліся ўласнымі меркаваньнямі наконт палітычнага становішча ў Беларусі. Аналітык найбуйнейшай газэты «Dagens Nyheter» Дыса Гостад абмяркоўвала будучыя выбары ў беларускі парлямэнт.

Арганізатары кірмашу адзначылі рост зацікаўленасьці публікі да беларускіх сэмінараў. Наступны кірмаш будзе прысвечаны нашай суседцы Літве і літоўскай літаратуры.

**Андрэй Катлярчук, Гётэбарг—Стакгольм**

КІНО

# Каляровыя сны Дунечкі

**Працяг са старонкі 2.**

Пасьля выхаду «Дунечкі» можна падвесьці вынікі кінагоду працы беларускіх кінафабрык. Дарэчы, пра фабрычную творчасьць можна казаць вельмі ўмоўна, бо зроблены толькі тры ігравыя карціны — але ўсе яны надзвычай паказальныя.

Рэжысэрскі дэбют Пятра Крывастаненкі «Яшчэ пра вайну» — бесканфліктны фільм з аголенымі гераінямі і хрыплымі ўздыхамі, у якім таленавітым акторам (Анатолю Кату й Аляксандру Маўчанаву) адведзены ролі нікчэмных марыянэтак.

У стварэньні непрыстойнасьці, закамуфляванай пад вайсковае кіно, стужцы Крывастаненкі ніяк не саступае й кароткамэтражны фільм «Страх», створаны Аленай Трафіменкай у Беларускім відэацэнтры.

Нельга не вітаць спробы Беларускага відэацэнтру перайсьці да сталай вытворчасьці ігравых стужак, але гэта адзіны станоўчы момант «Страху». Карціна выпадае з-пад усіх характарыстык. На шкале ад шэдэўру да трэшу ёй складана дый немагчыма знайсьці месца. Гэта аўтарска-каматознае кіно, перакладзенае на мову «Баявых кіназборнікаў» і аматарскага відэа.

Хаця апэратарам карціны пазначана Ларыса Кабернік, яе руку нічога не выдае. А асобныя выкрунтасныя ракурсы, якія карціне сэнсу й эмоцый не дадаюць, — гэта, хутчэй, рэжысэрская задума.

Гісторыя пра тое, як маці выдала сынапартызана паліцаям, а сумленны паліцай застрэліў калегу-нягодніка, некаторымі разглядалася ледзьве не як чынавенскі адказ на «Акупацыю» Кудзіненкі, але параўноўваць тут і блізка нельга. Хаця ў фільме Трафіменкі таксама здымалася Алена Сідарава, як і ў «Акупацыі», «Страх» знаходзіцца па-за межамі эстэтычных ацэнак. А на тле сцэнкі зьбіцьця хлопчыка і гвалтаваньня дзяўчынкі вершнік «Дзеці ў склепе гулялі ў гестапа» падаецца верхам жыцьцёвай праўды.

Гэтае кіно на псэўдапартызанскую тэму напросту ня мае дачыненьня да кінамастацтва.

Тры ігравыя стужкі галоўных кінафабрык Беларусі 2004 году — гэта каляніяльнае кіно, адлучанае і ад беларускае зямлі, і ад неба.

**Андрэй Расінскі**

## Кінастужка пра Лукашэнку

Выйшаў на CD дакумэнтальны фільм «Рэквіем па незалежнасьці» ананімнага аўтара, прысьвечаны вынікам 10 гадоў кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі. На кадры кіна- і тэлехронікі накладзены аўтарскі тэкст і песьні беларускіх сьпевакоў. «Сьцеражыцеся маны лжэпракракаў», — засьцерагаюць аўтары гэтай тэхнічна простае стужкі.

## Кінахіт пра Гітлера

Лідэрам нямецкага кінапракату стаў фільм «Крах: Гітлер і канец Трэцяга райху» («Der Untergang»): за два першыя дні пракату кіно паглядзелі амаль 500 тыс. гледачоў. Кінастужка, зьнятая паводле аднайменнага дакумэнтальнага раману гісторыка Яахіма Фэста і мэмуараў нядаўна памерлай сакратаркі Гітлера Траўдль Юнге, апавядае пра апошнія 12 дзён жыцьця фюрэра. Фурор у Нямеччыне выклікала тое, што Гітлер паказаны звычайным чалавекам, а не дзікуном-параноікам: ён любіць шакалядны торт і пакутуе праз нязбытнасьць мараў.

## Беларускі катэхізыс

Неўзабаве мае зьявіцца малы каталіцкі Катэхізыс па-беларуску. Рашэньне пра гэтае выданьне прынялі ўдзельнікі Канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі.

## Менскае сярэднявечча

Першы міжнародны фэст сярэднявечнай культуры й традыцый «Беларускае сярэднявечча» прайшоў у Менску. Удзел у ім узялі сябры рыцарскіх клюбаў зь Менску, Гомелю, Магілёва, Віцебску, Берасьця, Мазыра, іншых гарадоў Беларусі, а таксама госьці з Кіева й Масквы. Прызам для пераможцы рыцарскага турніру стала сапраўдная залатая карона.

## «Залатое жазло» для Мрожака

Славамір Мрожак атрымаў «Залатое жазло» — узнагароду Фонду польскай культуры за ўвесь творчы даробак (сярод папярэдніх ляўрэатаў — Ежы Гедройц, Раман Паланскі, Станіслаў Лем). Цырымонія ўзнагароджваньня прайшла ў Станіславаўскім тэатры ў Варшаве. Дракаваца Мрожак пачаў у 1950 г. як рэпартэр, але эпоха адлігі нарадзіла Мрожака — сатырыка й абсурдыста. Апошнія 8 гадоў па вяртаньні з Мэксікі пісьменьнік жыве ў Кракаве, мала зьяўляецца на публіцы.

## Памерла Саган

У Францыі ад сардэчнай недастатковасьці й праблем з дыхальнай сыстэмай памерла 69-гадовая пісьменьніца Франсуаза Саган (праўдзівае прозьвішча Куарэ). Вядомасьць Саган атрымала ў 18 гадоў, калі за 6 тыдняў напісала першы раман «Здароў, смутак» (пазьней кніга была перакладзеная на 30 моваў). Пісьменьніца стала сымбалем бунтоўнага францускага пакаленьня 50-х —60-х — мела бурнае асабістае жыцьцё і не адмаўлялася ад выкарыстаньня алькаголю й наркотыкаў. У 1957 г. трапіла ў сур'ёзную аўтакатастрофу, бо любіла хутка ездзіць. У 1995 г. яе прысудзілі да аднаго году турмы ўмоўна за ўжываньне какаіну. У 2002 г. Саган ізноў атрымала судовы прысуд у адзін год турэмнага зьняволеньня за ўхіленьне ад уплаты падаткаў.

## Фэстываль дэтэктываў

У Нямеччыне ў другі раз адбываецца фэстываль дэтэктыўнай літаратуры «Сьмерць на сьветлым шляху». На сьвята прыехалі больш за 60 пісьменьнікаў-дэтэктыўшчыкаў з усяго сьвету. Адкрылі сьвята акторка Сабіна Постэль (выканаўца ролі камісара паліцыі ў папулярным у Нямеччыне тэлесэрыяле «Месца злачынства») і кіеўскі пісьменьнік Андрэй Куркоў (аўтар дэтэктываў пра пінгвіна Мішу). Фэстываль будзе доўжыцца да 13 лістапада ў 10 гарадох паміж Дортмундам і Ліпштатам — так званым рэгіёне «сьветлага шляху», вядомым яшчэ з часоў братоў Грым як месца жахлівых і загадкавых злачынстваў. Месцы правядзеньня фэстывальных імпрэзаў — старадаўнія замкі, цыркі, заапаркі, разьніцы. Для гасьцей падрыхтавана адмысловыя праграмы — «Сьмерць у намёце», «Сьмерць для гурманаў».

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl, Catolik.by**

## Канцэрт Касі Камоцкай перанесены

Анансаваны на 7 кастрычніка выступ у Доме літаратара Касі Камоцкай і Славы Кораня перанесены на 30 кастрычніка.

# Літаратурны працэс

## Людзей пасадзілі за верш, якога не наважыліся агучыць ні пракурор, ні судзьдзя

Праўда, калі быць дакладным, прагучалі дзьве цытаты — па адным радку — на другі дзень працэсу, але гэта была падвойная цытата: пракурор зачытаў урыўкі з допытаў у КДБ. Зачытаў, назваўшы прозьвішча маёра, які дапытваў Аляксандра Васільева, намесьніка старшыні страйкаму прадпрымальнікаў Валер'я Леванеўскага, якога падчас працэсу ўвесь час трымалі ў клетцы, як небясьпечнага злачынцу. І яшчэ ў другім цытаваным радку было слова на нашай другой дзяржаўнай мове, зь якога пракурор прачытаў толькі першыя літары. Зрэшты, у самім вершы так і было надрукавана.

Валер'я Леванеўскага і Аляксандра Васільева пакаралі двума гадамі зьняволеньня кожнага за вершаваную ўлётку, якая нібыта публічна абразіла прэзыдэнта Лукашэнку. Хаця да самага канца так і ня высьветлілася, ці чытаў ён сам вершык. Ну, але затое чыталі сьледчыя КДБ і пракуратуры, проста Міліцыянты і амапаўцы, судзьдзі і тысячы іншых гарадзенцаў. Вось за гэта і крымінальную справу распачалі супраць Леванеўскага і Васільева, што яны выкарысталі вершык у агітацыйных мэтах. Праўда, не было ў ім ні прозьвішча, ні імя, ні афіцыйнай пасады абражанай асобы. Пра гэта дзясяткі разоў гаварылася ў сьледчых кабінэтах і на судзе. Але ў абвінаваўчага боку былі «неабвержныя доказы» — паказаньні сьведкаў, палова зь якіх, як звычайна бывае ў беларускіх судах, самі міліцыянты, якія хоць і невялікія знаўцы паэзіі, затое ў ідэалягічным сэнсе маюць неабходную пільнасьць.

Паводле суду, Леванеўскі і Васільеў вырабілі двухбаковую ўлётку: здымак Леванеўскага і заклік прыйсьці на першатравеньскі мітынг з аднаго боку, сатырычны вершык — з другога. У выніку начальства пакінула мітынг ні з чым, сьвяточна-пампэзную імпрэзу прадпрымальнікі ператварылі ў мітынг пратэсту, сказалі рашучае «Не!» трэцяму тэрміну і запатрабавалі адстаўкі Лукашэнкі. Акцыя выйшла досыць гучная. Асабіста Леванеўскага перад мітынгам арыштавалі, каб не прамаўляў.

### З паказаньняў сьведкаў

**Адвакат**: Вы лічыце, што плякаты з выявай прэзыдэнта і словам «далоў» абражаюць гонар і годнасьць?

**Міліцыянт-сьведка**: Так, лічу.

Затым адвакат пацікавіўся, ці праўда, што ў пракуратуры міліцыянт сказаў, што бачыў на мітынгу Васільева. А цяпер гаворыць, што ня ведае Васільева.

**Адвакат**: Дык значыцца, вашы паказаньні запісаны няслушна?

**Міліцыянт**: Я ня ведаю.

**Судзьдзя**: Дык якія паказаньні браць за аснову — ранейшыя ці сёньняшнія?

**Міліцыянт**: Напэўна, тыя…

Гэты сьведка быў адным з «каронных», бо дапыталі толькі невялікую частку сьведкаў, пасьля чаго пракурор сказаў, што яму для абвінавачаньня цалкам хапае пачутых паказаньняў. І хаця абвінавачаныя і адвакат патрабавалі выслухаць усіх астатніх, пракурор застаўся няўмольным, як само беларускае правасудзьдзе.

**Пракурор**: З тэксту вы зразумелі, на адрас каго накіраваны яго словы?

**Сьведка-пэнсіянэрка**: Нашага прэзыдэнта.

**Пракурор**: У адрас прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. А зьмест — нармальны?

**Сьведка**: Там пра жабрацтва — гэта праўда: я і мае знаёмыя жабракі, а маты ў вершы мне не спадабаліся.

**Пракурор**: Вы добраахвотна аддалі ўлётку міліцыянту?

**Сьведка**: Так, нават не паглядзела пагоны. А цяпер думаю: навошта я яго ўпусьціла?

**Адвакат**: На падставе чаго вы вырашылі, што гэта да прэзыдэнта мае дачыненьне, — на падставе якіх фраз, выразаў?

**Сьведка**: Там пра камунальныя паслугі напісана. З майго пункту гледжаньня — хто ў нас самы галоўны ў нашым жыцьці? А я ніхто.

**Адвакат**: Ці была там указана пасада?

**Сьведка**: Ня памятаю, не. Не зацыклівалася на дакладнасьці такой. Можа, я і памыляюся, у мяне сярэдняя адукацыя. Ня ведаю, кожнаму зразумела. А можа, у мяне мазгі тупаватыя?

**Васільеў**: Вы ня лічыце сябе спэцыялістам у галіне літаратуры, паэзіі? Ці чыталі Пушкіна, байкі Крылова?

**Сьведка**: У школе.

**Васільеў**: На падставе вашых паказаньняў мяне могуць засудзіць.

**Судзьдзя**: У нас ня ўрок расейскай мовы і літаратуры.

**Пракурор**: На чый адрас накіраваны вершы ва ўлётцы?

**Сьведка-мужчына**: На адрас прэзыдэнта.

**Пракурор**: З чаго зрабілі такую высновy?

**Сьведка**: Дзіцяці было зразумела.

**Пракурор**: Што не прэзыдэнт афрыканскай рэспублікі.

**Сьведка**: Вершы нармальныя, толькі пару слоў бязь літараў напісана.

**Пракурор**: Гэты верш каб на ваш адрас — абразьліва было б?

**Сьведка**: Ня ведаю, я невялікі чалавек, на мой адрас такіх вершаў ніхто пісаць ня будзе.

**Пракурор**: Шматкроп'і абражаюць гонар і годнасьць?

**Сьведка**: Думаю, што так.

**Адвакат**: А абвінавачаньні былі на адрас прэзыдэнта?

**Сьведка**: Не, проста абразьлівыя словы, усяго толькі.

**Адвакат**: А ў зьдзяйсьненьні злачынства не абвінавачвае верш?

**Сьведка**: Толькі кепскія словы на яго адрас.

**Леванеўскі**: Адкажыце — у чым абраза: гаворка ідзе аб прэзыдэнту РБ таму, што…

**Сьведка**: Я меркаваць не магу.

**Судзьдзя**: Маеце цяжкасьці з адказам?

**Сьведка**: Маю цяжкасьці.

**Пракурор**: Вось тэкст.

**Васільеў**: У чым абраза прэзыдэнта?

**Судзьдзя**: Які з трох слупкоў абражае?

**Сьведка**: Першая частка — найбольш матных слоў.

**Васільеў**: Яму адрасавана?

**Сьведка**: Хутчэй за ўсё яму.

**Васільеў**: Значыцца, прэзыдэнт «надзеў патэльню»?

**Судзьдзя**: Ну ён жа сказаў, што так.

Вось такі нязмушаны дыялёг вялі ўдзельнікі працэсу. Дарэчы, сьведкі зрабілі ўражаньне прыемных добрых беларускіх людзей, зьнявечаных ад выкананьня неўласьцівай ім ролі. Пракурор — вельмі малады, сымпатычны, з інтэлігентным, крыху нэрвовым тварам. Адно казалі, што «яго падставілі»: старэйшыя калегі чамусьці ня выказалі жаданьня трапіць абвінаваўцамі на такі літаратурны працэс. Мабыць, не адчувалі сябе дастаткова моцнымі ў паэзіі.

Судзьдзя — увогуле выдатна вядомая ўсім мясцовым дэмакратам асоба, у іх зь Леванеўскім склаліся амаль што цёплыя адносіны, ён нават дазволіў некалькі саступак. Леванеўскі, напрыклад, патрабаваў у клетку стол, паколькі пракурор сядзеў за сталом і зачытваў розныя дакумэнты, а Леванеўскі мусіў усе паперы раскладаць на лаве і на каленках. Судзьдзя паабяцаў. Праўда, даў толькі крэсла, у якім сядушка адпадала. Але гэта ўсё ж лепш, чым нічога.

Абарона і абвінавачаныя пратэставалі, праўда, што вышэйназваных сьведкаў выкарыстоўваюць у судзе ў якасьці экспэртаў-лінгвістаў, але пракурор і судзьдзя не надалі вялікага значэньня гэтым пратэстам. Праўда ў тым, што не было экспэртных высноў, такіх патрэбных абвінавачаньню. Спэцыялісты хто зусім адмовіўся ад гэткай непрывабнай ролі, хто напісаў штосьь нязэўна-нэўтральнае. І тады абвінавачаньне выкарыстала «голас народу».

Другі істотны момант. Хрыстом-богам абвінавачваныя прасілі паведаміць — за што іх судзяць, канкрэтызаваць — за якія сказы, фразы? Абарона падтрымлівала гэтае справядлівае патрабаваньне. Ажно пракурор ня вытрымаў і сказаў, што канкрэтыка будзе «на дэсэрт» — пад заслону працэсу. І выканаў сваё абяцаньне ў перадапошні дзень. Карацей, судзілі Леванеўскага і Васільева за тое, што ва ўлётцы было сказана, што «хтосьці» езьдзіць катацца на лыжах у Аўстрыю «дзеля ўласнага задавальненьня». А паколькі словы «хтосьці» было напісана вялікімі літарамі, то, значыць, гэта маецца на ўвазе сам прэзыдэнт. Па-другое, паводле слоў пракурора, у вершы гаворыцца пра гульню ў хакей і тэніс, што «зьяўляецца характэрнымі ўласьцівасьцямі» вышэйназванай пэрсоны.

Карацей, трэба даць ім па тры гады за верш і саму ўлётку — абвінаваўца быў няўмольны. Судзьдзя падумаў-падумаў і даў па два. Усё ж Леванеўскі і Васільеў — досыць сымпатычныя людзі, і судзьдзя не хацеў быць да іх занадта жорсткім.

Што яшчэ дадаць? Напачатку сьледчыя вельмі шукалі аўтара вершыка, нават да спэцыялістаў зьвярталіся. Але ўрэшце суд прызнаў, што напісаў яго рабочы Мікалай, якога знайсьці не ўдалося. Паводле Васільева, то была цэлая паэма, старонак на трыццаць, «крык народнай душы». Ён таксама гаварыў, што ў КДБ паэму вывучалі «ледзьве не пад мікраскопам». Ужо ўсе начыталіся! І каб хто аўтарытэтна сказаў: вершык — абы-што, прымітыўныя куплеты. Дык не: падыход быў як да высокай паэзіі. Мабыць, трымалі ў галаве хрэстаматыйны школьны прыклад пра Пушкіна і Мікалая І.

Або пра Мандэльштама і Кобу.

Працэс гэты мае літаратурную афарбоўку яшчэ й дзякуючы апошняму слову Валер'я Леванеўскага. Гэта была ў пэўнай ступені літаратурная прамова. Ён пачаў з таго, што, маўляў, існуе яшчэ шмат крамольных вершаў. Напрыклад, байкі Крылова, «Тараканішча» Чукоўскага. Дарэчы, Аляксандар Васільеў некалькі дзён прыходзіў на суд менавіта з гэтай кніжкай — пра тараканішча...

**Сяргей Максімовіч, Горадня**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Судзілі Леванеўскага** (зьверху) **і Васільева** (зьнізу) **за тое, што ва ўлётцы было сказана, што «хтосьці» езьдзіць катацца на лыжах у Аўстрыю «дзеля ўласнага задавальненьня». А паколькі слова «хтосьці» было напісана вялікімі літарамі, то, значыць, гэта маецца на ўвазе сам прэзыдэнт. Па-другое, паводле слоў пракурора, у вершы гаворыцца пра гульню ў хакей і тэніс, што «зьяўляецца характэрнымі ўласьцівасьцямі» вышэйназванай пэрсоны.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# «Занадта разумны для міліцыі»

**Сябар «Маладога фронту» з Жодзіна Сяргей Савіч быў выгнаны з Акадэміі МУС за палітыку, але аднавіў сваё навучаньне ў Міжнародным гуманітарна-эканамічным інстытуце.**

Сяргей Савіч быў адлічаны з Акадэміі МУС за ўдзел у турпаходзе моладзі супраць расейскіх вайсковых баз пад Ганцавічамі летам гэтага году. Кіраўніцтва факультэту права прапанавала яму напісаць заяву аб адлічэньні па ўласным жаданьні, чым Сяргей і скарыстаўся. У нефармальнай размове зь Сяргеем кіраўніцтва факультэту сказала, што ў Акадэміі МУС ня месца чалавеку, які займаецца палітыкай.

Праблемы з ВНУ, аднак, не дазволілі Сяргею сабраць подпісы для рэгістрацыі кандыдатам у гарсавет гораду Жодзіна (17 кастрычніка там адбудуцца ня толькі парлямэнцкія выбары, але і давыбары ў мясцовы Савет). Кандыдатамі ў мясцовыя дэпутаты зарэгістраваны тры іншыя прыхільнікі незарэгістраванага «Маладога фронту» — Павал Красоўскі, Яўген Валкавец і Віталь Пятроў.

Сяргей Савіч нават задаволены сваім звальненьнем з Акадэміі МУС: у недзяржаўным унівэрсытэце ён адчувае сябе больш вольна, няма такога жорсткага рэжыму, як у акадэміі. У будучыні ён пляную займацца гаспадарчым правам.

**Вераніка Дзядок**

# Легенды мокрай восені

**Мода крыўляе восень і лезе наперад бацькі ў пекла, аддаючы перавагу глыбокім зямным колерам ужо глыбокай восені — усёй палітры колераў сухога лісьця, колеру ягад рабін, журавін і апошніх маркотных і недаўгавечных кветак.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тэда Лі

Цётка Восень удалася шчодра грыбная і няўстойліва капрызная сваімі надвор'ямі. Яна зьдзівіла нізкімі тэмпэратурамі, і нават самыя заўзятыя гарадзкія моднікі мусілі на час абуць цёплыя боты, актуальныя ў мінулы сэзон, ды хутчэй ляцець па крамах у пошуках сусьветных восеньскіх навінак. У астатняй палове народу «абклала» горлы і «заклала» насы, і яна палезла на бабуліны антрэсолі шукаць старых махеравых нітак, каб за два прысесты сплесьці сабе новы шалік незвычайнай вязкі.

Зноў на поўную моц загрымелі начныя клюбы, і будзёнными ранiцамі гарадзкі транспарт напоўніўся змэнчанымі студэнтамі са зблытанымі прычоскамі і фіялетавымі прасторамі пад вачамі. Па вуліцах зноў рассыпаліся пярэстыя натоўпы, несучы набітыя прадуктамі цэляфанавыя пакеты, рулоны шпалераў і сьвежых эскізаў, несучы свае нэрвы і клопаты.

Тэлевізар сабраў вакол сябе краіну, так і пакінуўшы масу пытаньняў пытаньнямі без адказаў. Гэтак жа, як трагедыі ў Расеі наш народ перажываў усёй душой, ён цалкам апатычна ўспрыняў пэрспэктыву найбліжэйшых палітычных падзеяў у Беларусі. Ніхто тут больш ні ў што верыць ня хоча. Падчас збору подпісаў за кандыдатаў усе шчасьліва разьехаліся сваімі маршрутамі, а на пытаньне, што можа адбыцца на палітычнай арэне, кожны другі скажа: «А мне па барабану». Цёткі з выбарчых участкаў, праз тэлефон высьвятляючы імёны-прозьвішчы выбарцаў, размаўляюць у такой манеры, як быццам прапаноўваюць набыць набор тэфлёнавых патэльняў. Складваецца ўражаньне, што лёс беларускіх алімпійцаў у Афінах і па вяртаньні адтуль расхвалявалі нашых людзей больш, чым лёс і надзеі самой Беларусі.

Чарговыя расчараваныя ў жыцьці тут (ці ў жыцьці ў прынцыпе) набываюць чарговыя «кветкі ў адзін бок», каб паступіць на службу легіянэрамі і пяцьцю гадамі службы зарабіць францускае грамадзянства. Іншыя, не настолькі рашучыя, каб зьехаць, але якім не стае нейкае жыцьцядайнае *інтрыгі*, за кубкам кавы раптам трагічна прамаўляюць: «Да таго ж, як ты магла б здагадацца, у мяне *праслухоўваюць тэлефон*...» І ім, вядома, ня вельмі падабаецца, калі ты напаўіранічна адказваеш цытатай з Саган: «Пра справы падобныя не раздумвай — інакш звар'яцееш».

Новыя беларускія музычныя героі, нават калі яны недзе ёсьць, сядзяць па сваіх рэпэтыцыйных «кропках» і пакуль не сьпяшаюцца паказвацца. Гэта прадэманстравала

> Мужчынам восеньню рэкамэндуюць апранаць аднатонныя кашулі чыстых дзёрзкіх колераў (колер крыві — самае тое) з «камечанага» матэрыялу пад строгія клясычныя строі.

і ўся пасрэдная «экспазыцыя», выстаўленая на «Басовішчы», і той факт, што на плякатах у горадзе паранейшаму знаёмыя і ўжо малацікавыя твары і назвы. Таму прыходзіцца, як і раней, слухаць замежнае. У гэтым сэзоне каралюе клясычны поп з экспэрымэнтальнымі адхіленьнямі (пойдзе новы альбом Mike & «The Mechanics» «Rewired») і круты хард-кор, перамяшаны зь лёгкім хаўсам і брутальнымі элемэнтамі хіп-хопу (напрыклад, новы альбом «Prodigy» «Always Outnumbered Never Outgunned», які яны захацелі пазбавіцца статусу папулярнага гурту і «перастаць патакаць масавым густам»).

Пакуль ня стала вельмі халодна, уся Эўропа запрашаецца на гарадзкія альтэрнатыўныя фэстывалі і проста канцэрты на вуліцах. Праўда, калі на стадыёны і эстрады ў парках да нашых заходніх суседзяў прыяжджаюць такія гурты, як «Liquido», «The Rasmus», «Haiducii», «The Hobos», «Tarantinos» і «Bomfunk MC's», у сябе мы можам паглядзець толькі расейскіх зорак, як след «разагрэтых» мясцовымі камандамі (за выключэньнем мясцовых беларускамоўных і, як факт, ня вельмі своечасовых, улічваючы выбары, — гэтых гоняць у карак і забараняюць паказвацца). Прычым зь нікому не вядомых прычынаў у той час, як да суседзяў без праблем даяжджае Сара Брайтман, мы так і не дачакваемся абяцаных гуртоў «Умка и Броневичок» ды «Я и друг мой грузовик», дзеля якіх і набывалі дарагі квіток.

У модзе галоўная дылема сёлетняй восені — як маладзевую адвязанасьць спалучаць з клясычнай геамэтрыяй і ўласнымі стылёвымі высновамі? Для вырашэньня гэтага няпростага пытаньня часопісы дыктуюць свае варыянты камбінаваньня вопраткі: на клясычныя вязаныя сукенкі з папярочнымі лініямі на грудзях і «горлам» (такі гольф, які закрывае дупу і бёдры) павязваць дзягу з моднай круглай мэталёвай спражкай і насіць такую сукенку з маленькай кайстрачкай з бліскучага матэрыялу. Разам з геамэтрычна слушнымі швэдрамі, невысокае «горла» якіх стаіць паралельна плячам, прапанавана адзяваць просьценькія брыджыкі такога ж колеру, а абуваць — высокія скураныя боты каўбойскага стылю. Строгія майкі ў палоску з рукавамі можна выдатна «разбавіць» караценькай какетлівай дэрмацінавай спаднічкай і напаўспартовымі боцікамі без абцасаў і на матузках. Карацей, усё моднае і дарослае, што дазваляе адчувацца кабетай, спалучаць з маладзевым і вясёлым, што не дазваляе забывацца на сябе. Між іншым, мужчынам гэтай восеньню рэкамэндуюць насіць аднатонныя кашулі чыстых дзёрзкіх колераў (колер крыві — самае *тое*) з «камечанага» матэрыялу, адзяваючы іх пад строгія клясычныя строі. У такіх кашулях я ўжо заўважала некалькіх сваіх сябрукоў-моднікаў, якія абураліся, чаму ж я не пішчу ад захапленьня.

Мода крыўляе восень і *лезе наперад бацькі ў пекла*, аддаючы перавагу глыбокім зямным колерам ужо глыбокай восені — усёй палітры колераў сухога лісьця, колеру ягад рабін, журавін і апошніх маркотных і недаўгавечных кветак. З модных калекцый пазьнікалі яркія нэонавыя, непрыстойна простыя і парнаграфічна адкрытыя колеры. Нарэшце дзеўкі перастануць задаволена дэманстраваць няўдалыя спалучэньні кіслотных колераў на танных тканінах, набытых на кірмашы.

Найбольш прыдатныя водары гэтай восеньню: для яе — «Eau de Krizia», «Gucci Envy Me», «Mont-Blanc Femme Individuelle» і «Genny Caress»; для яго — «Yves Saint Laurent M7 Fresh» і «Salvatore Ferragamo Incanto», для пары — жаночы і мужчынскі варыянты «Aigner in Leather Black». Гэта што датычыцца дарагой глямурнай моды.

У нашым простым і шчырым сьвеце, дзе пакуль што кнігі чытаюць ахвотней, чым стракатыя часопісы, насамрэч усё роўна, як апранацца, чым пахнуць і што слухаць у час, калі пачынаецца сэзон дэманстрацыі парасонаў. Галоўнае — не забыць улавіць тую гаркавую і маркотную слодыч восеньскіх настрояў, зь якой лёгка ступаць па зямлі, накрытай легендамі і прызабытымі мроямі. І чытаць Караткевіча.

# Настальгія па 90-х

**Канцэрт Зьмітра Яўтуховіча 23 верасьня ў менскім Доме літаратара адбываўся пры паўпустой залі. Імпрэзе, без сумневу, бракавала рэклямы — афішаў у горадзе. Усё ж такі 11 гадоў — пэрыяд дастатковы, каб забыцца на колішнюю славутасьць. Зрэшты, тыя, хто на канцэрт прыйшоў, наўрад ці шкадавалі: Зьміцер паказаў, што ён застаецца ня толькі выдатным эстрадным кампазытарам, але й неабыякім шоў-мэнам.**

Для першай песьні ён выйшаў на сцэну ў камізэльцы, пашытай з маленькіх амэрыканскіх сьцяжкоў. Зьміцер танчыў зь вядучай полечку і танга, зьяўляўся на сцэне ў масцы, дэманстратыўна разуваўся, надзяваў то пілётку, то вялікую стракатую клоўнскую кепку…

Сузор'е сьпевакоў, якія выконвалі песьні Яўтуховіча, — Іна Афанасьева, Андрэй Хлястоў, Джымі Нэльсан, Аляксандар Заўгародні — дапаўнялася салідным пералікам прысутных аўтараў вершаў: Уладзімер Някляеў, Алесь Бадак, Віктар Шніп. Сярод запрошаных вылучаўся Леанід Пранчак: песьні на яго вершы занялі палову канцэрту. Некаторыя зь іх («Калыханка», «Віцебскі дождж», «Даставай, Язэп, гармонік») выконваліся двойчы — рознымі выканаўцамі.

Канцэрт атрымаўся настальгічны. І ня толькі таму, што песьні былі пераважна старыя — пачатку 90-х. Самі сьпевакі й паэты згадвалі тую пару («эпоху Яўтуховіча», паводле чыйгосьці трапнага выразу) са скрухай: «Яўтуховіч паказаў, што можа быць добрая беларускамоўная дзіцячая песьня, маладзевая песьня. А потым зьехаў у Амэрыку». А адзін з выступоўцаў дадаў: «І правільна зрабіў, бо — каму мы тут патрэбныя?»

Сапраўды, беларускія музыкі ў эміграцыі (насуперак пашыранаму меркаваньню) могуць жыць калі не са сваіх твораў, дык прынамсі з заняткаў музыкай. Сам Яўтуховіч сёньня ня толькі працуе ў рэстаране (ён сам некалі казаў, што і пачынаў як рэстаранны «лабух»), але і мае музычную перадачу на нью-ёрскай радыёстанцыі. З музыкі жывуць Віктар Смольскі (Нямеччына), Аляксандар Растопчын (ЗША). Вяртацца назаўжды пакуль ніхто не зьбіраецца: падчас канцэрту Яўтуховіч неаднойчы паўтараў, што наступным разам прыедзе яшчэ праз 11 гадоў.

Ці магчымае зьяўленьне ў Беларусі «новага Яўтуховіча»? Музычны крытык Зьміцер Падбярэскі ацэньвае такую імавернасьць вельмі скептычна: «Узыход Зьмітровай зоркі прыпаў на час нацыянальнага адраджэньня. Наўрад ці стала б магчымым сёньня зьяўленьне кампазытара, які напісаў бы песьню «Кахай мяне пад зоркаю Пагоні». Добрыя творцы ёсьць, але яны ня могуць разгарнуцца».

Застаецца спадзявацца толькі на глябалізацыю (Амэрыка ўсё ж такі размяшчаецца на той самай Зямлі, што і Беларусь) ды згадваць пра Яўтуховіча, як пра Карлсана: «Ён паляцеў, але абяцаў вярнуцца».

**Адам Воршыч**

# Настаўнік

*«Я ня страціў нічога свайго, апроч ілюзіяў».*
Генры Мілер

Палітыка — гэта мастацтва магчымага. Тая старая сэнтэнцыя ўнівэрсальная, бо ў кожных канкрэтных умовах яна набывае іншы сэнс. Датычна нашае краіны мераю мастацкае вартасьці палітыкі ёсьць тое, чаго беларусы *ня чуюць* у адкрыта прамоўленым. Напрадвесьні сваёй бурапеннай кар'еры Лукашэнка ўтварыў у Вярхоўным Савеце БССР фракцыю «Камуністы за дэмакратыю». І вось у адным зь першых інтэрвію (газэце «Навіны БНФ «Адраджэньне») ён улупіў: «Адыход ад камуністычных нормаў дыктуе само жыцьцё. Па шчырасьці, я ўпэўнены, што ў цэлым гэтая ідэалёгія беспэрспэктыўная». На дварэ тады было гарачае лета 1991-га. Ніхто не зьвярнуў увагі на відавочны цынізм маладога камуніста, які ня верыць у камунізм. Хоць ужо тады для яго і парлямэнт, і кампартыя былі толькі трамплінам. Прынагодна яму прыдавалася нават Дэклярацыя правоў чалавека. Вось што ён тады казаў: «А Вам, таварыш Ціхіня, нагадваю артыкул 19 Сусьветнае дэклярацыі правоў чалавека: кожны чалавек мае права на свабоду перакананьняў, на вольнае выказваньне іх; гэтае права ўключае права распаўсюджваць інфармацыю, ідэі любымі сродкамі й незалежна ад дзяржаўнае мяжы».

Больш пільнымі сталі калегі-дэпутаты й палітычныя апанэнты Лукашэнкі, калі пасьля рэфэрэндуму 1995 г. ён параіў сваім праціўнікам не шумець, а выпіць гарэлкі ды пасьці спаць. Тады ён выказаўся ў тым сэнсе, што ўсе павінны быць гатовы да таго, што ён прыйшоў на 12 гадоў. Вось ужо і тыя гады амаль мінулі! Багата людзей, сярод якіх пачаў высьпяваць ягоны фэномэн, ужо не пры справах: адных няма, а іншыя далёка. Тыя, хто яго ўспрымаў усур'ёз, і тыя, хто зь яго кпіў. У хуткаплыннай плыні найноўшае гісторыі хутка пазабылася, хто й што казаў і што *не* казаў. Спачатку Лукашэнку лавілі за хвост, ушчуваючы за правапарушэньні й хамскія паводзіны. Пасьля лапалі за язык, калекцыянуючы ягоныя абяцанкі-цацанкі, узаемавыключныя пасылы й анэкдатычныя ляпсусы. Урэшце, і гэтая гульня ўсім устыла. Ну ня бавіцца ж адным і тым самым дзясятак гадоў.

**Ніякіх шанцаў на зьмену ўлады ў Беларусі ціхамірным шляхам Лукашэнка не пакідае. Няма і не чакаецца дэмакратычных выбараў. Выйсьце застаецца адно — пазбыцца ілюзій.**

Беларусы падзяліліся напалам — тыя, хто безадмоўна верыць Лукашэнку, нават яго ня чуючы, а *вычуваючы* ягоную нянавісьць да ўсяго, чаго ён не разумее, ня ведае й ня мае як разьбіраццa. Іншыя — ня вераць яму наагул, выходзячы ўсё з тае самае (а ці бывае іншая?) нянавісьці. Гэта як варажба на рамонку: верыць — ня верыць. У абодвух выпадках усё, што ён кажа ці абяцае сёньня, не дадае да паўнаты карціны нічога новага. Абсалютна нічога. Бо Лукашэнка можа альбо сам забыцца на свае словы, альбо выдумаць для народу яшчэ штосьці.

Заморскія тэхналёгіі ў Беларусі не спрацоўваюць. Затое найлепшы настаўнік паліттэхналёгій — сам Лукашэнка. Ягоны халодны разьлік і неадольная прага ўлады — старонкі падручніка найноўшае беларускае палітыкі. Ён мяняў партыі й тусоўкі, выкарыстоўваў аднаразова цэлую плойму добраахвотных агітатараў, не стамляўся зьдзіўляць і цешыць усё *новымі* ідэямі, за якімі забываліся ранейшыя.

Самае страшнае не ў рэфэрэндуме. Найстрашнейшае, што ані ён, ані ягонае атачэньне не ўяўляюць сабе Беларусі без Лукашэнкі. На адной з прэсавых канфэрэнцыяў на пытаньне, што будзе рабіць, як скончыцца ягонае прэзыдэнцтва, шчыра выдаў: «Я пра гэта ня думаў…». А вось тэлеаракул Новікаў ужо падумаў і выдаў навыперадкі ўсім: «Дайце нам, спадарства, дваццаць—трыццаць гадоў!» Дзякуй за шчырасьць. Зрэшты, і без гуканетрыманьня Новікава ўсё тут ясна. Лукашэнка не зьбіраецца адыходзіць ад стырна да канца сваіх дзён. Ён выдатна ведае кошт нават частковай лібэралізацыі й дэмакратызацыі, на хвалі якіх ён ускочыў на падножку трамвая часу, што імчаў у новае тысячагодзьдзе.

Адпаведна, ніякіх шанцаў на зьмену ўлады ў Беларусі ціхамірным шляхам ён не пакідае. Няма і не чакаецца дэмакратычных выбараў — з допускам усіх кандыдатаў і кантролем за падлікам галасоў. Выйсьце застаецца адно — пазбыцца ілюзій.

**Гары Куманецкі, hary@hotmail.com**

# Учарашні дзень ААН

Калі прэзыдэнт ЗША Буш у сваёй прамове перад Генэральнай Асамблеяй ААН у Нью-Ёрку спаслаўся на агульначалавечыя каштоўнасьці і заклікаў міжнародную супольнасьць дапамагчы ў адбудове вольнага Іраку, ягоны патас не знайшоў вялікага водгуку ў сэрцах прысутных дыпляматаў. Хаця менавіта спрыяньне такім каштоўнасьцям, як дэмакратыя, свабода, павага да жанчын, было вызначана як адна з мэт заснаваньня ААН. Сёньня ж ААНаўскія дыпляматы куды больш заклапочаны сваімі ўласнымі інтарэсамі, і для высокіх ідэалаў ды вырашэньня надзённых праблем чалавецтва ў іх часьцяком не застаецца ані часу, ані энэргіі.

Так, генэральны сакратар ААН Кофі Анан быў занятыя прыхоўваньнем падрабязнасьцяў праграмы «Нафта ў абмен на харчаваньне», якая ў абход санкцый ААН дазваляла садамаўскаму Іраку прадаваць нафту дзеля палёгкі іракцаму насельніцтву. У той самы час праграма давала Садаму Хусэйну магчымасьць прадаваць нафту па завышаных цэнах і потым адмываць лішкавыя грошы дзеля будаўніцтва палацаў і рэалізацыі вайсковых праграм. Структуры ААН былі самі зацікаўлены ў працягу сумнеўных апэрацый, бо ААН з кожнага нафтавага кантракту атрымлівала камісійныя ў суме 2,2%. Мабыць, гэтая зацікаўленасьць і была галоўнай прычынай нежаданьня ААН дапамагаць Амэрыцы ў вызваленьні Іраку ад Садама.

Нямеччына была занятая прасоўваньнем свайго пераходу ў статус пастаяннага сябра Рады Бясьпекі ААН. На сёньня Рада ўключае пяць пастаянных членаў — Амэрыку, Кітай, Вялікабрытанію, Францыю і Расею, кожны зь якіх праз вэта можа заблякаваць любое, нават самае бясспрэчнае рашэньне ААН. У сваіх спробах трапіць у Раду Нямеччына знаходзіць падтрымку Францыі і Вялікай Брытаніі, якія самі баяцца страціць свае месцы, а таксама Японіі, Індыі і Бразыліі, якія самі прэтэндуюць на сяброўства ў Радзе. Супраць рэфармаваньня Рады выступаюць Амэрыка, Кітай і Расея, а таксама Італія, якая лічыць свой унёсак у забесьпячэньне стабільнасьці ніяк ня меншым за нямецкі. Жаданьне Нямеччыны трапіць у Раду Бясьпекі дэманструе радыкальны паварот у нямецкай замежнай палітыцы. Яшчэ зусім нядаўна нямецкі левацэнтрысцкі ўрад прытрымліваўся традыцыйнае пазыцыі ратацыйнага сяброўства Эўразьвязу ў Радзе Бясьпекі. Цяпер жа Нямеччына настойвае на ўласным сяброўстве, што апанэнты ўраду Шродэра-Фішэра разглядаюць як «левы нацыяналізм».

Судан быў заняты адстойваньнем уласнага, хай сабе і ня надта дэмакратычнага, погляду на грамадзянскія правы, балазе што гэтая краіна ўваходзіць у камісію ААН па правах чалавека. Уласны погляд Судану палягае ў магчымасьці беспакарана патураць генацыду на ўласнай тэрыторыі. У Дарфуры з маўклівае згоды ўраду мэтадычна перасьледуюцца і зьнішчаюцца чарнаскурыя. Але ўсе спробы ААН прыняць рашучую рэзалюцыю і нацiснуць на Судан дагэтуль натыкаліся на нязгоду Кітаю, які мае ў Судане нафтавыя інтарэсы. У 1994 г. ААН ужо дэманстравала сваю бездапаможнасьць падчас генацыду ў Руандзе. Няўжо Дарфур стане працягам?

**ААН — структура, якая шмат у чым арыентуецца на ўжо няіснае супрацьстаяньне дзьвюх звышдзяржаў. Сёньня, калі галоўнай праблемай робіцца барацьба з тэрарызмам і дыктатарскімі рэжымамі, ААН ператвараецца ў недзеяздольнае згуртаваньне клюбаў па інтарэсах.**

Іран быў заняты распрацоўкай уласнае атамнае бомбы. Выглядае, што ўжо нічога не перашкодзіць клерыкальнаму ўраду Ірану дамагчыся ядзернага статусу. Такім чынам, спробы Эўразьвязу прадэманстраваць перавагі свайго «мяккага падыходу» да вырашэньня міжнародных праблем на прыкладзе перамоў з Іранам церпяць крах. Ядзерны статус Ірану станецца яшчэ адным фактарам нестабільнасьці ў Азіі.

ААН — структура, якая была створана ў сярэдзіне мінулага стагодзьдзя і шмат у чым арыентуецца на ўжо няіснае супрацьстаяньне дзьвюх звышдзяржаў. У сёньняшнім сьвеце, галоўнай праблемай якога робіцца барацьба з тэрарызмам і дыктатарскімі рэжымамі, ААН усё больш ператвараецца ў недзеяздольнае згуртаваньне клюбаў па інтарэсах. Такая структура наўрад ці здольная знайсьці адказы на выклікі часу і, цалкам магчыма, у хуткім часе зьнікне, як гэта ў свой час адбылося зь Лігай нацый. З гэтага гледзішча спробы Кофі Анана давесьці нелегітымнасьць вайны ў Іраку, бо на яе не было непасрэднае санкцыі ААН, грунтуецца на сумнеўнай лёгіцы ўчарашняга дня. Тым больш што такія заявы робяцца падчас самага піку перадвыбарнае гонкі ў Амэрыцы.

**Сяржук Вінаградаў, siarzhuk.vinahradau@tut.by**

# Парлямэнт пашыранай Эўропы надае больш увагі Беларусі

**Працуючы з архіўнымі матэрыяламі Эўрапарлямэнту па праблематыцы майго дасьледаваньня, мне прыйшла думка прасачыць заадно, калі ды ў зьвязку зь якой тэматыкай эўрадэпутаты зьвярталіся да «беларускага пытаньня». Бальшыня дэпутацкіх запытаў за прынамсі апошнія пяць гадоў тычылася Чарнобылю.**

Экалягісты, якія разам з прадстаўнікамі безьдзяржаўных народаў стварылі чацьвёртую па колькасьці фракцыю Эўрапарлямэнту — «Зялёныя/Эўрапейскі вольны альянс», рабілі заклікі да больш актыўнага ўдзелу ЭЗ у праграмах дапамогі ахвярам тэхнагеннай катастрофы, патрабавалі ад беларускіх уладаў вызваліць прафэсара Бандажэўскага. Але, бадай, самым галоўным для іх быў прэсынг на Эўракамісію ў справе выдзяленьня грошай на канчатковае закрыцьцё ЧАЭС.

Прадстаўнікі ж самых буйных і ўплывовых палітычных плыняў — «народнікі» й сацыялісты — мала цікавіліся нашай краінай. З пункту гледзішча Realpolitik гэта пазыцыя лягічная. Калі б у Беларусі выбухнуў міжэтнічны канфлікт ці вostра паўстала праблема некантраляванай міграцыі, то ЭЗ надаваў бы нам больш увагі. Пасьля таго як высьветлілася, што расейска-беларуская інтэграцыя была блефам, Захад яшчэ больш супакоіўся. Да таго ж пэўныя колы ў краінах ЭЗ лічаць, што пятае пашырэньне Зьвязу было апошняе ва ўсходнім кірунку. Маўляў, трэба яшчэ «пераправіць» ужо прынятыя дзяржавы.

Рэзалюцыі Эўрапарлямэнту па Беларусі даюць няшмат у практычным пляне, бо звычайна ў іх толькі дыпляматычна «выказваецца заклапочанасьць» падзеямі ў краіне, але вельмі карысныя ў пляне пашырэньня інфармацыі ў Эўропе аб нашай палітычнай сытуацыі. Прывяду прыклад з асабістага досьведу.

Сэрыя публікацый пра Беларусь у рэгіянальнай эльзаскай газэце дазволіла маім знаёмым у літаральным сэнсе адкрыць для сябе краіну, якая знаходзіцца ўсяго за дзьве гадзіны лёту ад Страсбургу.

Раней (у Эўрапарлямэнце пятага скліканьня, 1999—2004) існавала адна міжпарлямэнцкая дэлегацыя на тры дзяржавы — Украіну, Беларусь і Малдову. Цяпер там створана асобная дэлегацыя па Беларусі. Гэта можна растлумачыць наступным чынам. Па-першае, Беларусь цяпер непасрэдна мяжуе з ЭЗ, а Брусэль афіцыйна падкрэсьлівае важнасьць дачыненьняў з новымі суседзямі й стварэньня так званага «кола сяброў» вакол Зьвязу. Па-другое, новыя дзяржавы — чальцы ЭЗ больш за іншых зацікаўлены ў спакоі й стабільнасьці на сваіх межах. Да таго ж нашы былыя сябры па сацлягеры лепш разумеюць нашу нацыянальную праблематыку й не жадаюць зьнікненьня памежных гаспадарстваў, утвораных па ліквідацыі Савецкага Саюзу. Невыпадкова, што дзесяць зь пятнаццаці сяброў новаўтворанай дэлегацыі «Эўрапарлямэнт—Беларусь» — гэта прадстаўнікі Польшчы, Літвы й Чэхіі.

Першай праявай узмацненьня прабеларускага «лобі» сталася вылучэньне парлямэнтарамі беларусаў на атрыманьне Сахараўскай прэміі. Гаворка ідзе пра Асацыяцыю беларускіх журналістаў і «Зубр». На жаль, ініцыятыва вылучэньня належыць ня групам, а асобным дэпутатам зь Літвы й Нямеччыны. Але гэта толькі пачатак.

Натуральна, Эўрапейскі Зьвяз ня мае пакуль рэальных рычагоў уплыву ў беларускіх справах ды гатовы разглядаць Беларусь як зону расейскага дамінаваньня. Тым ня менш, прысутнасьць у эўрапейскіх інстытуцыях нашых суседзяў паспрые выпрацоўцы больш канкрэтнай і, спадзяюся, карыснай для нас палітыкі.

**Зьміцер Хадакоў, Страсбург—Брусэль**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

8 верасьня ў Жодзіне падчас расклейкі ўлётак затрыманы вучань 11-й клясы, сябар «Маладого фронту» **Яўген Валкавец**. Пастаўская раённая арганізацыя **БСДП (НГ)** была зьнята з рэгістрацыі 15 верасьня: управа юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму палічыла, што пры яе рэгістрацыі былі сфальшаваны дакумэнты. Намесьніцу галоўнага рэдактара шклоўскай раённай газэты «Ўдарны фронт» **Ніну Буйніцкую** звольнілі 20 верасьня за публікацыю вершу, у якім яна не заўважыла акравершу, скіраванага супраць Лукашэнкі. 21 верасьня галоўнага рэдактара недзяржаўнай газэты «Ганцавіцкі час» **Пятра Гузаеўскага** не пусьцілі на адкрытае пасяджэньне райсавету дэпутатаў. У Віцебску сябра КХП-БНФ **Уладзімера Плешчанку** 22 верасьня за несанкцыянаваны пікет асудзілі на 160 б.в. А 24 верасьня яго і **Аляксандра Салаўяна** асудзілі на 10 сутак: сябры КХП-БНФ агітавалі супраць удзелу ў выбарах і рэфэрэндуме. Актывістаў «Зубра» **Мікіту Сасіма** і **Глеба Вязоўскага** 22 верасьня ў Менску затрымалі міліцыянты, абшукалі й зьвінавацілі ў дробным хуліганстве, бо знайшлі балёнікі з фарбай. Ноч іх пратрымалі ў міліцыі, прataколы склалі толькі зранку. Карэспандэнтка недзяржаўнай газэты «Ганцавіцкі час» **Соф'я Ясько** 22 верасьня ў судзе Ляхавіцкага раёну выйграла працэс супраць рэдакцыі раённай газэты «Савецкае Палессе» і яе галоўнай рэдактаркі Галіны Мазінай па абароне гонару, годнасьці й дзелавой рэпутацыі. 22 верасьня ў Магілёве былі затрыманы актывісты «Зубра» **Андрэй Зайцаў** і **Ўладзіслаў Жэнэску**, у якіх канфіскавалі некалькі соцень газэт. У Віцебску 23 верасьня падчас раздачы ўлётак супраць рэфэрэндуму й датэрміновага галасаваньня затрыманы **Валер Шчукін**. Берасьцейскі абласны суд 23 верасьня падчас касацыйнага разгляду справы па абароне дзелавой рэпутацыі **ПБНФ** адмяніў папярэдняе рашэньне Маларыцкага суду і фактычна прызнаў, што БНФ у час другой сусьветнай вайны супрацоўнічаў з фашыстамі. У Берасьці 23 верасьня падчас раздачы ўлётак затрыманы сябар «Маладога фронту» непаўналетні **Аляксандар Ражалоўскі**. 24 верасьня **Міхаілу Марынічу** былі прад'яўлены новыя абвінавачаньні — ч.2 арт.377 (выкраданьне ці пашкоджаньне дакумэнтаў, штампаў, пячатак) і ч.4 арт.210 (выкраданьне праз злоўжываньне службовымі паўнамоцтвамі, учыненае арганізаванай групай ці ў асабліва буйным памеры). 25 верасьня ягонае ўтрыманьне пад вартай падоўжылі яшчэ на месяц. Падчас распаўсюджваньня бюлетэню «Предприниматель» і ўлётак у Пінску затрыманы **Зьміцер Леванеўскі**. 25 верасьня ў Івацэвічах за распаўсюд газэты затрыманы актывіст «Зубра» **Станіслаў Кучынскі**: сьпярша на яго склалі пратакол за распаўсюджваньне друкаваных выданьняў без выходных зьвестак, потым — за антысанітарыю. У Шклове 27 верасьня міліцыянты зрабіліператрус кватэры **Аляксандра Шчарбака,** кіраўніка групы падтрымкі кандыдата ад ПБНФ Рыгора Костусева: шукалі ўлёткі. 28 верасьня адбыўсяператрус у берасьцейскім офісе праваабарончага цэнтру **«Вясна»**, канфіскаваныя тысячы ўлётак. Актывісты «Зубра» **Мікалай Ільін** і **Яўген Сувораў** затрыманыя 27 верасьня падчас раздачы газэты ў Магілеўскім пэдунівэрсытэце. У Баранавічах 27 верасьня падчас акцыі ў падтрымку М.Марыніча затрыманыя актывісты «Зубра» **Наста Васіленка**, **Арцём Ластавецкі**, **Алена Пятрашка**, **Марыя Гансецкая**. Сяброўку КХП-БНФ **Аліну Дуброўскую** 27 верасьня міліцыянты высадзілі з электрычкі, затрымалі яе й канфіскавалі ўлёткі з заклікам да байкоту.

**АШ**

## Ліст галоўнаму рэдактару «Советской Белоруссии»

Шаноўны Павал Ізотавіч!

Сачу за Вашай творчасьцю ад часоў Вашага захапленьня спартовай журналістыкай. Цяпер Вы закранаеце праблемы публічна значныя, агульнанацыянальнага, а часам і большага маштабу, але па-ранейшаму пішыце жыва і небесспадстаўна разьлічваеце на водгук у сэрцах чытачоў. Таму я і вырашыў распачаць цыкл лістоў да Вас.

Сёньня пра Ваш допіс «Аб характары нашых газэт». Галоўная яго тэза — «заангажаванасьць» недзяржаўнай прэсы. Каб давесьці гэта, Вы прапануеце «захапляльны экспэрымэнт» — напісаць крытычны матэрыял пра Бушамалодшага і прапанаваць яго недзяржаўным выданьням, якія, паводле Вашага сьцьверджаньня, ад матэрыялу адмовяцца.

Ня думаю. Усё залежыць ад аргумэнтаванасьці і якасьці матэрыялу. І таму, дзеля чысьціні экспэрымэнту, напішыце і прапануйце. Вы — асоба знаная, зьяўляецеся адным з найбуйнейшых беларускіх журналістаў. Перакананы, што Ваш артыкул не застанецца па-за ўвагай аніводнага галоўнага рэдактара недзяржаўнага выданьня.

Засмуцілі мяне, аднак, у Вашым допісе колькі месцаў, якія засталіся непрасьветленымі і чытачу незразумелымі.

Напрыклад, чаму гэта рапам старшыня партыі БНФ Вінцук Вячорка, «буйны дэмакрат», паводле Вашага азначэньня, захацеў надрукавацца ў «СБ»? Падумалася: па-першае, калі б сапраўды быў «буйным дэмакратам», дык не захацеў бы, а па-другое, калі не дэмакрат, то чаму Вы тады яму адмовілі?

Зразумеў з Вашага артыкулу толькі тое, што В.Вячорка даслаў у газэту нейкія «агіткі», а Вы іх не надрукавалі, абапіраючыся на цьвёрды рэдактарскі прынцып: «Падыходзіць газэце матэрыял — публікуем, не спадабаецца — выбачайце».

Але што Вам так не спадабалася? Аказалася — афіцыйны ліст Партыі БНФ у шэраг дзяржаўных інстанцый, у тым ліку і ў «СБ».

У ім, у прыватнасьці, гаворыцца, што «СБ» у нумары 170 ад 9 верасьня 2004 г. зьмясьціла заяву аднаго грамадзкага фармаваньня, у якой ягоныя прадстаўнікі заклікаюць «...выказаць аднадушную падтрымку прэзыдэнту А.Р.Лукашэнку на канстытуцыйным рэфэрэндуме і прагаласаваць за...». Таксама Ваша газэта апублікавала «агітацыйныя звароты грамадзян замежных краін, што ёсьць грубым парушэньнем часткі 5 артыкулу 45 Выбарчага кодэксу, якая забараняе замежным грамадзянам браць удзел у агітацыі».

А таму беларускія грамадзяне, якія маюць ня меншыя за замежнікаў правы, запатрабавалі, каб іхныя матэрыялы супраць аднабаковай агітацыі былі таксама надрукаваныя. І Вам, Павал Ізотавіч, гэта не спадабалася? Я не законьнік, але адчуваю, што, апублікаваўшы матэрыялы прадстаўнікоў іншага аб'яднаньня, аніякага артыкулу Выбарчага кодэксу Вы не парушылі б.

Хаця... Вы назвалі свой допіс па-ленінску.

Можа, таму, што юрыст Ул.Ульянаў кіраваўся не законамі, а «рэвалюцыйнай мэтазгоднасьцю»? Гэта значыць — чымсьці блізкім да ірацыянальнага прынцыпу «падыходзіць... — публікуем, не спадабаецца — выбачайце».

А ці ня варта было б Вашай газэце знайсьці які-небудзь іншы, больш зразумелы чытачу прынцып? Напрыклад — шырокае адлюстраваньне самых розных сацыяльных і палітычных поглядаў, што існуюць у беларускім грамадзтве.

З пажаданьнямі посьпехаў,

**Алесь Анціпенка, грамадзянін РБ**

## «Наколькі ж погляды Лукашэнкі мне, студэнту, чужыя»

23 верасьня адбылася сустрэча прэзыдэнта Лукашэнкі са студэнтамі ВНУ Берасьцейшчыны. Мне давялося прысутнічаць на гэтай сустрэчы.

Натуральна, што тэлевэрсія падзеі ня ўтрымлівала многіх момантаў гэтай размовы. Як выказаўся сам Лукашэнка, яму было цікава сустрэцца з нашымі студэнтамі, бо на мінулых выбарах яго тут ня вельмі падтрымалі.

Уласна на самой «лекцыі» шмат гаварылася пра гістарычны ўсходнеславянскі выбар Беларусі, пра нашу культурную адчужанасьць ад захаду, «малыя» рэлігіі, такія, як каталіцтва і пратэстанцтва, нашы «посьпехі» ў эканоміцы, «развал рэальнага сэктару эканомікі» Літвы ды шматмільярдныя замежныя запазычанасьці Польшчы. Успаміналася і пра ЭГУ: маўляў, зачынены ён быў праз невыкананьне патрабаваньняў Міністэрства адукацыі.

Студэнты задавалі розныя пытаньні, многія зь якіх былі стандартныя, і на іх былі атрыманы гэткія ж стандартныя адказы. Было пытаньне пра стан беларускай мовы і стварэньне нацыянальнага ўнівэрсытэту, успамінаўся зачынены гуманітарны ліцэй. Гэтае пытаньне выклікала авацыю ў залі. Вось тут Лукашэнка выказаўся і пра тое, як у ліцэі «гробили детей», і пра тое, як добра ведае, «што за людзі Колас з Баршчэўскім», бо «сядзеў зь імі ў адным парлямэнце».

Былі жарты пра вэрталёт, размовы пра прыгожых дзяўчынак, пра спорт. У стылі ППРБ было вырашана пытаньне выплаты заробкаў удзельнікам будатрадаў. Былі і апладысмэнты на яго адрас.

Маіх перакананьняў сустрэча не зьмяніла, проста яшчэ раз паказала, наколькі погляды нашай улады чужыя мне. Тое самае магу сказаць пра многіх маіх сяброў і знаёмых, якія глядзелі тэлетрансьляцыю на вялікім экране, усталяваным адмыслова да гэтай падзеі. Мала адной сустрэчы, каб пераламіць сытуацыю. Цяжка Лукашэнку тут будзе выйграць рэфэрэндум.

**Андрусь, Берасьце**

## Тэрарызм ці крык непачутых?

Ці ёсьць апраўданьне тэрарызму? Ці ёсьць апраўданьне вайне? Ці ёсьць апраўданьне ўласнай глухаце? На гэтыя пытаньні з аднаго шэрагу можна адказаць і «так» і «не» ў залежнасьці ад канкрэтнай сытуацыі. Уласная глухата можа быць вынікам хваробы, а можа быць наўмыснай. Вайна можа быць акупацыйнай і вызвольнай. Тэрарызм — апраўданым, неапраўданым. Хто дасьць ацэнку канкрэтнай сытуацыі? Люд паспаліты — на падставе сваіх эмоцый і абмежаваных ведаў? Ці сусьветная супольнасьць, увасобленая ў кваліфікаваным міжнародным судзе, узброеным дасканалымі законамі? Я — не юрыст міжнароднага права, і я ня ведаю, наколькі дасканалыя ўсеагульныя законы. Але дакладна магу сьцьвярджаць — карані тэрарызму маюць пад сабой палітычную глебу. У першым выпадку ставяць дыягназ хваробы, зьвязанай зь існым сусьветным ці дзяржаўным ладам, у другім — хваробы, што мае дачыненьне да цноты, духоўнасьці грамадзтва. Хто ж адкажа за тое, што гіне невінаваты люд? І ці сапраўды ён такі невінаваты? Дзе той крытэр невінаватасьці? Так, люд ні ў чым невінаваты, калі ён ня мае права і магчымасьці нешта вырашаць у краіне. Тэрарызм — гэта пераважна выклік абыякавасьці грамадзтва да жыцьцёва важнай праблемы, якая чакае свайго вырашэньня. І як да грамадзкай зьявы мы ўсе маем да яго дачыненьне. Калі маюць месца рэлігійныя, нацыянальныя, грамадзка-палітычныя праблемы, іх разьвязаньне, адпаведна, трэба шукаць у адасабленьні дзяржавы ад рэлігіі, забесьпячэньні этнасу магчымасьці самавызначэньня, абароны ад асыміляцыі, дазволе грамадзянам аб'ядноўвацца ў партыі ды арганізацыі, каб уплываць на лёс сваёй краіны. Усялякі міжнародны перасьлед тэрарыстаў, сусьветная каардынацыя дзейнняў па перакрыцьці іх фінансаваньня ды іншыя падобныя захады не вырашаюць пытаньня карэнным чынам, а адкладаюць яго на заўтра. Прасьцей змагацца зь ветракамі, чым мяняць сябе ды звыклы стан рэчаў. Прасьцей аказаць гуманітарную дапамогу ахвярам прыкрай зьявы, чымся ляячыць уласную глухату. Прасьцей гуляць у цнатлівасьць, чым кіравацца ёю ў жыцьці.

**Ігар Хаменка, gaspadar.com**

## Аб прэзыдэнту

Нацыянальная самапавага — якраз тое зернейка, зь якога вырастае магутнае дрэва годнага ды заможнага жыцьця любога народу. Яна стаіць побач з павагай да сябе самога як непаўторнай чалавечай істоты, гэтаксама як і з павагай да іншых людзей, іншых народаў, носьбітаў іншых культур, сьветапоглядаў. Самапавага несумяшчальная з пачуцьцём непаўнавартаснасьці. Бо апошняе выклікае сорам за сябе і свой народ, а разам з гэтым — стойкую крыўду на іншых, адрозных ад сябе ўсяго толькі адсутнасьцю ў іх галаве тваіх комплексаў, поруч з адкрытай ці прыхаванай, сьвядомай ці неўсьвядомленай агрэсіяй, жаданьнем хоць неяк узьняцца над «крыўдзіцелем», а то і прынізіць яго. Такім чынам, іншы чалавек, іншы народ успрымаецца аднабока як аб'ект магчымага заспакаеньня, спаталеньня пачуцьця ўласнай непаўнавартаснасьці, а не як асобны ад цябе і тваіх комплексаў, роўны табе суб'ект. Нездарма наш прэзыдэнт так зацята шукае ворагаў у цывілізаваным сьвеце, шукае і знаходзіць іх сярод інтэлігентных людзей сваёй краіны, увесь час імкнецца да бітваў і перамог хоць на лыжах ці палетках. Ён прыніжае ўсіх вакол сябе, каб даказаць сабе самому, які ён мудры, дужы, папулярны.

Любая дэмакратыя ў Беларусі, калі яна нь будзе грунтавацца на нацыянальных (а празь іх і на агульначалавечых) каштоўнасьцях, не паспеўшы акрыяць, ізноў завязьне ў багне лукашызму. Бо непаўнавартаснасьць нікуды не ўцячэ, не схаваецца. Яна застанецца тут і будзе настойліва патрабаваць вечнага пошуку вінаватых у кепскім жыцьці, шальмаваньня і прыніжэньня адрозных у мэнталітэце ад асноўнай масы і, вядома ж, «моцнай рукі».

**Сяргей Трыфанаў, Рэчыца**

## Выпадак у Берасьці

Тры гады таму дасьледчыца архітэктуры старадаўняга Берасьця Ірына Лаўроўская, працуючы ў Польшчы над дысэртацыяй, знайшла шляхі папаўненьня кніжных фондаў берасьцейскай бібліятэкі. У выніку ў бібліятэку трапіла каля 500 навуковых кніг найлепшых польскіх выдавецтваў па гісторыі, гісторыі мастацтва і літаратуры.

Па ўсёй Беларусі разьлягелася тады інфармацыя афіцыйных СМІ аб такім шчодрым падарунку. Аднак ні Ірына Лаўроўская, ні «Стары горад» у гэтых паведамленьнях не былі згаданыя. Дырэктарка бібліятэкі Тамара Данілюк растлумачыла замоўчваньне сваёй занепакоенасьцю тым, каб згадка ў прэсе Ірыны Лаўроўскай, якая атрымала ад улад т.зв. «забарону на прафэсію» (яшчэ ў 1999-м яе звольнілі па палітычных матывах з пасады старшага выкладчыка Берасьцейскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту), не ўзбудзіла непатрэбнай цікавасьці з боку органаў. А ў якасьці кампэнсацыі такога стаўленьня Ірыне Лаўроўскай выдалі білет «Ганаровага чытача».

«Круглы стол» «Буг не падзяляе» прыпаў на 65-ю гадавіну заняцьця Берасьця войскамі Чырвонай Арміі і пачатку ў горадзе палітычных рэпрэсій, але ня гэта стала тэмай абвешчанага сходу. Прысутныя, сярод якіх і прадстаўніца Генконсульства Польшчы ў Берасьці Аліна Чарняўская, і начальнік упраўленьня культуры аблвыканкаму Рыгор Бысюк, а таксама асобы, прыналежныя да розных рухаў і партый, сабраліся ў актавай залі бібліятэкі зь іншай нагоды — дзеля прэзэнтацыі кнігі «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі», напісанай вядучым спэцыялістам упраўленьня культуры Берасьцейскага аблвыканкаму Леанідам Несьцерчуком.

Канфлікт выклікаў выступ Валер'я Мароза — падпалкоўніка КДБ і аднаго з аўтараў нядаўна апублікаванага фотаальбому «От Берестья до Бреста из века в век». У прысутнасьці ўдзельнікаў «круглага стала» краязнавец з КДБ абвінаваціў у крадзяжы слуцкіх паясоў з касьцёлу ў Чарнаўчыцах дэпартаманта некалькі гадоў таму зь Беларусі кс.Збігнева Кароляка. З маўклівай згоды дырэктаркі Т.Данілюк чыноўнік КДБ выступаў калі і колькі хацеў, у той жа час знакамітая берасьцейская пісьменьніца Зінаіда Дудзюк атрымала ня больш як дзьве хвіліны часу. Не атрымала слова сярод іншых і згаданая вышэй І.Лаўроўская, вымушаная абмежавацца заявай аб непраўамерным выкарыстаньні чыноўнікамі дзяржаўных сродкаў для выпуску ўласных кніг, якія выходзяць з грунтоўнымі памылкамі праз адсутнасьць адпаведнай навуковай рэцэнзіі.

Тады, напэўна, валодаючы мэтадамі псыхалягічнага ціску і апэратыўнымі дадзенымі на І.Лаўроўскую, падпалкоўнік КДБ В.Мароз выказаўся пра І.Лаўроўскую як дасьледчыцу. На думку І.Лаўроўскай, В.Мароз даўно «вывучаў» кола адраджэнцаў, сярод якіх трэба згадаць мастака Ўладзімера Базана (растоўна памёрлага ў 1997 г.), паэта і тэлевядучага Міколу Пракаповіча, паэта Алеся Каска. Да гэтага ж кола належыць і Ірына Лаўроўская.

І.Лаўроўская адчула сябе абражанай і ў знак пратэсту адмовілася ад званьня «Ганаровага чытача» бібліятэкі, дзе адбыліся гэтыя падзеі. І.Лаўроўская ў заяве на імя дырэктаркі бібліятэкі напісала: «Лічу пагардаю заставацца ў адным сьпісе (фармальным ці нефармальным) з супрацоўнікамі органаў сьледчых і экзэкуцыйных, якія вызначыліся сваёй ганебнай палітыкай адносна нацыянальнага Адраджэньня і Незалежнасьці Беларусі». Вось так сьвята, прысьвечанае 15-годзьдзю супрацоўніцтва Берасьцейскай абласной бібліятэкі імя Горкага і Публічнай бібліятэкі Бялай Падляскі (Польшча), адзначылася скандалам.

**Вольга Клішэвіч, Берасьце**

---

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

### ЖАРТ

Вы ведаеце, дзеля чаго Плошчу Незалежнасьці раскапалі? Будуць Кінг-Конга лавіць!

### ЦЫТАТА

## Дух прэзыдэнта лунае над чужынай

«Дружная каманда юных хакеістаў зь вёскі Зубава (разьмешчана побач з Копысьсю) двойчы станавілася пераможцай турніру «Залатая шайба» на прыз прэзыдэнта РБ. Над ёй як бы лунаў дух кіраўніка нашай дзяржавы, і гэта, відавочна, дапамагло перамагчы.

Сустракаючыся 12 жніўня з хлеборобамі СПК «Кастрычнік-Горадня», Аляксандар Рыгоравіч заўважыў, што нарадзіўся ён на самым усходзе нашай рэспублікі, непадалёку ад Расеі. Размова, зразумела, ішла пра Копысь... Тут яго малая радзіма. І тут жа — вялікая Радзіма!»

Георгій Каралёў, «Недалеко от России...» — «Віцебскі рабочы», 28 жніўня 2004 г.

**Даслаў ЯЖ з Воршы**

### ПОКАЗКІ

У Беларусі зьбіраюцца праводзіць чарговы рэфэрэндум. Народу будзе зададзена два пытаньні:

1. Хто, на Вашую думку, найлепшы кандыдат на пасаду прэзыдэнта?
2. Чаму менавіта Аляксандар Лукашэнка?

* * *

Толькі 5% беларусаў правільна адказалі на пытаньне НІСЭПД «Ці падабаецца Вам наш Прэзыдэнт?»

**Алесь, Менск**

### ПАДЗЯКА

У «НН» за 27 жніўня г.г. публікавалася анкета з пытаньнямі, што датычыліся беларускага клясычнага правапісу. Адначасова з гэтай публікацыяй Працоўная група разаслала анкету шэрагу навукоўцаў і літаратараў; крыху пазьней анкета зьявілася на інтэрнэт-сайтах. Працоўная група шчыра дзякуе ўсім, хто ўзяў удзел у анкетаваньні й гэтак спрычыніўся да справы. Вось імёны тых, хто даслаў свае адказы па пошце (звычайнай і электроннай) або прадыктаваў свае адказы па тэлефоне (без уліку тых, хто галасаваў у Сеціве): Сяржук **Андрэеў** (Рагачоў), Уладзімер **Арлоў** (Менск), Анатоль **Арлоўскі** (Менск), Віталь **Воранаў** (Познань), Уладзь **Гарбацкі** (Віцебск), Дзьмітры **Габінскі**, Алег **Гардзіенка** (Менск), А.**Германаў** (Лагойск), Уладзімер **Гілеп**, Лявон **Гуменьнікаў** (Менск), Алесь **Дзямяненка** (Менск), Сяргей **Дубавец** (Вільня), Н.**Жучкова** (Менск), Янка **Запруднік** (ЗША), М.**Засінец** (Мазыр), Дзяніс **Івашын**, Алена **Каранчук** (Менск), Э.**Карбановіч** (Менск), Алесь **Карцель** (Менск), Вольга **Кастрамінава** (Менск), Ксеня **Касьцевіч** (Лёндан), В.**Кошалеў** (Менск), Алесь **Квіткевіч** (Менск), Андрэй **Кузьнечык** (Менск), **Л.О.** (Менск), Ігар **Лабацэвіч** (Лёндан), Зьміцер **Лапцёнак** (Менск), Гэнік **Лойка** (Менск), Алег **Лучына** (Барысаў), Тацяна **Малашчанка** (Баранавічы), А.**Мельнікаў** (Гомель), Аляксандар **Міскевіч** (Менск), Алесь **Навіцкі** (Варшава), а.Аляксандар **Надсан** (Лёндан), Віктар **Новік** (Капыль), Сьвятлана **Носава** (Магілёў), Ляксей **Папоў** (Менск), Улад **Плакса**, Война **Пракопчык** (Менск), Віктар **Раманенка** (Менск), Вульф **Рубінчык** (Менск), Пётра **Садоўскі** (Менск), Барыс **Сакалоўскі** (Сьветлагорск), Аляксей **Сакун** (Бабруйск), пан **Скіргайла** (Менск), Алесь **Ступень** (Горадня), Павал **Сьцяцко** (Горадня), Эдуард **Харанека** (Бабруйск), спн.**Цюленева** (Менск), Алесь **Цюленеў** (Менск), Аляксандар **Чайчыц**, Адам **Шпакоўскі** (Менск), Андрэй **Шулаеў** (Менск), Сяргей **Шупа** (Прага), Алесь **Яўдаха** (Менск), Віктар **Яўмененка** (Менск), Іван **Яшкін** (Менск), **N** (Берасьце), **N** (Гарадзеншчына), **N** (Маладэчна), **N** (Менск) — праз пошту, **N** (Менск) — праз тэлефон, **N** (Менск, вул.Мельнікайтэ), **N** (Менск, Кунцаўшчына), **N** (Менск, пр.газэты «Праўда»), **N** (Менск-12), **N** (Менск-50, а/с 306) — 3 адказы.

# Найлепшы настаўнік — гэта мэнэджэр

Фінал конкурсу на званьне найлепшага настаўніка Беларусі 2004 г. «Крыштальны журавель» доўжыўся ўвесь верасень і скончыўся толькі 28-га. За гэты месяц кожны з 21 фіналіста прайшоў праз незьлічоныя конкурсныя заданьні, даў па 3 паказальныя ўрокі (запісаны на відэа, дадзены па сваёй мэтодыцы і дадзены па мадэлі журы ў незнаёмай клясе). У супэрфінал, які адбываўся 28-га, выйшлі шасьцёра прэтэндэнтаў: Зоя Вінаградава (гісторыя, Лагойск), Анжаліка Рэдзька (матэматыка, Наваградак), Зьміцер Мацкевіч (матэматыка, Браслаў), Віталь Гузаў (праца, Жлобін), Ігар Якіменка (інфарматыка, Магілёў), Павал Ялковіч (праца, Нясьвіскі раён). Пераможцам стаў І.Якіменка.

Сам конкурс «Крыштальны журавель» нагадваў маластраўную сумесь тэлешоў накшталт «Слабага зьвяна» з сур'ёзнай мэтадычнай канфэрэнцыяй. Сярод заданьняў, прапанаваных канкурсантам, быў конкурс сьпеваў, праверка эрудыцыі й рэакцыі (за 30 сэкундаў трэба даць як мага больш правільных адказаў на пытаньні), здольнасьці хутка знайсьці выйсьце зь нестандартнай сытуацыі на ўроку («Як не сарваць кантрольную, калі падчас яе ў клясе нехта выпусьціў мыш?»). Але разам з тым настаўнікі мусілі даваць мініўрокі, дзе роля вучняў дасталася іхным калегам, павінны былі рэпрэзэнтаваць і абараняць свае канцэпцыі й распрацоўкі.

Адной з найбольш нечаканых праверак для канкурсантаў сталі псыхалягічныя тэсты, арганізаваныя Рэспубліканскім цэнтрам праблем чалавека БДУ. Гэтае мерапрыемства арганізатары конкурсу наладзілі ўпершыню. Цягам трох гадзін правяраліся прыроджаныя схільнасьці настаўнікаў (рэакцыя, эмацыйная ўраўнаважанасьць, усе віды памяці, канфліктнасьць, агрэсіўнасьць і інш.). Кандыдат псыхалягічных навук, загадчыца лябараторыі псыхафізіялёгіі й прафэсіяграфіі Сьвятлана Сагайдак назвала найлепшых настаўнікаў яшчэ й цудоўнымі мэнэджэрамі: «Ім трэба было прадэманстраваць неабыякія здольнасьці ў напісаньні плянаў, прэзэнтацыі сябе й г.д. І на ўзроўні мэнэджэраў у іх усё цудоўна! Так і павінна было быць. Калі б мы абсьледавалі ўсіх шараговых настаўнікаў запар, карціна была б іншай, бо настаўнікі ёсьць розныя».

Па выніках быў намаляваны зборны «псыхалягічны партрэт» найлепшага беларускага настаўніка. Былі выяўлены шэсьць асноўных станоўчых якасьцяў характару. У 91% выявілася сынхранізацыя работы абодвух паўшар'яў мозгу — гарманічна працуюць і слоўна-лягічнае, і вобразнае мысьленьне. Такіх людзей прырода ад пачатку падрыхтавала да таго, каб працаваць сярод людзей. «Мы падазравалі, што гэта найважнейшая для настаўніка рыса, але не падазравалі, што яна будзе ў такой колькасьці людзей, — кажа С.Сагайдак. — Мы выявілі сярод фіналістаў толькі двух чалавек, у якіх мозг працуе іначай, чым ва ўсіх. Яны больш творчыя асобы, схільныя да навуковай працы: у сваёй сфэры могуць «капаць» углыб, дасягаючы нечага неймавернага».

Ні ў кога ня выяўлена агрэсіўнасьці, павышанай канфліктнасьці. У 86% выяўлена такая важная для настаўніка характарыстыка, зьвязаная з тыпам нэрвовай дзейнасьці, як здольнасьць супераджываць, падладжвацца пад суразмоўніка. 72% найлепшых настаўнікаў валодаюць здольнасьцямі эмацыйнай ураўнаважанасьці ў стрэсавай сытуацыі. «Як правіла, лічыцца, што настаўнікі — затарганыя, нэрвовыя людзі. Аказваецца, што гэта зусім ня так», — адзначае С.Сагайдак. Дарэчы, на тэстах адным з самых ураўнаважаных выявіўся настаўнік фізкультуры.

Але самым сур'ёзным выпрабаваньнем стала абарона сваёй канцэпцыі, свайго адукацыйнага праекту. З.Вінаградава, напрыклад, паставіла пад сумнеў неабходнасьць двухузроўневага вывучэньня гісторыі ў школе (паверхоўнае знаёмства ў 5—6-й клясе і больш глыбокае вывучэньне пазьней). «Кажу з пазыцыі практыка: я 14 гадоў б'юся над гэтым прадметам, а вынік усё адно застаецца мізэрным. Таму я і прыйшла да думкі, што трэба нешта мяняць», — казала лагойская выкладчыца.

## Унікальны настаўнік працы

Настаўнік працоўнага выхаваньня са Жлобіна Віталь Гузаў да апошняга моманту трымаўся ў фаварытах конкурсу. Толькі ў апошні дзень ён саступіў І.Якіменку. Для яго конкурс на званьне найлепшага настаўніка быў, у першую чаргу, магчымасьцю пазнаёміць вялізнае кола настаўнікаў са сваім адукацыйным праектам: «Мой праект накіраваны на тых вучняў, якія ня маюць шанцаў быць запатрабаванымі ў профільных клясах — матэматычныя, гуманітарныя. Для іх шанец стаць асобай у школе, атрымаць спэцыяльнасьць — тэхналягічны профіль. Сродкі працоўнага навучаньня — ня толькі малаток і піла, але і праектаваньне, выхад на нейкі іншы ўзровень мысьленьня. Ёсьць людзі, моцныя ў матэматыцы альбо ў гуманітарнай сфэры, а мы — інтэлектуалы ў тэхналягічнай галіне. Тое, што робіць мае дзеці, ня робіць іншыя! І такое дзіця адчувае сябе рэалізаванай асобай». На думку В.Гузава, клясы тэхналягічнага профілю ня толькі дапамагаюць самарэалізавацца тым, хто не трапляе ні ў матэматыкі, ні ў гуманітарыі, — яны яшчэ і даюць немалы прыбытак школе: выробленыя дзецьмі дзяржаньні для рыдлёвак, услончыкі й г.д. можна выкарыстоўваць як у самой школе, так і на продаж. «Мы ня плацім дзецям, бо для іх платай за вырабы ёсьць магчымасьць атрымаць практычныя веды й навыкі. Але ў нашай школе шмат розных конкурсаў, дзе яны могуць праявіць сваё майстэрства і атрымаць прыз, куплены школай за тыя зробленыя грошы». Слушнасьць сваіх меркаваньняў Гузаў пацьвярджае тым, што на паступленьне ў ягоныя тэхналягічныя клясы існуе конкурс, у якім удзельнічаюць вучні з усяго Жлобіна, а прыбыткі для школы вылічваюцца мільёнамі рублёў.

Абарона праекту — сапраўды ці ня самы важны этап у конкурсе. В.Гузаў упэўнены, што ўсе прадстаўленыя канцэпцыі мусяць пашырацца праз Мінадукацыі: «Для гэтага і павінен праводзіцца конкурс! Вядома, спэцыялісты павінны вывучыць іх, разгледзець, а потым распаўсюджваць для ўкараненьня».

Пакуль жа настаўнікаў чакае толькі ўрачыстая цырымонія з узнагароджваньнем 1 кастрычніка.

**Аркадзь Шанскі**




**У сучасным сьвеце без кампутара і не павярнісе. Ігар Якіменка, настаўнік інфарматыкі з Магілёва, выбраны найлепшым настаўнікам году.**

### Рысы найлепшага настаўніка

1 – гармонія лягічнага і вобразнага мысьленьня, разьвітая інтуіцыя

2 – уменьне слухаць, супераджываць

3 – мабільнасьць, уменьне хутка рэагаваць на зьмену сытуацыі

4 – сыстэмнасьць, грунтоўнасьць

5 – эмацыйная ўраўнаважанасьць

6 – асьцярожнасьць, узважанасьць у прыняцьці рашэньняў




ЭПОХА

# Народ узяўся за пяро

Адметная гісторыя здарылася ў Шклове, на радзіме Аляксандра Лукашэнкі. Раённая газэта «Ўдарны фронт» 18 верасьня зьмясьціла верш за подпісам «вэтэрана працы Барыса Касьцюка», што прыйшоў па пошце. Толькі пасьля надрукаваньня разгледзелі, што зьмешчаны твор — акраверш: першыя літары ў кожным радку ствараюць адмысловае выказваньне. Аўтара твору знайсьці не ўдалося, бо нават капэрту з-пад вершу ўжо выкінулі.

Віна за публікацыю была ўскладзена на Ніну Буйніцкую, якая замяшчала галоўнага рэдактара «Ўдарнага фронту» і падпісала газэту ў друк. Гэтую жанчыну ўжо звольнілі з працы.

Хоць, магчыма, першыя літары ў вершы, поўным шчырай любові да гаранта стабільнасьці, супалі і выпадкова:

Шагаем твердо и спокойно
Единой, правильной тропой.
Нас не затронут бури, войны,
Когда есть Президент такой!

Што да мастацкіх вартасьцяў, дык пра іх выразна сьведчыць абыгрываньне клясычнага «О Беларусь, мая шыпшына!»:

О Беларусь, моя страна!
Услышь ты сердца ясный зов.
Будь мудрой, как всегда была.
И не забудь отцов!
И если правда в мире есть,
Цветущий сад мы сохраним.
А без него зачем нам жить?

Публікацыя акравершаў як спосаб пратэсту ў Беларусі культывуецца з даўніх часоў. Пры канцы 80-х у гарадзенскай газэце паэт Андрэй Пяткевіч надрукаваў «бяскрыўдныя» пэйзажны вершык, дзе першыя літары ў радках стваралі антысавецкае выказваньне. А ў сталінскія часы хрэстаматыйны верш з хвалою партыі ў газэце на Далёкім Усходзе, дзе акраверш чыталася «Худая вош», надрукаваў Алесь Александровіч.

**АШ**




**Віна за публікацыю была ўскладзена на Ніну Буйніцкую, якая замяшчала галоўнага рэдактара «Ўдарнага фронту» і падпісала газэту ў друк. Гэтую жанчыну ўжо звольнілі з працы.**

ШОК

# Спынены выхад «Рэгіянальнай газэты»

Працяг са старонкі 1.

У рэдакцыі «РГ» нечаканым прыпыненьнем газэты шакаваны. Ніякіх намёкаў, што такое можа здарыцца, не было. Што да разыходжаньня рэгістрацыйных зьвестак з выходнымі, рэдактар прызнае, што несупадзеньне частаты выхаду сапраўды мела месца. Больш за тое, пры рэгістрацыі «РГ» супрацоўнікі міністэрства самі параілі заснавальнікам запісаць сямідзённы выхад: маўляў, пасьля гэта прыдасца, калі пачнецца частшэй выдавацца. Бо раней ніхто на гэта не зважаў, і такую ж пэрыядычнасьць «на выраст» заяўлялі многія выданьні. Чаму замест таго, каб даць магчымасьць выправіць памылку, міністэрства застасавала больш радыкальны мэтад, закрыўшы газэту?

Што да парушэньня, зьвязанага з распаўсюджваньнем «РГ» на тэрыторыі рэгіёну, а не краіны, тут увогуле лухта. «РГ» унесена ў каталёгі падпіскі для ўсёй Беларусі. Карацей, прычэпкі.

Як мяркуюць у рэдакцыі, магчыма, сапраўдным штуршком да дзеяньняў Міністэрства інфармацыі стаў надаўні артыкул, прысьвечаны перадвыбарным змаганьням у Чысьці. Але ён ня выклікаў яскрава адмоўнай рэакцыі ўладаў, і таму пэўнасьці з гэтым няма. Нельга сказаць, што «РГ» мела канфліктныя ўзаемаадносіны зь дзяржструктурамі.

Восем вэртыкаляў, кажуць супрацоўнікі, — восем розных тыпаў адносін. Ад дзелавых да канфліктных, бо ўсё залежыць ад характару таго ці іншага чыноўніка, які можа ўспрымаць крытыку, а можа рэагаваць на яе неадэкватна.

Вось у газэце зьявіўся ліст чытача з крытыкай сыстэмы мэдычнага абслугоўваньня ў Ашмянскім раёне ды са станоўчымі характарыстыкамі тае самае сыстэмы ў суседнім Смаргонскім (дзе чытача вылечылі). Ашмянскія ўлады крыўдуюць да гэтае пары!

Але адносна прычын прыпыненьня выхаду ў Маладэчне выказваюць такую гіпотэзу. «РГ» ня мела канфліктаў з уладамі сёньня, але патэнцыйна яна магла перашкаджаць рэжыму, бо па сваёй сутнасьці не пасавала да створанай дзяржаўнай структуры. Беларускамоўная, незалежная, параўнальна пасьпяховая камэрцыйна і аднаназначна папулярная на гістарычнай Віленшчыне, яна не магла не выклікаць падазрэньняў.



**Аляксандар Манцэвіч з сумам праглядае падшыўку «Рэгіянальнай газэты».**

Рэдакцыя «РГ» сыходзіць у трохмесячны адпачынак. Ці зможа «Рэгіянальная газэта» ачуняць ад такога ўдару? Рэдактар ня схільны да пэсымізму. Тры месяцы перапынку, як кажуць у рэдакцыі, дадуць магчымасьць зьмяніць газэту. Аднак будзе страчана сувязь з падпісчыкамі й рэклямадаўцамі, і аднаўляць газэту прыйдзецца з нуля.

**Сяргей Прытыцкі,
Маладэчна**

## Выставы

### Польскі малюнак

У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі экспануецца выстава «Польскі малюнак і графіка першай паловы XX ст.» са збору Нацыянальнага музэю ў Варшаве. На выставе паказаны работы 45 польскіх графікаў — ад сымбалізму і мадэрну пачатку стагодзьдзя да авангарду 1918—1939 г. — творы Станіслава Высьпяньскага, Яна Станіслаўскага, Фэрдынанда Рушчыца, Вітольда Вайткевіча ды іншых. Выстава працуе **да 2 лістапада**. Квіткі: 2000.

### Мэдыцына і энэргетыка-2004

12-я Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Мэдыцына-2004» працуе **з 5 да 8 кастрычніка** ў выставачным павільёне на пр.Машэрава, 14. У рамках выставы адбудуцца салёны «Здароўе, прыгажосьць, інтым» і «Няхай ежа стане тваёй мэдыцынай...». Гэтымі ж днямі ў выставачным павільёне на Я.Купалы, 27 адбудзецца 9-я Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Энэргетыка. Экалёгія. Энэргазахаваньне. Электра-2004». Традыцыйна ў рамках выставы адбудзецца 9-ы Беларускі энэргетычны і экалягічны кангрэс.

## Тэатры

### Опэра

**30** (чц) — «Хаваншчына».
**2** (сб) — «Мадам Батэрфляй».
**3** (ндз) — «Пітэр Пэн».
**7** (чц) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**9** (сб) — «Царская нявеста».
**10** (ндз) — «Вясельле Фігара».

### Сучасны мастацкі тэатар

**2** (сб) — «Мяшчанскае вясельле».
**8** (пт) — «Француская тайна амэрыканскага палкоўніка».
**9** (сб) — «Жорж Дандэн, альбо Падмануты муж».

### Моладзевы тэатар

**30** (чц) — «Хітрамудрая заказаная».

### Тэатар імя Горкага

**30** (чц) — «Анджэла і іншыя».

### Тэатар беларускай драматургіі

**30** (чц) — «П'емонцкі зьвер».

### Заля камэрнай музыкі

**2** (сб) — канцэрт камэрнай музыкі.
**4** (пн) — фартэпіянныя і вакальныя творы кампазытара У.Задзерацкага.
**8** (пт) — вечар украінскай фартэпіяннай музыкі.

### Палац Рэспублікі

**9** (сб). 19.00 — прэзэнтацыя альбому гурту «Majo Blues» «Against the Destiny» пры ўдзеле гурту «Мадэра хард-блюз».

### К/з «Менск»

**3** (ндз), 19.00 — група «Корні» з канцэртам «На вякі». Квіткі: 16000 — 76000 руб.
**9** (сб), 19.00 — «Начныя снайпэры». Квіткі: 20000 — 60000 руб.
**10** (ндз), 19.00 — «Сакрэт» і «Пікнік». Квіткі: 18000 — 50000 руб.

## Менская кінаафіша з 1 да 3 кастрычніка

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Вакол сьвету за 80 дзён» (прэм'ера): **1—3** (пт—ндз) 16.10, 18.30, 20.50.
«Шырокім крокам»***: **1** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **2, 3** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Шрэк-2»: **1** (пт) 17.00, 21.15; **2, 3** (сб, ндз) 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.15.
«Модная мамачка»: **1—3** (пт—ндз) 19.00.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Эўратур»***: **1** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **2** (сб) 18.00, 20.00; **3** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Вакол сьвету за 80 дзён» (прэм'ера): **1** (пт) 16.00, 21.00; **2, 3** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.30, 21.00.
«Дунечка» (прэм'ера): **1** (пт) 18.10.

**«Масква»** (223-27-10)
«Вакол сьвету за 80 дзён» (прэм'ера): **1** (пт) 16.40, 18.50, 21.00; **2, 3** (сб, ндз) 14.30 (іл), 16.40, 18.50, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)
«Шырокім крокам»***: **1** (пт) 18.20, 20.20; **2, 3** (пт, сб) 16.00, 18.20, 20.20.
«Наталі»***: **1—3** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
«Шрэк-2»: **1** (пт) 15.00, 19.00; **2, 3** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 19.00.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Модная мамачка»: **1** (пт) 16.10, 18.40, 21.10; **2, 3** (сб, ндз) 13.45, 16.10 (іл), 18.40, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Законы прывабнасьці»: **1** (пт) 19.00, 21.00, **2, 3** (сб, ндз) 15.00, 19.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Весьягонская ваўчыца» (прэм'ера): **1** (пт) 11.00, 15.00, 19.00; **2, 3** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.00, 19.00.
«Эўратур»***: **1** (пт) 13.00, 21.00; **2, 3** (сб, ндз) 13.00, 17.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Клюбнае жыцьцё

### Рэактар (288-61-60)

**1** (пт), 19.00 — «Крамбамбуля»: «Любімыя і новыя песьні».
**8** (пт), 18.00 — канцэрт «Памяці музыкі, што загінуў, прысьвячаецца...». Квіткі: 8000 (папярэдне), 9000 (у дзень канцэрту).

### Графіці (671-58-65)

**6** (ср), 20.00 — вечар джазу. Антон Боеў і група «Atava» (funk-fusion-jazz).

### Bronx (288-10-61, velcom: 103 і 105)

**30** (чц), 22.00 — клюбны FUNK-чацьвер: dj DeNeeZ (Klaipeda, LT).
**1** (пт), 22.00 — live jazz.

### Белая Вежа (284-69-22, 239-16-00)

**30** (чц), 24.00 — «White Tower Party»: dj Top, dj Bergamo.
**1** (пт), 24.00 — дыскатэка «Euroclub»: dj Mixell, go-go.

### Гудвін (226-13-06)

**30** (чц), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джазквартэт.
**1** (пт), 21.00 — жывая музыка.

### Бліндаж (219-00-10, 671-58-65)

**30** (чц), 23.00 — dj Egor.

### X-Ray (223-93-55)

**1** (пт), 22.00 — dj-bar.

## Для дзяцей

### Тэатар юнага гледача

**1** (пт), 18.00 — «Тарас на Парнасе». (З 14 гадоў.)
**2** (сб), **3** (ндз), 15.00, **10** (ндз), 11.00 — «Залатое сэрцайка». (З 5 гадоў.)
**5** (аўт), **6** (ср), 18.00 — «Пагалнага нораву варты плён». (З 14 гадоў.)
**7** (чц), 14.00 — «Шлях на Бэтлеем». (З 7 гадоў.)
**7** (чц), 19.00 — «Апошняя дуэль». (З 15 гадоў.)
**8** (пт), 16.00 — «Маленькі лорд Фаўнтлерой». (З 9 гадоў.)
**9** (сб), 11.00, 14.00 — «Сястра мая Русалачка». (З 10 гадоў.)
**10** (ндз), 14.00 — «Паліяна». (З 9 гадоў.)

### Сучасны мастацкі тэатар

**3** (ндз) — «Усе хлопчыкі — дурні».
**10** (ндз) — «Малыш і Карлсан».

### Кіно

**«Аўрора»**
«Тайна Заборскага віру»: **1—3** (пт—ндз) 14.30.
**«Берасьце»**
«Эліна, нібы мяне і не было»: **1** (пт) 15.00; **2, 3** (сб, ндз) 11.30.
**«Дружба»**
«Курыныя ўцёкі»: **1** (пт) 12.00; **2, 3** (сб, ндз) 11.00.
«Лебядзінае возера»: **1** (пт) 14.00; **2, 3** (сб, ндз) 13.00
**«Піянер»**
«Зачараваная Эла»: **1** (пт) 12.30, 17.00; **2, 3** (сб, ндз) 13.00, 17.00.
«Скарб»: **1** (пт) 14.30.
«Пітэр Пэн у Нідзелянды»: **2, 3** (сб, ндз) 11.00.




**«Лепшыя і новыя песьні» можна пачуць у Палацы культуры вэтэранаў (Я.Купалы, 21). Пачатак а 19-й. Квіткі — 6—10 тыс. Т.: 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74**

**Радыё Свабода** www.svaboda.org

**Новы расклад** (панядзелак – субота)

| | |
|---|---|
| 07:00–08:00 | Новы дзень |
| 18:00 | Падзеі дня |
| 18:30 | Тэматычныя перадачы |
| 19:00 | Падзеі дня |
| 19:30 | Тэматычныя перадачы |
| 20:00 | Падзеі дня |
| 20:30 | Тэматычныя перадачы |
| 21:00 | Вынікі дня |
| 21:30 | Тэматычныя перадачы |
| 22:00 | Вынікі дня |
| 22:30 | Тэматычныя перадачы |
| 23:00 | Вынікі дня |
| 23:30 | Тэматычныя перадачы |
| 06:00 | Вынікі дня (паўтор 23:00) |
| 06:30 | Тэматычныя перадачы |

Падзеі дня ў жывым эфіры, выпускі навінаў – кожныя 15 хвілін, у нядзелю – тэматычныя перадачы на кароткіх і сярэдніх хвалях і ў інтэрнэце

**Выбірайце «Свабоду»!**

КІНО Ў МЕНСКУ

# Арлекіна захапляецца ваўчыцаю

Мікалай Салаўцоў раней здымаў навукова-папулярныя фільмы пра жывёл. «Весьягонская ваўчыца» — ігравая карціна Салаўцова. Хаця паўсюль пазначаецца, што гэта драма і нават трылер, фільм — экалягічная мэлядрама з дыдактычным фіналам.

Ваўкаваты паляўнічы Ягор высочвае ваўчыцу, якая тэрарызуе вёску. Але ваўчыца не забітая, і герой спрабуе ўтаймаваць лясную жыхарку, пасадзіўшы яе на ланцуг. Паміж паляўнічым і ваўчыцай расьце каханьне й нянавісьць са сцэнамі рэўнасьці й задушэўнымі размовамі. Вяскоўцы падазраюць паляўнічага ў ваўкалацтве, а шэрая драпежніца дае прыплод ваўчанятак (самыя фотагенічныя істоты ў карціне).

Для беларускіх гледачоў фільм цікавы ўжо тым, што ў ім іграюць акторы Ўладзімер Гасьцюхін і Алег Фамін. Калі вобраз чырванатварага і гарластага суседа-злыдня для Гасьцюхіна невынаходлівы, то Алег Фамін, вядомы маргінальным і бунтоўным Арлекіна, вылучаецца.

Падчас здымак Фамін паўгоду кантактаваў з ваўкамі, і яны яго нават пакусалі. Герой Фаміна ўсё болей зьвярэе ў дачыненьні да людзей і прасякаецца ўсё больш пяшчотнымі пачуцьцямі да дзікай прыроды. Безнадзейнасьць каханьня падкрэсьліваецца сантымэнтальнаю музыкай Яўгена Догі (які таксама быў кампазытарам у кінафільме «Мой ласкавы й пяшчотны зьвер»).

Крытык Сяргей Кудраўцаў лічыць, што фільм намякае на ўтаймаваньне бунтоўнай Чачэніі. Карціна будзе карысная разгубленым паляўнічым, лесьнікам і прыхільнікам творчасьці Алега Фаміна.

**Андрэй Расінскі**

«Весьягонская ваўчыца» («Весьегонская волчица»)
Расея, 2003, каляровы, 102 хв.
**Жанр:** экалягічная мэлядрама
**Адзнака:** 4,5 (з 10)



## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Анішчанка Я. Імем Айчыны:** Дакумэнты паўстаньня 1794 г. у Літоўскай правінцыі. — Менск: Выд-ц Хурсік, 2004. — 236 с. 150 ас.

Асноўная частка дакумэнтальных крыніц, апублікаваных у другім томе сэрыі, была адшуканая ўкладальнікам выданьня ў Расейскім ваенна-гістарычным архіве ў Маскве, у асабістай калекцыі папер М.К.Агінскага. Яны падрабязна асьвятляюць рэйд М.К.Агінскага на Дынабург і змаганьне корпусу К.Серакоўскага з А.Суворавым на Берасьцейшчыне. Пытайцеся ў «Акадэмкнізе».

**Марчук Г. Кветкі правінцыі:** Раман, навэлы, афарызмы. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 416 с. — (Беларуская проза XX ст.). 2000 ас.

У кнігу выбранага ўвайшлі аднайменны раман, навэлы «Хаос», давыдгарадоцкія каноны й афарызмы.

**Сахарчук В. Мой вечны бор:** Вершы, пераклады. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 141 с. 1200 ас.

Акрамя аўтарскіх вершаў, зборнік склалі мастацкія пераклады з ангельскай (Э.По, «Крук»), баўгарскай, расейскай ды ўкраінскай моваў.

**Тычына З. Сны й снабачаньні Яна Баршчэўскага:** Манаграфія. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 92 с. 200 ас.

Манаграфія мае на мэце разгледзець праявы «калектыўнага несьвядомага» беларусаў у творах Яна Баршчэўскага — аўтара, які пачаў актыўна выкарыстоўваць прыём снабачаньня ў мастацкай творчасьці.

**Тэксты**: Літаратурна-мастацкі праект. — 2004. — №1. — 176 с. 299 ас.

Праект удзельнікаў суполкі «Schmerzwerk». У першым нумары друкуюцца тэксты З.Вішнёва (рэдактар выданьня), І.Сіна, Ю.Барысевіча, А.Бахарэвіча, С.Мінскевіча, І.Сідарука, В.Акудовіча, Л.Вольскага, З.Серабракова.

**Тычына М. Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мысьленьня** / НАН Беларусі; Ін-т літ. імя Я.Купалы. — 2-е выд., выпр. і дап. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 168 с. 1500 ас.

У даўняй кнізе знанага беларускага літаратуразнаўца (першае выданьне дасьледаваньня выйшла ў 1973 г.) разглядаюцца фэномэн мастацкага мысьленьня й шляхі, якімі пісьменьнік ператварае факт жыцьця ў факт мастацтва.

**Украінка Леся. Мэлёдыі журбы і надзеі:** Вершы і паэмы / Укл. В.Жуковіч, В.Стралко. — Менск: Кавалер Паблішэрс, 2003. — 128 с.: іл. 500 ас.

Дзякуючы працы М.Аўрамчыка, Н.Гілевіча, С.Грахоўскага, Н.Мацяш і інш. гучаць па-беларуску лірычныя цыклы «Мэлёдыі», «Сьлёзы-пэрлы», «Сем струнаў», творы, прысьвечаныя Сяргею Мяржынскаму — каханаму паэткі. У зборніку друкуецца таксама паэма «Апантаная», якую Леся Ўкраінка напісала ў Менску. Шукайце ў «Акадэмкнізе». Цана 3100 руб.

**Беларусь: нераскрытыя злачынствы найноўшай гісторыі.** — Менск, 2004. 32 с.

**Шахматы-плюс.** Незалежнае інфармацыйна-асьветніцкае выданьне. №2(3), чэрвень 2004. — Менск. — 64 с.

**Другі і трэці з'езды беларусаў свету.** Матэрыялы і дакументы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 372 с.

**Брест: Путешествие сквозь века** / Сост.И.Лавровская, А.Кондак. — Брест, 2004. 1900 ас.

Прысьвечаная гісторыі Берасьця й багата ілюстраваная гербамі старажытных мясцовых родаў, гравюрамі, жывапісам, выявамі архітэктурных помнікаў XVII—XIX ст., гэтая брашура зьмяшчае тэксты на расейскай і ангельскай мовах.

**Владимир Мулявин: Нота судьбы** / Ред.-сост. Л.Крушинская. — Минск: Мастацкая літаратура, 2004. — 446 с.: ил. 3000 ас.

«Нота лёсу» — праект маштабны: тут сабраны выказваньні дзясяткаў асобаў, у тым ліку найбуйнейшых палітычных ды рэлігійных дзеячоў Беларусі, а таксама вядомых музыкаў, мастакоў, літаратараў, артыстаў (А.Пахмутавай, М.Фінбэрга, Э.Ханка, Я.Паплаўскай і інш.). Большасьць сабраных матэрыялаў — эксклюзіўныя, нязначная частка — перадрукоўкі з пэрыёдыкі. Стварэньне «Песьняроў», гісторыя напісаньня песень, выступы й гастролі ў Беларусі й за мяжою, Мулявін як чалавек, музыка, сьпявак — усё гэта знайшло сваё адлюстраваньне ў зборніку. У выданьні друкуецца вялікая колькасьць фатаздымкаў і дадатак-падсумаваньне — «Даты жыцьця й творчасьці Мулявіна».

**Тацяна Вабішчэвіч**

## Юзік ДЗЕНІСЮК

* * *

У баразьне, нібы ў акопе,
Сяджу я восеньню штогод.
Калі краіна — цэнтр Эўропы,
То пуп Зямлі — мой агарод.
З красавіка да лістапада,
Сьвянцоны ранішняй расой,
Я танчу тут сваю лямбаду
З рыдлёўкай, сошкай і касой.
На вішнях ўзбоч шпакі-музыкі —
Мой хатні джазавы аркестар.
Свае тут ёсьць «зэмфіры», «лікі» —
Ня горш, чым той славянскі фэст.
І грошай зь іх ніхто ня просіць:
За жменю вішняў ўражыць так,
Што затанцуеш нават босы
І крыжачок, і кракавяк.
І вяне-сохне пустазельле,
І бульба прэ, як на дражджах.
Гарбуз усьпёрся на арэлі
Ды аглядае ураджай.
А жонка з сынам лічаць «гранты»:
— Прадаць — купіць, купіць — прадаць,
Падатак заплаціць «Гаранту»,
Страхоўку за зямлю аддаць.
Набыць брыкет і дроў на зіму —
Ужо дазвол даў сельсавет...
А ў сына самы лепшы стымул —
Купіць складанчык-лісапед.
І вось вясна. Я зноў ў акопе.
А мара, як заўжды, адна:
Калі патрапіць ў створ Эўропы
Крывая наша баразна?

## Кацярына БАГУМІЛАВА, 13 гадоў

### Маленькая радзіма

Вельмі люблю Заслаўе я,
Тут усе людзі — адна сям'я.
Мой горад — сымбаль маладосьці,
Яшчэ і сымбаль прыгажосьці.
Навокал паглядзіце вы,
Колькі ў небе сінявы,
Колькі навокал кветак,
Колькі маленькіх дзетак!..
Заслаўе старажытным толькі завецца,
Бо сіла зь яго ключом б'ецца.
Горад мой, будзь шчасьлівы заўсёды,
Хай ідуць міма кепскія годы,
А мы табе ў гэтым дапаможам,
Зробім, што зможам.
Цьвіці, мой горад радзімы,
Бо ты ў мяне адзіны.

## Дзяніс БУШКОЎ

### Марнае каханьне

Сэрца трапяткое —
Звонку хваляваньне.
Я не разгубіўся —
Марнае каханьне.
Сэрца трапяткое
Хутка астывае.
Я не разгубіўся,
Проста так бывае.
Сэрца адпачынку
Ўсё жыцьцё чакае.
Марнае каханьне
Недзе там блукае.



СЯРГЕЙ БАЛЯНОК. «БАДЗЯЖНЫ МОСТ»

## Алесь ГУБІН

* * *

Па шчаках вада — я любіў, любіў,
Я ня збочу, не.
Проста мала сіл.
Проста ў цёмны кут завяла бяда,
Лютавала ноч.
За сьпінай нуда.
Што, самота, сьпіш — зноў мяне ў віне?
Унясі журбу
На ліхім кані.
Расьцярушу сум — срэбрам льюць сьнягі,
Стане кожны дзень
Прагна дарагім.
Дай мне, Божа, кроў,
Што мацней за сьмерць,
Каб любіць і жыць
Ды, згарая, грэць.

## ТАНКІ

### Чорны Война

Зноў капыты на ссохлай зямлі.
Прэч чаканьне. Хачу ўсё адразу.
Я — апошні, хто ў гэтыя дні
Сумняецца ў паразе.

Ноч сумленьне абудзіць у сьне,
Калі словы здаюцца маўчаньнем.
Кожны сон твой ратуе мяне
Ад адчаю да раньня.

Запацелае неба маўчыць.
Стогн зьнямогі зглытну ссохлым ротам.
Ты ня зможаш мяне навучыць
Заставацца на потым.

Гэта вольніца праўды ў крыві.
Гэта хваля накрые самога.
Выклік зграі — і сьвет як прывід.
Па-за мной. Па-за Богам.

## Sany DRAGONFLY

### Апэльсынава–журавінавы верш

Я ўсе усьмешкі падлічыла —
Сёньня ён мяне сустрэне.
Як невыносна немагчыма
Стрэсьці зь веек ачмурэньне!..
Абрубкамі у сьне хістаю —
Ты мне зьнімеш швы са сьпіны.
Я ўжо нясмачная, пустая
Корка ад апэльсына.
Адчай — у скураныя стужкі,
Вусны — да тваіх апалінаў,
Абтрэсла крылы на падушкі...
Не, я ня плачу! Я...
...Я — нясмачная...
Коркай апэльсынавай.
Ратуй, каханы!
Ратуй!.. Толькі ты памятаў:
Я ж была журавінамі.

## Алеся ЗЫГМАНТОВІЧ

* * *

Калі і як зьявіліся
Ў маім жыцьці —
Не зразумела я.
Чаму цяпер у вочы
Ціхія, як плынь,
Гляджу нясьмела я?
Чаму шукаю словы
Добрыя і сьціплыя?
Чаму не разумееце Вы іх —
Дасьціпныя?
Не спакушайце чыстую душу.
Яна кахае й каханай будзе
Назаўсёды.
А Вы — лепш добрым сябрам
Будзьце ёй — прашу,
І не шукайце з д'яблам згоды.

## Мікалай ІЛЬЮЧЫК

### Курапаты

З пустых вачніцаў сьлёзы не цякуць,
Але ж глядзяць яны у нашы душы.
Няхай сабе гады і дні ідуць,
Каменьне ў сэрцах нашых хай парушаць.

І з спрэхлых костак ўжо жыцьцё не адрадзіць,
Ім не баліць ужо: там добра, на нябёсах,
Хай ў нашых чэрствых душах засьвярбіць,
Хай думкі пераменяць Курапатаў сосны.

Правалы у зямлі ня хутка зарастуць —
Ад страшных ранаў гэта шрамы.
Няхай заганы нашай памяці сыдуць,
Няхай адродзіцца да ўсіх ахвяр пашана.

Як здані, як прывід, панурыя крыжы,
Зьбянтэжыліся думкі, вусны у маленьні.
Пакаемся, не правядзём паміж людзьмі мяжы,
Ня будзем ставіць крыж на гонары, сумленьні.

## Барыс МАНЦЭВІЧ

### Мова маіх продкаў

Калі ты адрачэшся ад мовы сваёй,
Не відаць табе шчасьця ніколі,
Бо за родную мову плацілі крывёй
Нашы продкі ў змаганьні за волю.

Супраць чорнае зграі ліхіх маскалёў
Узьнімаў Каліноўскі атрады
І за родную мову на бітву павёў
Пад сьцягамі «Мужыцкае праўды».

Празь дзясяткі гадоў сьмерч ізноў зашугаў,
«Чорны воран» па хатах насіўся:
Хто за матчыну мову гарою стаяў,
У ГУЛАГах жыцьцём паплаціўся.

Хоць сягоньня за родную мову на сьмерць
Не ідуць і ня садзяць за краты,
Але зьдзекі зь яе зноў мы мусім цярпець
Ад усякіх ілжэдэмакратаў.

Не гучыць наша мова нідзе у вярхах,
Нават сорамна ў гэтым прызнацца.
Навявае яна на чыноўнікаў страх,
Калі сам прэзыдэнт стаў цурацца.

А я жыць сваёй роднаю мовай хачу,
Той, што дадзена мне ад прыроды,
Я хачу, каб усюды яе змог пачуць
Як дзяржаўную мову народу.

## Уладзімер МІСЬЦЮК

### Чарпак Мядзьведзіцы Вялікай

Сярод начных сузор'яў неба
Сем зорак склалі дзіўны знак.
Відаць, і продкам быў патрэбен
Да хлеба з квасам шчэ й чарпак.

Чарпак Мядзьведзіцы Вялікай,
Ты на сустрэчу зноў паклікаў.
І я Ўсявышняга малю:
Багаславі маю зямлю!

Пачуй яе сьвятую споведзь,
Пачуй, Сусьвету Валадар,
Былых часоў і новых повязь
І боль — Чарнобыльскі пажар.

Як дагарае сьвечкай вёска
І мова маці — Божы дар —
Нячутна ходзіць у абносках,
Што шле заходні гаспадар...

Малю цябе, Магутны Божа,
І верую: Твая Рука
На сьветлы дзень, на радасьць зможа
Праліць надзею з Чарпака!

## Леанід МІШУЦІН

### Сыны

Сыноў бацька сваіх кліча
На нараду ў хату,
«Бо карміць вас, — кажа, — дзеці,
стала цяжкавата».

І, ўздыхнуўшы, запытаўся
Кожнага ўасобку,
Кім зь іх кожны быці хоча,
Жыць якім заробкам?

Першы кажа: «Стаць банкірам
Я зь дзяцінства мару:
Падабаюцца мне вельмі
Маркі і даляры!»

Другі кажа: «Рэкетырам
Быць даўно хачу я.
З гэтай думкаю адвечнай
Днюю і начую».

Трэці кажа: «Я халуйскім
Стану дэпутатам —
Кожны дзень мой бестурботны
Будзе сытным сьвятам!»

Сын чацьвёрты: «Я ў спэцвойскі!
І як дзесьці хтосьці...
Папрацую так дубінкай —
Затрымцяць аж косьці!»

Пяты кажа: «Надаела
Марна гнуць тут сьпіну!
Я за лепшай, бацька, доляй
Зьеду на чужыну!»

А сын шосты: «Не паддамся
Абяцанкам, зману
І пад бел-чырвона-белым
Сьцягам сьмела стану!»

Камуністам быў іх бацька,
Зь ленінскім запалам!
І зьбіраўся да палякаў
Ехаць ён па сала!

## Алесь ПТАХ

### Холад

Няма куды падзецца,
Няма куды схавацца,
Згараюць нашы сэрцы
Ды замярзаюць пальцы.
Надвор'е ўжо дастала,
Мароз пячонкі круціць,
А сонца менш чым мала —
Сядзяць па хатах людзі.
Чакаем пацяпленьня,
Ўжо колькі дзён чакаем...
Бо замярзаюць пальцы
І сэрцы замярзаюць!..

## Алена РУСАКОВІЧ

### Каханаму

Цяпер усё роўна, хто быў вінаваты —
Мо ты, можа, я... Мы кагосьці клянём.
Каханьне сваё мы ўпіхнулі за краты,
За краты турмы, дзе цяпер мы жывём.
Мы позна знайшлі, што калісьці згубілі, —
Пачуцьця ня вернеш, як кадар ў кіно.
Забудзем абое, каго мы любілі,
Каханьне ня вернецца ўжо ўсё адно.
Бывай, мой каханы, ды памятай казку,
Што склалі з табой мы на справе, ўсур'ёз.
Каханьне маё ты забудзь, калі ласка,
Што ў сэрцы сваім так абачліва нёс.
І я абяцаю: цябе я забуду,
Хоць горача, прыкра цяпер на душы.
Ня будзе ні плётак, ні іншага бруду,
І раны загояцца ў мёртвай цішы.

### Чарнобыль

Усё як быццам добра тут.
Вось луг, палтак, яблынь гольле.
І ранішні птушыны крык
Таксама цешыць наваколле.
Маліны гнуцца да зямлі,
Суніцы падаюць да долу,
Ў дарожным пыле вераб'і
Сядзяць, сабраўшысь чарадою.
Клякоча бусел на гнязьдзе,
Цячэ рака, імчыць да мора,
А у яе чыстой вадзе
Начамі мноства-мноства зорак.
Лес зелянее за ракой:
Бярозкі, сосны, дуб, асіны...
Але чамусьці неспакой
Глядзіць пытліва вам у сьпіну.
Ўся вёска гэта безь людзей
Ужо даўно стаіць забытай.
Здаецца, нібы чарадзей
Зачараваў тут ўсе сядзібы.
Ды толькі не — Чарнобыль тут,
Свае ён крылы распраўляе,
А ад нявыцерпных пакут
Ў бальніцы хлопчык памірае...
Нямала часу ўжо прайшло,
Жыць зноўку хочацца тут людзям,
Ды добра ўсё не зажыло.
Чарнобыль. Чарнаёсьць!
Чарнабудзе?

# Сучаснікі

Адам Глёбус

## 2004. Барадулін і паэты

У таксоўкі глухне рухавік. На скрыжаваньні глухне. Даводзіцца разьлічвацца і выходзіць. Даводзіцца выходзіць каля Рыгора Барадуліна. Вітаюся: «Як Вы, Рыгор Іванавіч?» — «Кепска, зусім. Бок баліць». Тое, што кепска нашаму народнаму паэту, я адразу бачу. Ледзь ідзе наш дзядзька Рыгор: «Як там Сыс?» — «Тэлефанаваў. Хацеў сустрэцца, ды так і не дайшоў. Пісьмянкова ўчора пахавалі…» — «Ня змог я пайсьці. У яго ж чатыры інсульты было. Зь нітрагліцэрынай у кішэні хадзіў». — «Ён і мне скардзіўся, што сэрца цісьне. Я яму казаў, каб піць кінуў. А ён адкладаў. Вы ж, Рыгор Іванавіч, кінулі. Вось і я, на Вас гледзячы, два гады ня п'ю». — «Ня п'еш? Правільна. Трэба кідаць, калі можаш… А як там Разанаў?..» — «Цяпер ён вершы па-нямецку спрабуе пісаць». — «Германію ня зьдзівіш тымі вершамі». — «Гэта новая праява імпэрскіх амбіцый — падтрымліваць кітайцаў з расейцамі, якія спрабуюць пісаць па-француску, даваць стыпэндыі беларусу, які спрабуе складаць вершы па-нямецку. Як раней ухвалялі кіргізаў, што па-расейску раманы друкавалі…» — «Шэрман памірае…» — «Арлоў у бальніцу лёг. Валянцін Тарас у бальніцы, мама казала». — «Тарасу пасьля кропельніцы стала крышку лепей…» — «Вось тут, маё выдавецтва. Я пайду…» — «Як там Мірык?» — «Добра. Збор твораў выдае, празь які месяц выйдзе…» — «Маме паклон». — «Перадам. І Вашым усім прывітаньне». — «Ага…» Дзядзька… не… старэнькі дзядок, наш Барадулін, панёс сваю чырвоную блазнаватую кепку да наступнага скрыжаваньня, а я на працу пайшоў.

27.04.2004, 12:57



АЛЕНА АДАМЧЫК

## 2004. Галаванаў і акварыюм

У панядзелак… Цяжкі дзень — панядзелак. Хадзіў на прыём да міністра юстыцыі — Галаванава. Запрасілі, прыйшоў. Чаму не схадзіць да міністра, калі клічуць, а не выклікаюць? Ну і што з таго, што давялося чакаць у прыёмнай? Сеў сабе ў скураны фатэль і разглядаў акварыюм з крыштальнай вадою. Шарыкі імклівага паветра бягуцьуздымаюцца за чысьцюткім шклом. Канечне, каб у міністэрскім акварыюме былі рыбы, ці трытоны, ці хоць бы жабка якая, чакаць было б весялей. Нішто так не супакойвае маю душу, як доўгае назіраньне за маўклівымі рухамі акварыюмнай рыбкі. Яе, чароўнай рыбкі, не было. Спачатку я спадзяваўся, што які-небудзь сомік ці рак схаваўся за камень. Марныя спадзевы. Пытацца ў Галаванава, чаму ў ягоным акварыюме няма рыбак, я ня стаў. Нетактоўна. Дый запрашалі мяне ў міністэрства не пра акварыюмную рыбку разважаць, а каб пагаварыць пра захаваньне і аднаўленьне культурна-гістарычных і ляндшафтных помнікаў.

22.06.2004, 11:43

## 2004. Маскоўскі таксоўшчык і вэнджаныя вугры

«Менск? Быў я ў вашым Менску. Дзевак вазіў, — шафёр-таксоўшчык пахіхіквае. — Спынілі яны мяне на Цьвярской. «Нам да Менску!» Там хутчэй дайсьці, чым даехаць. Мне што? Вязу! Вось і «Менск». Стаў я каля гатэлю. «Нам не гатэль, а горад трэба». — «А грошы?» Дастае адна «прэс» — тысяч зь дзесяць, а мо і пятнаццаць. Дамовіліся: за 100 км па 100 баксаў. Выставіў я нуль на лічыльніку і пагнаў. Ну, а дзеўкі — проста сьмех, ім па гадоў 16—17, шорты, футболкі, сумкі просьценькія. Піва набралі і вугроў вэнджаных. Напіліся, наеліся і праз кожныя 20 хвілін да ветру лёталі, а потым ім шашлыка захацелася… Да Менску ехалі 14 гадзін. А яшчэ нас на мяжы тармазнулі, страхоўку прымусілі купляць і за дарогі плаціць. Пасажыркі мае — ня простыя дзеўкі. Адна сказала, што яе бацька — правая рука (…). У Менску мы заехалі ў нейкі здаравенны асабняк, а там аховы няма. «У вас што, не ахоўваюць правую руку (…)?» — «(…)!!!» — «Зразумеў». Яны мне прапанавалі адпачыць і павезьці іх на дыскатэку ў Варшаву. Адмовіўся і праз 7 гадзін быў у Маскве».

19.04.2004, 12:45

## Караткевіч і марнатраўства

Караткевіч змарнаваў шмат сілаў і часу на экранізацыі і тэатральныя пастаноўкі сваіх твораў. Ягонае пакаленьне проста згарэла ў кіназалях і на здымачных пляцоўках, як маё пакаленьне згарэла на тэлебачаньні, а пакаленьне маіх дзяцей гарыць ясным полымем у Інтэрнэце. У кожнага пакаленьня свае забаўкі, свае ловы ветру, сваё марнатраўства часу.

## Караткевіч і постмадэрнізм

Для мяне сам тэкст — рэальнасьць. Раманы, вершы, аповесьці Ўладзімера Караткевіча — рэальнасьць. Дзядзька Валодзя — рэальнасьць. Для мяне не існуе гісторыі як асобнай навукі. Ёсьць гісторыя літаратуры, гісторыя матэматыкі, гісторыя мастацтва, гісторыя культуры і гісторыя вайны, то бок бескультур'я. Найважнейшым у гісторыях я лічу факты, складзеныя ў храналягічныя табліцы. Чалавек у эўрапейскай цывілізацыі падпарадкаваны ў сваіх паводзінах архітэктурнай сытуацыі, таму літаратурныя стылі ідуць усьлед за архітэктурнымі. Іх няшмат, і я пералічу: раманскі, готыка, адраджэньне, маньерызм, барока, ракако, клясыцызм, рамантызм, мадэрнізм і постмадэрнізм. Караткевіч, як і ўсе літаратары нашага часу і нашай эўрапейскай культуры, належыць да постмадэрністаў. Ніякага рэалізму, а тым больш гістарычнай рэальнасьці ў літаратуры для мяне не існуе ні ў Караткевіча, ні ў кога іншага.

## Караткевіч і чытачы

У сучасных хрэстаматыях па літаратуры шмат выдатных імёнаў і многа няякасных тэкстаў, а ўсё праз тое, што большасьць сусьветнай клясыкі перакладзена кепска. Узровень перакладчыкаў саступае ўзроўню аўтараў настолькі, што Шэкспір чытаецца горш за Крапіву. Каб выправіць абсурднае становішча, варта прыбраць з хрэстаматый перакладную літаратуру, уключаючы Гусоўскага і Баршчэўскага, а дадаць больш тэкстаў Караткевіча і сучасных беларускіх літаратараў. Такім чынам, чытачоў у Караткевіча стане больш.

4.03.2004, 15:19

## 2004. Андрэеў і тост

Стваральнік часопісу «Монолог» Лёша Андрэеў запрасіў мяне на дзень нараджэньня. Набыў я чорную люльку яму ў падарунак і прыйшоў. Пілося чырвонае віно, закусвалася сырам і вяндлінаю, гаварылася розная прыемная непатрэбшчына і патрэбная непрыемшчына, а засталася такая думка: «На свой дзень нараджэньня ты зьбіраеш тых, каго хацеў бы бачыць і ня ўбачыш на сваім пахаваньні».

24.04.2004, 13:05

## 1977. Хадыка і постмадэрнізм

Намаляваць бясконцую вязьніцу Піранэзі лепш за самога Джавані Батыста Піранэзі. Напісаць кубістычны натурморт (рэчавік) лепш за першаадкрывальнікаў кубістычнай рэальнасьці Пабла Пікаса з Жоржам Бракам. Прыдумаць райскую краіну, лепшую за краіну Дзеўсёёсьць Пітэра Брэйгеля-мужыцкага. Падобныя заданьні ставіць сваім студэнтам выкладчык архітэктурнай кампазыцыі Алег Хадыка. Ці магчыма такое зрабіць? Магчыма. Лепш за Піранэзі, за Пікаса, за Брэйгеля можна намаляваць, напісаць, прыдумаць. Студэнты захапляюцца лекцыямі і заданьнямі Хадыкі. Захапляюцца тым, што могуць рабіць лепш за вялікіх і непараўнальных майстроў мінулага. Ніхто не задумваецца над тым, што нельга зрабіць так, як рабілі майстры, — можна лепей і горай, а **так** нельга.

Пазьней пісаньне лепш за папярэднікаў аформіцца ў шырокую эстэтычную плынь і пазначыцца тэрмінам «постмадэрнізм».

P.S.

Часам танны спосаб быць разумным — іранічнае крыўляньне ды зьдзекі з цытат — прымаюцца за дасягненьні постмадэрнізму, але гэта памылковая думка. Постмадэрнізм трымаецца на словазлучэньні «лепш за папярэдніка».

3.05.2004, 13:27

## 1978. Тата і ганарар

За малюнкі ў часопісе «Маладосць» я атрымаў патроены ганарар, недзе каля чатырох інстытуцкіх стыпэндый. Праз Брэжнева, бо Ільлічу ганарары не плаціліся. Аповесьці ягоныя друкаваліся, а рублёвае ўзнагароджаньне дзялілі паміж іншымі аўтарамі. Узрадаваўся я і пахваліўся бацькам. На што тата заўважыў: «А ў мяне паўгоду не было ніякіх ганарараў, а пісьменьніку патрэбны хай самыя маленькія, але ганарары, каб не страчвалася вера ў сваю вартасьць».

26.03.2004, 16:21

## 2004. Марозава і вуха

Доктарка Марозава… Выдатнае прозьвішча для доктаркі — Марозава. Каб яна была Замарозава, было б лепш, але і Марозава ўсяляе надзею. З такімі думкамі я і зайшоў у 13-ы кабінэт. «На што будзем скардзіцца?» — «Вуха!» — «Спачатку паглядзім здаровае… Цяпер скажам… Як яно пачало балець?» — «Пачысьціў палачкай, і яно забалела». — «Цяпер падумаем і адкажам… Вуха забалела, і мы палезьлі ў яго палачкай; ці мы злазілі ў вуха палачкай, і яно забалела? Што маўчым?» — «Думаю». — «Думаць нам ня трэба, нам трэба сказаць, як было». — «Я пачысьціў вуха, і яно разбалелася». — «Ніколі ня лазім у вушы палачкамі! Ня ведаю, хто і нашто прыдумаў вушныя палачкі, ад іх больш шкоды, чым карысьці. Вуха мы прамылі. Празь дзьве гадзіны дастанем ватны тампон. Калі будзе балець, прыйдзем у суботу. І больш ніколі ня лазім у вушы палачкамі! Пальцы і вата, нічым іншым вушы ня мыем. Чуем добра?» — «Добра». — «Тады ўсё!»

23.06.2004, 23:23

**Гэтыя запісы спачатку былі выстаўлены на сайце www.litara.net. Час выстаўленьня тутака пазначаецца.**

Аляксандар Ворвуль

# Слоўнік скептыка



**Банк** — месца, дзе вам пазычаць грошы, калі вы даведзяце, што яны патрэбны ня вам.

**Банкір** — чалавек, які захоўвае чужыя грошы як свае.

**Барацьба са звычкамі** — самая шкодная са звычак.

**Бахус** — бог, у якога мала вернікаў, але шмат паклоньнікаў.

**Бацька** — дрэнная маці.

**Бацькі** — людзі, якія, дрэнна ведаючы, што такое добра, добра ведаюць, што такое дрэнна.

**Баязьлівец** — герой, у якога ёсьць жонка, дзеці і закладзены дом.

**Беламор** — легалізаваны касяк.

**Беларус** — славянскі габрэй.

**Беларусь** — рай для пэнсіянэра коштам пекла для працоўнага.

**Бесклапотнасьць** — слушны падбор антыдэпрэсантаў.

**Бізнэс малы** — вялікі бізнэс плюс крыху цярпеньня.

**Бірулька** — прылада, якая дазваляе згубіць усе ключы адначасова.

**Брат па розуме** — таварыш па няшчасьці.

**Будучнасьць** — дасканала абясшкоджаная рэчаіснасць.

**Будучыня** — час, калі справы ідуць угору, сябры — верныя, а жыцьцё — бесклапотнае.

**Бумэранг** — рэч, якую складана купіць і амаль немагчыма выкінуць.

**Бясплатнасьць** — самыя заблытаныя грашовыя адносіны ў сьвеце.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Алё, мы шукаем таленты



У сьвеце маса забаўляльных спаборніцтваў — кіданьне мабільнікаў, гонкі на ўнітазах, мачылаўка з дапамогай трактарных рысор. Аднак беларускія чыноўнікі чамусьці вырашылі насаджаць у краіне конкурсы прыгажосьці.

Тое, што конкурс прыгажосьці — прадукт заходняй (прычым далёка не элітарнай) культуры, не выклікае ніякага сумневу. Я ня памятаю, каб у часы СССР (Эдэмскага саду, якога нас пазбавілі дэмакраты-спакушальнікі) працоўныя нейкага БМУ дэманстравалі стрыптыз, выбіраючы самага прыгожага апэратара шпакляваньня.

Міністар культуры сп.Гуляка зацікаўленасьць дзяржавы ў конкурсе растлумачыў, сярод іншага, грамадзкім інтэрасам: конкурсы прыгажунь — моцная зброя ў барацьбе з такім нэгатыўным фэномэнам, як гандаль жанчынамі.

Сама ідэя змагацца з крыміналам з дапамогай дэфіле ў купальніках здаецца не такой ужо і благой, але тут Гуляку варта сёе-тое падкарэктаваць.

Адпаведна азам палітэканоміі, тавар — прадукт, задавальненьне патрабаваньня ў якім адбываецца праз акт куплі-продажу. У нашым выпадку ў якасьці тавару выступае цела фэміны, ролю спажыўца выконвае багаты шэйх, прадавец — мафіёзі. Відавочна, калі гаворка ідзе пра барацьбу з трафікам жанчын, трэба або зьнішчыць рынак (чытай — «рэвалюцыя!»), або разарваць ланцуг гандлю ў нейкім зьвяне — выклікаць у агентаў трансакцыі аблом прадаваць тавар або набываць яго.

Цяжка сказаць, чаму конкурс прыгажосьці павінен пагасіць у чукчы зь нерэнтабэльнай беларускай правінцыі жаданьне зваліць у Эміраты, разьвесьці лоха і нешта на гэтым падкалыміць. Нават за маральнае аблічча фіналістак ня дам ніякай гарантыі. Калі прыняць бацькаўскую калькуляцыю аб тым, што сярэдні заробак у РБ — 200 «грынаў», то тысячы у.а. — бонусу, які яны атрымалі за ўдзел у фінале, — хопіць на 5 месяцаў. Ну, яшчэ пару можна працягнуць, здаўшы ў камісіёнку вячэрні туалет — падарунак гаранта. А потым што — зноў гандляваць жуйкай у кіёску?

Незразумела таксама, як шоў у Палацы Рэспублікі можа паўплываць на каталёгі заходніх дылераў славянскага дрэва. Відавочна, Мінкульт разглядае шэйхаў як сэксвычварэнцаў, якія робяць каітус з карлікамі і ўпадаюць у экстаз, убачыўшы жанчыну-гермафрадыта з валасатымі грудзямі. Толькі такія перцы будуць раўнадушна калупаць у носе, гледзячы на Вольгу Антропаву ў сподняй бялізьне. Іншыя, а такіх сярод Гарун аль Рашыдаў павальная большасьць, адразу пацікавяцца — у якой краіне растуць такія Шэран Стоўны? Выратаваць конкурс 26 верасьня яшчэ магла б так званая «прыгажосьць унутранага сьвету» беларускіх герлаў. Калі б я быў султан, то не хацеў бы мець у гарэме інтэлектуалку, якая замест танцу жывата чытае лекцыю аб экзыстэнцыяльных матывах у творчасьці маладога Кафкі. Аднак інтэлектуальны дыялёг паміж сябрамі журы і канкурсанткамі («Як вы зразумееце, што перад вамі марсіянін-мужчына?» — «Па вачах») прадэманстраваў, што IQ нашых прыгажунь адпавядае патрабаваньням сусьветнага рынку.

Канстатуем: конкурс «Міс Беларусь-2004» як каварны ўдар беларускага ўраду па міжнароднай сетцы гандлю жанчынамі праваліўся. Аднак будзем аптымістычныя. У наступным годзе ўлады павінны радыкальна пераглядзець конкурсныя патрабаваньні да ўдзельніц — рост ніжэйшы за паўтара мэтра, вага большая за 100 кг, узрост больш за 50 гадоў. Дадатковы кастынг для тых, хто мае сьляды траўмаў, укусаў і пераломаў канечнасьцяў.

Толькі тады конкурс прыгажосьці сапраўды выканае сваю місію і назаўсёды адвядзе ад біялягічных рэсурсаў сінявокай хцівыя позіркі гандляроў жывым таварам.

**Лёлік Ушкін**

Рэпартаж з конкурсу — **старонка 5.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**25 верасьня ў менскім арт-клюбе «Бабілён» выбіралі «Альтэрнатыўнага міс Беларусь». Спаборніцтва травэсты праходзіла ў тры этапы: дэфіле ў вясельным строі, песьня на японскай мове і артыстычны нумар. Журы ачольваў Кірыл Слука.**

КАІСА

## «Фішэрэндам» цікавейшы за рэфэрэндум

Робэрт Фішэр знакаміты яшчэ й тым, што вынайшаў новую гульню. Дакладней, прапанаваў расстаўляць шахматныя фігуры на дошцы па-новаму — паводле жэрабя. Вынаходку, прэзэнтацыя якой адбылася ў Югаславіі ў 1996 г., назвалі «Fischerandom». У сьвеце гэтая разнавіднасьць шахмат вядома яшчэ як «Шахматы-960», бо гульцы маюць 960 варыянтаў сымэтрычнага разьмяшчэньня фігур на першай і восьмай лініях.

«Фішэрэндам» быў адразу ж удзячна прыняты супольнасьцю шахматыстаў як магчмасьць ажывіць старажытную гульню. Навінка спалучае кансэрватызм (правілы аналягічныя шахматным) і непрадказальнасьць, у значнай ступені страчаную ў сучасных матчах. Паколькі да дэбюту па кампутарнай базе ў «Фішэрэндам» падрыхтавацца нерэальна, гульцам даводзіцца імправізаваць ледзь ня зь першага ходу. Супэрграсмайстары актыўна праяўляюць сябе на новай дзялянцы: так, першынство сьвету па «Фішэрэндаму» ў 2001 г. выйграў вугорац Пэтэр Лека — той самы, які цяпер асрэчвае ва Ўладзімера Крамніка тытул чэмпіёна сьвету па шахматах. Фішэрава вынаходка для шахматыстаў — як колішні «гамбурскі рахунак» для барцоў. Хоць мы на месцы аўтара паасьцерагліся б зьневажаць клясычныя шахматы, нібыта «вычарпаныя і дохлыя». Не пляваў бы сп.Бобі ды ў калодзеж…

Што-што, а імправізаваць за дошкай беларусы заўсёды ўмелі — і Верасаў, і Сакольскі, і Купрэйчык, ня кажучы ўжо пра Кіру Зварыкіну ды Рахіль Эйдэльсан. Аднак «Шахматы-960» застаюцца пакуль малавядомай гульнёй на нашых абшарах. Некаторыя трэнэры іх прапагандуюць (назваць можна берасьцейца Ўладзіслава Каташука, менчука Анатоля Аліпава), але хіба дзеля забавы. А дарма: чым гуляць у рэфэрэндум, дык лепей у «Фішэрэндам».

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

**Ізорыя — Купрэйчык, Турцыя, 2003. Ход чорных. У выніку нестандартнага разыгранага дэбюту грузінскі грасмайстар трапіў пад атаку. Працягніце яе.**



**Адказ:** 1... Кd3! (мацней, чым 1...Фe4+) 2. Фe3 Фe1+ 3. Крf3 Кe5+ 4. Крf4 Фh4+ 5. Крe5 Фf6+ і мат за 3 хады.

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КРАМАХ

**«Чырвоная зорка»** выпусьціла набор пісьмовых прылад для 1-га году навучаньня з назвамі па-беларуску. Склад: сшытак у косую лінейку, сшытак у буйную клетку і альбом для маляваньня, а таксама набор кардону і каляровай паперы. Фірмовая крама: Менск, вул.Радыяльная, 40. Т.: 230-73-34

КАНТАКТЫ

**Арганізоўваецца** паездка на канцэрт легендарнага гурту «Deep Purple» у Маскву 21 кастрычніка. Т.: 649-08-88, 502-21-43, 256-46-07, 400-67-74; электронны адрас: w1979@tut.by

**Ствараецца фан-клюб** беларускай музыкі. Шукаем прыватных распаўсюднікаў беларускай музыкі. Т.: 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74; электронны адрас: w1979@tut.by; вэб-старонка: www.BMA.home.by

**Ствараецца** фан-клюб беларускай музыкі ў Слуцку. Далучайцеся. Т.: 2-44-68, Сяргей, 2-99-83,8-029-691-86-25, Артур

**Пачалося галасаваньне** — адбор удзельнікаў на складанку цяжкой музыкі «Hard Life — Heavy Music-3»: www.bma.tam.by

**Хлопец-гей**, 25/176/86, в/а, сымпатычны, з гумарам, надзейны, шукае сябра. А/с 86, 220079, Менск-79

КНІГІ, МУЗЫКА

**Беларуская музыка** ў Слуцку. Вялікі выбар CD-дыскаў, аўдыё-касэт беларускай музыкі і ня толькі, — павільёне №153 на Базарнай плошчы ў Слуцку

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050, Менск; электронны адрас: exlibris@tut.by; вэб-старонка: http://knihi.net, т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае**: часопісы «Arche-Пачатак» №4/2004, «Тэксты» №1/2004, «Беларускі гістарычны агляд» том 10, сшытак 1—2, «Czasopis» №9/2004; каталёг мастацкай выставы «Блазны». Т.: 8-029-643-57-33; электронны адрас: exlibris@tut.by

ПАСЛУГІ, ПРАЦА

**Вазьму на рэалізацыю** ў Віцебску беларускае сувэнірнае ганчарства — вазачкі, падсьвечнікі, лепку etc. Электронны адрас: vjasna@tut.by. Т.: 710-54-20, (0212) 24-18-57 (хатні), Міхал

**Ангельская мова** (праз беларускую), а таксама кантрольныя і пераклады. Т.: 8-029-765-46-07, 216-81-71 (з 20.00 да 12.00). Раман

**Часопіс найноўшай гісторыі «Беларускі Рэзыстанс».**

Часопіс шукайце на вядомых выставах прыватных распаўсюднікаў альбо праз «Кнігі-поштай»: г. Менск, п/с 333, 220050, e-mail: exlibris@tut.by

**Запрашаем у падарожжы**

**3 кастрычніка** (нядзеля)

па маршруце: **Менск—Далгінава—Крывічы—Будслаў—Княгінін—Касьцяневічы—Куранец—Вязань—Краснае—Радашковічы—Менск.** Цана 17 000 рублёў.

**10 кастрычніка** (нядзеля)

**«Замкі Беларусі»: Дуды—Іўе—Ліпнішкі—Ліда—Наваградак—Любча—Мір.** Цана 20 000 рублёў.

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

Газэта «Наша Ніва» шукае карэктара для працы на палову стаўкі (панядзелак, аўторак, серада). Зьвесткі пра сябе падавайце на адрас nn@promedia.by або праз тэл.284-73-29.

**3 кастрычніка запрашаем у вандроўку**

**Віцебск—Здраўнева**

**Віцебск:** Апанасаўская царква, Касьцёл Сьвятой Варвары, Ратуша, Пакроўскі сабор.

**Здраўнева:** сядзіба Рэпіна, помнік Рэпіну, сядзібны парк, дом загадчыка сядзібы Рэпіна.

Кошт вандроўкі — 30000 рублёў.

**Т.: 222-88-76, 551-30-75.**



**10 кастрычніка запрашаем у вандроўку**

**Ракаў—Івянец—Дзяржынава**



**Ракаў:** касьцёл дамініканцаў, званіца Сьвятой Ганны, Праабражэнская царква.

**Івянец:** касьцёл Сьвятога Аляксея, манастыр францысканцаў, сядзіба

**Дзяржынава:** мэмарыяльны комплекс Ф.Дзяржынскага.

**Адпачынак:** абед на прыродзе.

Кошт вандроўкі — 25000.

**Т.: 222-88-76, 551-30-75.**

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**

З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская

галоўны рэдактар — Андрэй Дынько

фотарэдактар — Арцём Лява

карэктарка — Галіна Рабянкова

нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко

тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык

мастацкі рэдактар — Сягей Харэўскі

выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**

**220050, Менск, а/с 537**

**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**

**E-mail: nn@promedia.by**

**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 4127. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 21.00 29.09.2004.

Замова № 5971.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а